ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 14 (985) 2 — 8 красавіка 2011 г.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

ПРАСТОРА РОЎНЫХ МАГЧЫМАСЦЕЙ

2 красавіка — Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі

Звычайна гэты ўрачысты дзень напоўнены важкім культурным складнікам у абедзвюх краінах. На бягучым тыдні, калі мы адзначаем Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі, дэлегацыя з Гомеля — Культурнай сталіцы Беларусі і СНД-2011 — была запрошана ва Ульянаўск, які «запаралеліўся» з горадам над Сожам у сваім статусе Культурнай сталіцы Садружнасці гэтага года.

Фота Юрыя ІВАНОВА

С. 2, 6

На здымку: беларуская дэлегацыя ў час урачыстасцей з нагоды падпісання Пагаднення аб намерах аб супрацоўніцтве і партнёрстве паміж Гомелем і Ульянаўскам у рамках рэалізацыі праграмы «Культурная сталіца Беларусі». Перад гасцямі выступае ансамбль бальнага танца Цэнтра народнай культуры «Варыянт» г. Ульянаўска.

С. 8

С. 13

С. 7

С. 15

Сяброўства без межаў і адлегласцей

Урачыстае пасяджэнне ў зале Ульянаўскай абласной навуковай бібліятэкі.

1175 кіламетраў аддзяляюць наш старажытны Гомель і расійскі Ульянаўск. Беларуская дэлегацыя пераадолела гэтую адлегласць і ўзяла ўдзел ва ўрачыстасцях з нагоды надання Ульянаўску статуса Культурнай сталіцы Садружнасці нароўні з нашым горадам над Сожам, які ўжо месяц афіцыйна называецца першай Культурнай сталіцай СНД, а таксама — ужо другой па ліку — Культурнай сталіцай Беларусі.

Аляксандр Пінкоў і Алена Клічкоўская пад час падпісання Пагаднення аб супрацоўніцтве.

Ульянаўскім дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам “Губернатарскі” дырыжыруе беларус Іван Касцяхін.

Не трэба даказваць значнасць нашых культурных сувязей. Вырашаецца важная задача: фарміраванне адзінай культурнай прасторы — прасторы роўных магчымасцей. У жыццё ўступаюць новыя пакаленні. І яны павінны карыстацца плёнам як нацыянальнай, так і агульнай шматвекавой культуры. Гэтаму і садзейнічае Міждзяржаўная праграма “Культурныя сталіцы Садружнасці”. У ёй з цягам часу прымуць удзел усе дзяржавы СНД.

У Гомелі ж і Ульянаўску да згаданай праграмы ставяцца з выключнай адказнасцю, называючы яе асновай для наладжвання новых культурных, эканамічных і сацыяльных стасункаў. Зрэшты, тое зразумела: менавіта ў гэтых гарадах яна распачынаецца.

У склад беларускай дэлегацыі, што вылецела ва Ульянаўск, увайшлі начальнік упраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый Чумакоў, намеснік старшыні Гомельскага гарвыканкама па сацыяльных пытаннях Алена Клічкоўская, начальнік аддзела культуры Гомельскага гарвыканкама Алена Герашчанка, дырэктар — мастацкі кіраўнік Гомельскага дзяржаўнага тэатра лялек Дзмітрый Гарэлік, дырэктар Гомельскага палацава-паркавага ансамбля Алег Рыжкоў і аўтар гэтых радкоў. З расійскага боку былі сустаршыня Праўлення Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва, спецыяльны прадстаўнік Прэзідэнта Расіі па міжнародным культурным супрацоўніцтве Міхаіл Швыдкой і іншыя афіцыйныя асобы.

З'яўленне легендарнага Палада Бюльбюль Аглы выклікала ўсеагульную радасць. Знакаміты кампазітар і спявак цяпер — старшыня Праўлення Міждзяржаўнага фонду гуманітарнага супрацоўніцтва, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Азербайджан у Расійскай Федэрацыі.

У гэты дзень мэр Ульянаўска Аляксандр Пінкоў і намеснік старшыні Гомельскага гарвыканкама Алена Клічкоўская падпісалі Пагадненне аб намерах культурнага супрацоўніцтва паміж двума гарадамі. Адбыўся святочны канцэрт, у якім прынялі ўдзел майстры мастацтваў Ульянаўскай вобласці і горада Гомеля.

Цягам года ў абодвух гарадах пройдуць абменныя культурныя акцыі, будуць наладжаны стасункі паміж навучальнымі ўстановамі культуры і мастацтва.

Юрый ІВАНОЎ,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Ульянаўск — Мінск
Фота аўтара

Жывапіс пад музыку

30 сакавіка ў сталічным Доме Масквы адбыўся вечар, прысвечаны святкаванню Дня яднання народаў Беларусі і Расіі.

Ён быў арганізаваны Камітэтам міжрэгіянальных сувязей і нацыянальнай палітыкі г. Масквы і прадстаўніцтва ДАУ “Дом Москвы” ў Рэспубліцы Беларусь.

На святочным вечары прысутнічалі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, кіраўнікі міністэрстваў і ведамстваў, парламентарыі, расійскія дыпламаты, дзеячы культуры.

У гонар гэтай падзеі была разгорнута цудоўная выстаўка жывапісу народнага мастака Беларусі, лаўрэата прэміі Саюзнай дзяржавы ў галіне літаратуры і мастацтва Леаніда Шчамялёва, якую прадставілі шматлікім удзельнікам свята сябры і калегі мастака — заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, мастацтвазнаўца Барыс Крэпак і народны мастак Беларусі Уладзімір Тоўсцік.

Пасля вернісажу адбыўся вялікі святочны канцэрт.

На здымку: пад час адкрыцця вернісажу ў Доме Масквы.

Лазер і бізнес “Славянскага...”

На пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама яго старшыня Аляксандр Косінец адзначыў, што сёлета ў “Славянскім базары ў Віцебску” прымуць удзел прадстаўнікі больш чым трыццаці дзяржаў.

Галоўнай ідэяй юбілейнага, XX-га фестывалю стане тэматыка, звязаная з яго гісторыяй і дасягненнямі. Губернатар запатрабаваў, каб сёлета не толькі павялічыліся даходы ад фестывалю, але каб “Славянскі базар” выйшаў на поўную акупнасць. На правядзенне форуму ў 2011 годзе запланавана 13 607 млн. рублёў, у тым ліку 2892,5 млн. рублёў — з рэзервовага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, 2639 млн. рублёў — з бюджэту Саюзнай дзяржавы, 300 млн. плануе выдаткаваць Міністэрства культуры краіны, пазабюджэтных сродкаў — 7775,5 млн. рублёў.

Дырэкцыя Міжнароднага фестывалю мастацтваў “Славянскі базар у Віцебску” цяпер актыўна працуе над праграмай фестывалю. Як паведаміў начальнік упраўлення культуры аблвыканкама Уладзімір Цярэнцьеў, канцэрт адкрыцця збярэ сузор'е яркіх артыстаў і творчых калектываў. Сюрпрызам для яго гледачоў стане выступленне Мірэй Мацье, “пад заслону” ж канцэрта выступіць Дзідзье Маруані з гуртом “Space”. Завершыцца ўрачыстасць лазерна-піратэхнічным шоу пад музыку апошняга.

Паводле слоў Уладзіміра Цярэнцьева, сёлета запланавана 25 канцэртаў (у 2010 годзе іх было 19) у Летнім амфітэатры і на адкрытай канцэртнай пляцоўцы на плошчы Перамогі. Упершыню ў рамках фестывалю запланаваны канцэрт калектываў Віцебшчыны.

Дзень Беларусі на “Славянскім базары...” упершыню будзе праведзены комплексна, з паказам дасягненняў у розных сферах мастацтва, навукі, тэхнікі і вытворчасці. У гэты дзень на сцэне Коласаўскага тэатра яго калегі-купалаўцы пакажуць спектакль “Пінская шляхта”. У Краязнаўчым і Мастацкім музеях Віцебска адкрыецца выстаўка “Зямля пад белымі крыламі”, дзе будуць прадстаўлены работы сучасных беларускіх мастакоў.

Пад час фестывалю ў Віцебску, акрамя канцэртаў, пройдзе шэраг іншых мерапрыемстваў: Тыдзень еўрапейскага сучаснага мастацтва ў Беларусі, “Тэатральныя сустрэчы”, “Кінапраграма-2011”, будуць дзейнічаць кірмаш народных рамёстваў “Горад майстроў”, кірмаш сувенірнай прадукцыі і прадукцыі прадпрыемстваў Віцебшчыны, адбудуцца святы “Беларуская кухня” і “Віцебскі лён”, Міжнародны інвестыцыйны форум і Рэспубліканская выстаўка-кірмаш “Малы бізнес у фестывальным Віцебску” — усяго больш за 70 падзей. Як адзначыў Уладзімір Цярэнцьеў, да 1 ліпеня завершацца ўсе работы па падрыхтоўцы фестывальных аб'ектаў.

Алена АЛІМАВА
Віцебск

Пасля спектакля “Вельмі простая гісторыя” Тэатра-студыі кінаакцёра 30 сакавіка гледачы не спяшаліся пакідаць залу. Шматлікія “Брава!” патаналі ў шчырых апладысментах нездарма: у гэты дзень адбыліся ўрачыстасці, прымеркаваныя да 30-годдзя трупы. І ўжо ніяк не скажаш, што гісторыя тэатра — вельмі простая. За гэтыя тры дзясяткі гадоў у ёй з'явіліся свае даты, нават вехі, свае “ўзлёты і расчараванні”, як казалі са сцэны ў той вечар. Урэшце, склалася свая лінія лёсу...

З адчуваннем жыцця

Віншаванне беларускага Лідара зачытаў першы намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандр Радзькоў.

І вызначаюць яе тыя, хто стварае тэатр. “Галоўнае багацце Тэатра-студыі кінаакцёра — унікальны калектыў, сапраўдная садружнасць аднадумцаў, якія знаходзяцца ў пастаянным творчым пошуку і радуюць сваіх прыхільнікаў цікавымі прэм'ерамі”, — так гаворыцца ў віншаванні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі.

Тэатр і Аляксандра Яфрэмава віншуюць Валерый Анісенка і Барыс Луцэнка (першы і другі злева) — колішнія мастацкія кіраўнікі трупы.

Віншавальны адрас зачытаў на ўрачыстасці першы намеснік Кіраўніка Адміністрацыі беларускага Лідара Аляксандр Радзькоў. Таксама ён уручыў Ганаровыя граматы Адміністрацыі Прэзідэнта. Завяршаючы сваё выступленне, Аляксандр Радзькоў сказаў: “Жадаю ўсім вопытным, а таксама маладым творцам свядома вызначаць стратэгію далейшага паспяховага развіцця вашага тэатра, і тады кожны з вас — а вы гэта ўмееце! — будзе прыносіць нам радасць, шчасце, адчуванне жыцця”.



Адбітак рукі Святланы Сухавей здымае Аляксандр Фінскі.

Пра ўнікальнасць з'явы мінскага Тэатра-студыі кінаакцёра на постсавецкай прасторы казаў міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка. “Дзякуй вам за тое, што вы захавалі гэтую ўнікальнасць!” — падкрэсліў міністр. І дадаў: “Тут адчуваеш шчырасць, сапраўднае натхненне, той станоўчы зарад, які атрымліваe глядач... Пярэчачы Станіслаўскаму, у вашым тэатры можна сказаць: “Веру!”. Пасля міністр уручыў калектыву ўзнагароды Міністэрства: знак “За значны ўклад у развіццё культуры Беларусі”, Ганаровыя граматы, граматы... Таксама міністр выказаў упэўненасць: пасля рэканструкцыі кінастудыі тэатр атрымае новае памяшканне — вялікае і прасторнае.

Ад імя членаў Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе намеснік яе Старшыні Святлана Сухавей перадала віншаванні калектыву з пажаданнямі плёну ў творчасці і новых вяршынь. У якасці старшыні Беларускай гільдыі кінаакцёраў яна падкрэсліла, што арганізацыя гэтая была заснавана якраз у сценах Тэатра-студыі. А як майстар сцэны пажадала роднаму калектыву найхутчэй сустрэцца ў новых сценах.

Пра тое, што сталіца ганарыцца Тэатрам-студыяй кінаакцёра, гаварылася ў віншаванні ад Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта. Узнагароды і падарункі ад імя Мінгарвыканкама і мэра горада Мікалая Ладуцькі ўручалі яго намеснік Міхаіл Ціцянкоў і начальнік упраўлення культуры Віталіна Рудзікава.

Як сведка гістарычных падзей на вечары выступіў рэжысёр Генадзь Палока: “Я, памятаю, якраз здымаў чарговую стужку ў Мінску, калі на дошцы аб'яў студыі пабачыў загад аб стварэнні тэатра”. Ды і сёння майстар, прыехаўшы на агучку сваёй новай работы, зазначыў: “Каля 80-і працэнтаў акцёраў у ёй — беларусы, і многія з іх служаць у тэатры”.

Да шматлікіх шчырых прызнанняў у глядацкай любові далучылася і сапраўдная дзея ад нашай газеты. Акрамя ганаровых грамат рэдакцыі і сувеніраў работы народных майстроў для артыстаў тэатра, разам са скульптарам Аляксандрам Фінскім мы заклалі пачатак будучага музея трупы. І першым экспанатам у ім маюць стаць адбіткі рук на фаянсе, што проста на сцэне скульптар здымаў з далоняў народнага артыста Беларусі, мастацкага кіраўніка тэатра і, па сумяшчальніцтве, вядучага вечара Аляксандра Яфрэмава, заслужаных артыстаў Беларусі Святланы Сухавей і Аляксандра Бяспалага. Фаянсавая пліта праз пару дзён будзе абпалена ў печы і, спадзяёмся, стане сімвалам будучай экспазіцыі.

...Святло пагасла, словы віншаванняў прамоўлены, кветкі ўручаны героям урачыстасці... А ўжо наступным днём — спектакль “13”. Калі пераставіць лічбы — атрымаецца акурат 31. Таму — з трыццаць першым сцэнічным годам, кінаакцёры!

Фота Юрыя ІВАНОВА

З пасяджэння калегіі Міністэрства культуры

Інструмент для таго, каб атрымаць грошы

31 сакавіка ў адной з прыватных галерэй сучаснага мастацтва прайшло пасяджэнне калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Месца сустрэчы вызначыла тэма, вынесеная на абмеркаванне, — “Аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве і развіцці праектнай дзейнасці ў сферы культуры”.

Тэму гэтую міністр культуры Павел Латушка назваў стратэгічнай. Сістэма дзяржаўнага фінансавання галіны працуе, але для новага ўзроўню развіцця культуры патрэбны новыя “інструменты” шматканальнага фінансавання, заснаванага на дзяржаўным бюджэце і прыватных сродках мецэнатаў, спонсараў, інвестараў. Другі кірунак інавацыйнай дзейнасці — развіццё праектных тэхналогій, увядзенне сістэмы грантаў на цэнтральным і рэгіянальным узроўнях, што не можа не прастымуляваць узнікненне новых ідэй, дазволіць “праявіць” пласт латэнтнай “недзяржаўнай” культуры.

Рух па двух абазначаных кірунках немагчымы без трывалай заканадаўчай базы. Многае ўжо зроблена. Падпісаны Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 77, які стварыў спрыяльныя ўмовы для прыцягнення спонсарскіх сродкаў у развіццё культуры. 12 сакавіка прынята пастанова Савета Міністраў № 308: паводле яе, у арганізацыях культуры могуць стварацца апякунскія саветы, у ліку задач якіх — і пошук партнёраў, пазабюджэтнага фінансавання, грамадскі кантроль за выкарыстаннем сродкаў… Шмат захадаў прадпрымае Міністэрства і па аптымізацыі падаткаабкладання. Працэс, натуральна, — доўгі і няпросты.

Неаспрэчна адно: прыватны сектар павінен адчуць патрэбу ў партнёрстве. І прыкладаў таму ўжо шмат. (Пра канкрэтыку дзяржаўна-прыватных стасункаў чытайце ў артыкуле “Прам-тайм для партнёрства”, “К” № 12 за 2011 г.) Міністэрства выдаткавала каля 100 мільёнаў для дзяржпадтрымкі фестывалю “Уладзімір Співакоў запрашае”. Прадзюсар здолеў сабраць пад час форуму каля 700 мільёнаў. Натуральна, дзяржаўныя сродкі былі вернуты. Тая ж сітуацыя — і з Фестывалем Юрыя Башмета. Таксама адна з прыватных кампаній узялася за адбудову дома, дзе нарадзіўся Максім Багдановіч. Недзяржаўнымі структурамі падтрымліваецца наш удзел у Венецыянскай біенале. На базе Творчых майстэрняў Міністэрства сёлета будзе створаны Цэнтр сучаснага мастацтва, які падтрымае і дзяржаўны бюджэт, і прыватны бізнес…

Прыкладаў партнёрства хапае, але выкарыстанне альтэрнатыўных крыніц фінансавання не стала сістэмным. Між тым, партнёрства дзяржавы і бізнесу — адзін з найважнейшых вектараў нашай эканамічнай палітыкі. Як наладзіць узаемадзеянне, як зрабіць яго плённым? Менавіта на гэтыя пытанні і спрабавала адказаць калегія.

Першы намеснік міністра культуры Уладзімір Карачэўскі зазначыў, што інтэнсіўнасць мерапрыемстваў, якія праводзяцца па краіне, пакідае жадаць лепшага. Міністр культуры Павел Латушка, пагадзіўшыся, зазначыў, што некаторыя з прычын — недастаткова актыўнае дзяржаўна-прыватнае партнёрства, недахоп ідэй, і прапанаваў сваю: “Непадалёк ад плошчы Перамогі — тралейбуснае, цяпер зачыненае, дэпо. Чаму б у ім не зрабіць галерэю і не правесці выстаўку твораў тысячы мастакоў — усіх мастакоў Беларусі?” Уявіць гэта цяжка, дадаў міністр, але пры ўмове супрацоўніцтва з прыватнікамі рэалізаваць магчыма.

Мастацтвазнаўца, куратар мастацкіх праектаў, кіраўнік Гарадской мастацкай галерэі твораў Л.Шчамялёва, а з нядаўняга часу вядучы тэлепраграмы “Страсці па культуры” Таццяна Бембель казала аб праектнай дзейнасці, бо займаецца гэтым ушчыльную. Наша краіна, перакананa Таццяна Бембель, мае дастатковы рэсурс, каб прапанаваць канкурэнтаздольныя культурныя праекты, пад рэалізацыю якіх заўжды можна атрымаць грошы. Рэсурс — вялікі, але не засвоены, не задзейнічана пры гэтым і сфера латэнтнай культуры. Ёсць і перашкоды праектнай дзейнасці: мы прадаём ідэю — замежжа купляе яе, але “інструмента”, каб атрымаць тыя грошы, у нас няма. Калі інвестыцыі — мільённыя, праходжаннем грошай павінна займацца не крэатыўная група, што рэалізуе творчы праект, а прыватная фінансавая кансультатыўная структура, як гэта прынята ў замежжы. Міністр Павел Латушка зазначыў, што Палац Тызенгаўзаў у Паставах таксама мяркуецца аднавіць з прыцягненнем літоўскіх грошай, таму праблема — надзённая. Патрэбны прадзюсар, які бярэ, скажам, 10 працэнтаў ад сумы, але займаецца працэсам самастойна (як гэта было на двух згаданых музычных фестывалях), а Міністэрства кантралюе толькі вынік, але робіць гэта жорстка.

Пра неабходнасць правядзення кірмашоў творчых праектаў казаў намеснік міністра Тадэуш Стружэцкі. Праекты гэтыя павінен назапашваць і абагульняць Інстытут культуры Беларусі. А ўстановы культуры мэтазгодна адаптаваць да працы ва ўмовах дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Значыць, варта падумаць пра ўтварэнне аддзелаў маркетынгу, інавацыйнай дзейнасці.

Міністр Павел Латушка нагадаў прысутным аб Конкурсе фестывальных праектаў, што сёлета абвешчаны і пакліканы падштурхнуць рэгіёны да пошуку якасна новых ідэй. Лепшыя атрымаюць дзяржфінансаванне.

Намеснік міністра Віктар Кураш спыніўся на праблемах аховы гісторыка-культурнай спадчыны, дзе таксама не стае эфектыўных партнёрскіх намаганняў. Аб эканамічных і прававых аспектах партнёрства казалі начальнік эканамічнага ўпраўлення Вольга Кананюк і начальнік юрыдычнага аддзела Алена Вештарт.

Вельмі цікавым падалося выступленне кансультанта Цэнтра развіцця сельскага прадпрымальніцтва з Мядзельскага раёна Эдуарда Вайцяховіча.

— Мы ўзяліся ў свой час, — зазначыў ён, — за адраджэнне сядзібна-паркавага комплексу. Атрымалі ад міжнароднага фонду грант — 500 долараў. Прыцягнулі большыя грошы — 10, 20 тысяч, і ў 2005 годзе парк у вёсцы Камарова заняў першае месца ў рэспубліцы. Пачалі развіваць не толькі экалогію, культуру, але і інфраструктуру вёскі. Побач — Нарач, значыць, стаўку трэба рабіць на турызм.

На пачатку 2000-х тут заняліся сельскім турызмам. Жыхароў у Камарове — тысяча, а гасцей і турыстаў — чатыры тысячы. Усе святы тут ладзяцца пры падтрымцы дзяржструктур. У перспектыве — стварэнне навучальнага бізнес-“інкубатара” ў сядзібным будынку.

— Словам, мы развіваемся, — зазначыў Эдуард Вайцяховіч, — і нам патрэбна суфінансаванне. Аблвыканкам сёлета запланаваў выдаткаваць на рэалізацыю камароўскіх праектаў 600 мільёнаў рублёў. А праектаў, у тым ліку і па супрацоўніцтве з дзяржструктурамі, процьма. Просьба да ўлад — толькі адна: зрабіць спонсарам палёгку з падаткамі.

Выступіў сустаршыня Рэспубліканскага аргкамітэта Міжнароднага фестывалю Юрыя Башмета Расціслаў Крымер. Апошні форум, зазначыў ён, цалкам акупіўся. Дзяржаўныя сродкі не толькі эканомлены, але яшчэ засталося 8 мільёнаў рублёў, якія аказаліся, па словах Расціслава Крымера, прыбыткам філармоніі, і няма ніякай юрыдычнай магчымасці перанесці сродкі на арганізацыю наступнага фестывалю. Які сэнс, зазначыў Расціслаў Крэмер, зарабляць грошы, што потым губляюцца?

Словам, тэма для абмеркавання была абрана выключна праблемная. Усе крытычныя заўвагі, па словах міністра Паўла Латушкі, будуць улічаны ў рашэнні калегіі.

Яўген РАГІН

Фармат — ранейшы

XVIII Мінскі міжнародны кінафестываль “Лістапад” пройдзе 5 — 12 лістапада бягучага года. Па словах праграмнага дырэктара ММКФ Ігара Сукманава, конкурсная праграма форуму будзе мець ранейшы фармат, але для гледачоў і гасцей запланаваны новыя незвычайныя мерапрыемствы.

Старшынёй аргкамітэта “Лістапада-2011” з'яўляецца намеснік Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Анатоль Тозік, намеснікамі старшыні аргкамітэта — міністр культуры краіны Павел Латушка і старшыня Мінскага гарвыканкама Мікалай Ладуцька. У склад аргкамітэта ўваходзяць намеснік начальніка галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення — начальнік упраўлення сацыяльна-культурнай палітыкі Адміністрацыі Прэзідэнта Ірына Дрыга, першы намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч, намеснік міністра замежных спраў Сяргей Алейнік, старшыня Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Генадзь Давыдзька ды іншыя.

Як паведаміў Ігар Сукманаў, структура конкурснай праграмы (падзел яе на 4 асобныя конкурсы) — зручная для Мінскага кінафоруму, і яна атрымала высокую ацэнку ад экспертаў фестывальных праграм. “Нядаўна мы вярнуліся з Вільнюса, дзе мелі магчымасць сустрэцца з прадстаўнікамі розных фестывальных арганізацый. Пачуўшы іх меркаванні пра ўзровень “Лістапада”, адчулі гонар, — дадае праграмны дырэктар. — Сёння кіпіць праца па падрыхтоўцы да сёлетняга ММКФ, і арганізатары спадзяюцца здзівіць публіку новымі ідэямі, пра якія раскажуць крыху пазней”.

Венесуэла ў Магілёве

Пад час Дзён культуры Балівараўскай Рэспублікі Венесуэла ў Магілёве, што завяршыліся ўчора, першы сакратар Пасольства Венесуэлы ў Беларусі Херарда Эстрада і ўлады вобласці і горада абмеркавалі планы наконт супрацоўніцтва ў галіне культуры і адукацыі.

Намеснік першага сакратара Пасольства Валерыя Талкачова адзначыла ў гутарцы з карэспандэнтам “К”, што візіт Херарда Эстрада ажыццявіўся з той жа мэтай, што і падобны да яго ў Гродна ў лістападзе мінулага года: каб больш даведацца пра культурнае жыццё рэгіёна, наладзіць творчыя сувязі, абмены. Багатая культурная праграма чакала жыхароў і гасцей Магілёва з 30 па 1 красавіка. Прычым два канцэрты паказалі публіцы і мясцовыя музыканты.

Адкрыццё Дзён культуры адбылося ў Музеі гісторыі Магілёва, дзе наведвальнікам была прадстаўлена выстаўка партрэтаў дзеячаў вызваленчага руху Венесуэлы “Галерэя герояў”. Адным з самых яркіх мерапрыемстваў стаў канцэрт хору і аркестра Магілёўскай гарадской капэлы, кіраўніцтва якімі на час імпрэзы ўзяў на сябе Херарда Эстрада. Тут, а таксама на канцэрце калектываў Магілёўскай гімназіі-каледжа мастацтваў, выконваліся творы лацінаамерыканскіх кампазітараў. У апошнім выступленні ўдзельнічалі ансамблі “Алі Прымера” ды “Іяланда Марэна” Лацінаамерыканскага культурнага цэнтра імя Сімона Балівара.

Два фільмы маладых венесуэльскіх рэжысёраў увайшлі ў праграму Дзён кіно Венесуэлы: “Урок” і “Брат”.

Фестывалім і вяснуем!

27-я “Мінская вясна”, што адкрыецца ў сталічнай філармоніі 8 красавіка і з'яднае музыкантаў з дзесяці краін (Беларусь, Германія, Казахстан, Канада, Латвія, Літва, Малдова, Расія, Францыя і Японія), стане сапраўдным сімвалам аднаўлення сіл.

Не пагнаўшыся за колькасцю канцэртаў, арганізатары паглыбілі канцэпцыйнасць праекта, спалучыўшы пад дахам гэтага фестывалю, вядомага яшчэ з 1980-х, два больш маладыя: “Дуэцісіма” і “Мандалінісіма”.

А на прэс-канферэнцыі растлумачылі, што найвышэйшая ступень, выкарыстаная ў назвах фестывалю фартэпіянных дуэтаў і форуму мандаліністаў (а таксама гітарыстаў ды лютністаў), — частая з'ява ў музычнай тэрміналогіі, дзе без фарцісіма ды піянісіма папросту не абысціся. Ды і спалучэнне гэтых двух “-ісімаў” невыпадковае: лютня і падобныя да яе інструменты, на думку мастацкага кіраўніка Беларускай дзяржаўнай філармоніі Юрыя Гільдзюка, прывялі да з'яўлення клавесіна — папярэдніка раяля. А той будзе гучаць на цяперашняй “Мінскай вясне” асабліва часта. І не адно з-за дуэтаў, але і з нагоды 200-годдзя Ф.Ліста — кампазітара, дырыжора, а таксама геніяльнага піяніста, чые творы (а ён, вядома, пісаў іх найперш для сваіх уласных выступленняў) і па сёння застаюцца для выканаўцаў адным з галоўных іспытаў на прафесіяналізм.

Не забыты ні прэм'еры, ні беларуская музыка. Дарэчы, зусім нядаўна наш кампазітар Уладзімір Каральчук заваяваў Другую прэмію (Першая не прысуджалася) на прэстыжным Міжнародным конкурсе ў Японіі — за Санату для гітарна-мандаліннага аркестра. Цікава пачуць, ці не так?..

“ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ”

па АКТУАЛЬНЫХ ЭКАНАМІЧНЫХ ПЫТАННЯХ **функцыянавання сферы культуры**

КУЛЬТУРА • ІНФА

5 красавіка з 10-й да 12-й гадзіны ў Інфацэнтры “Культура-інфа” будзе працаваць “гарачая лінія” з удзелам начальніка эканамічнага ўпраўлення Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Вольгі КАНАНЮК.

Пытанні, звязаныя з эканамічнай дзейнасцю сферы культуры, можна задаваць па тэлефонах (8-017) 290-22-50 і 292-99-18 непасрэдна 5 красавіка, альбо загадзя: на форум (www.forum.kimpress.by ў раздзеле “Ёсць пытанне!”) ці праз электронную пошту: kultura@tut.by.

Партнёры і перспектывы

Удзельнікі семінара-нарады ў Палацы культуры імя М.Горкага ў Барысаве.

Выязны семінар-нарада для старшынь абласных і гарадскіх камітэтаў Мінскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў праходзіў у Лагойскім і Барысаўскім раёнах на базе пярвічак Беларускага прафсаюза работнікаў культуры. Яго тэма была наступная: “Стан і шляхі ўдасканалення сумеснай працы наймальнікаў і прафсаюзных арганізацый галіны”.

У Лагойску ўдзельнікі пазнаёміліся з умовамі працы журналістаў мясцовай газеты, у Плешчаніцах — з дзейнасцю адміністрацыі і прафкама вучылішча алімпійскага рэзерву. Работа была прадоўжана ў Барысаве. У Палацы культуры імя М.Горкага гаворка ішла пра адметнасць клубных фарміраванняў, выкарыстанне перспектыўных форм і метадаў сацыякультурных захадаў, пра ролю прафсаюзнай пярвічкі ў вырашэнні задач па ўдасканаленні ідэалагічнай і культурна-масавай работы з насельніцтвам. Удзельнікі семінара сустрэліся з прадстаўнікамі аматарскіх калектываў, аб'яднанняў і гурткоў самадзейнай творчасці.

Не менш цікавым было і наведанне Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І.Х. Каладзеева.

Пад час пленарнага пасяджэння Віктар Маліноўскі спыніў увагу на рабоце прафсаюзных арганізацый па развіцці і ўдасканаленні сацыяльнага партнёрства, абароне сацыяльна-эканамічных інтарэсаў і працоўных правоў работнікаў галіны. Пытанні выканання наймальнікамі норм працоўнага заканадаўства вывучаны больш чым у сотні абласных арганізацый. Летась дадзена больш за 500 кансультацый па прававых пытаннях, разгледжана 26 пісьмовых зваротаў грамадзян. Дзякуючы своечасоваму ўмяшальніцтву прафсаюза прадухілена назаконнае звальненне шасці работнікаў.

Два разы на год пастановай гаркама прафсаюза для студэнтаў і навучэнцаў навучальных устаноў культуры ўстанаўліваецца пяць стыпендый для моладзі, што і вучыцца добра, і актыўнічае ў прафсаюзным жыцці.

І старшыня Мінскага гаркама прафсаюза работнікаў культуры Віктар Маліноўскі, і старшыня Мінскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў Міхаіл Бода казалі таксама пра тое, што пытанне павышэння заробкаў работнікаў культуры ў полі “прафсаюзнага” зроку знаходзіцца пастаянна.

Юрый ІВАНОЎ
Фота аўтара

Сітуацыя ў беларускім кінематографе патрабуе змен. Сёння гэта зразумела абсалютна кожнаму, хто працуе ў сферы айчыннага кіно. Тым больш, гэтых змен чакаюць гледачы, якія жадаюць бачыць на экране родныя сюжэты і знаёмыя постаці, але нашы кінематаграфісты пакуль не могуць прапанаваць ім якасны прадукт, што можа скласці належную канкурэнцыю замежным стужкам. Між тым, таленавітыя людзі ў нашым кінамастацтве ёсць, але свае лепшыя здольнасці яны праяўляюць чамусьці на праектах у іншых краінах ці на здымках стужак, якія ладзяць на "Беларусьфільме" замежныя прадзюсары.

Дзе канкурэнты на кінапраекты?

Дзяржава дае кінематаграфістам "вудачку". Справа — за "рыбакамі"

Прычым падобнае становішча ў айчынным кінамастацтве нельга тлумачыць адсутнасцю ўвагі з боку дзяржавы ці недахопам грошай. Кожны год на кінавытворчасць у Беларусі выдаткоўваюцца значныя сродкі. Бюджэты айчынных ігравых карцін, зразумела, не параўнальныя з галівудскімі, але супастаўныя з бюджэтамі стужак у іншых краінах, у тым ліку еўрапейскіх. Аднак глядацкі і фінансавы поспех маюць толькі асобныя, зробленыя адмыслова для тэлебачання, беларускія фільмы.

На паляпшэнне агульнай сітуацыі скіраваны захады ў змене заканадаўства. На разгляд Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны вынесены змяненні ў Закон Рэспублікі Беларусь "Аб кінематаграфіі", якія прадугледжваюць іншы падыход да вытворчасці, стымуляцыю прыцягнення прыватных сродкаў, канкурэнцыю між вытворцамі, фінансаванне праектаў дзяржавай на конкурснай аснове. Рыхтуюцца палажэнні аб умовах конкурсаў на стварэнне фільмаў на нацыянальную тэматыку ды іншыя кінапраекты, што будуць прэтэндаваць на дзяржаўнае фінансаванне.

Разабрацца ў сітуацыі і выпрацаваць адпаведныя рэкамендацыі спрабавалі на гэтым тыдні на некалькіх нарадах, якія адбыліся ў сталіцы. Карэспандэнт "К" наведаў іх, каб абазначыць кола асноўных праблем беларускага кінематографа і шляхоў іх вырашэння.

Як выйсці на рынак з незапатрабаваным?

"Дзяржава і надалей будзе падтрымліваць айчынных дакументалістаў", — было заяўлена на нарадзе кіраўніцтва Міністэрства культуры і Дэпартамента па кінематаграфіі з менеджментам і прадстаўнікамі дзяржаўных і прыватных арганізацый, што займаюцца вытворчасцю неігравога кінапрадукту.

— Гаворкі наконт таго, каб прыпыніць фінансаванне амаль цалкам стратнай на сённяшні дзень дакументалістыкі, не ідзе. Але трэба задумацца, як зрабіць дакументальную кінавытворчасць на Беларусі эканамічна больш эфектыўнай, — адзначыў у сваім выступленні міністр культуры краіны Павел Латушка. — Відавочна, што ад агульнага фінансавання арганізацый трэба пераходзіць да фінансавання асобных праектаў, больш актыўна шукаць прыватных партнёраў для сумеснай вытворчасці, — зазначыў кіраўнік ведамства.

Абвінавачваць беларускіх дакументалістаў у пасіўнасці не даводзіцца: як было паведамлена на нарадзе, апошнім часам яны спрабуюць знаходзіць для сябе пазабюджэтныя крыніцы, але ў 2010-м 90% сродкаў вытворчасці іх стужак фінансавала дзяржава. Летась на Беларусі выпушчана 81 дакументальная карціна, на якую выдаткавалі больш за тры мільярды рублёў.

Ільвіную долю дакументалістыкі ў нашай краіне выпускаюць студыя "Летапіс" Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" і РУП "Беларускі відэацэнтр", аднак у апошнія некалькі гадоў з'явіўся шэраг прыватных арганізацый, якія выпускаюць запатрабаваныя пераважна на тэлевізійным рынку стужкі. Што паказальна, сабекошт вытворчасці на прыватных студыях ніжэйшы, і тое цалкам зразумела: прыватнікі эканомяць на выдатках на ўтрыманне будынкаў, зарплату персаналу... У выніку яны аказваюцца больш канкурэнтаздольнымі і эфектыўнымі.

Выдаткоўваць сродкі на вытворчасць дакументалістыкі на конкурснай аснове — патрабаванне часу, бо менавіта такая форма з'яўляецца найбольш эфектыўнай у рыначных умовах і спрыяе развіццю канкурэнтнага асяроддзя. А ў неабходнасці апошняй няма ніякіх сумневаў: мастацкі ўзровень неігравых стужак, выпушчаных на "Летапісе" і БВЦ за апошнія гады, вельмі няроўны. Побач з несумненнымі творчымі ўдачамі існуюць вельмі слабыя фільмы, не запатрабаваныя на кінарынку.

Дарэчы, сістэма дыстрыб'юцыі айчыннага дакументальнага кіно таксама пакідае жадаць лепшага. Як зазначыў кіраўнік "Кінапракату Мінгарвыканкама" Васіль Коктыш, дакументалістыка (у тым ліку замежная) амаль не запатрабавана сучасным гледачом. Некалькі ўдалых прыкладаў пракату ў сталіцы поўнаметражных замежных стужак з'яўляюцца выключэннем. Беларуская дакументалістыка, якая цалкам кароткаметражная, куды лепш прадаецца на дысках, але гэты сегмент рынку не ў стане давесці паказчык акупнасці праектаў да належнай планкі.

Становішча з кінадакументалістыкай у свеце таксама не дазваляе спадзявацца на "лёгкія" грошы. Самыя вядомыя і ўшанаваныя на найпрэстыжнейшых форумах творцы гадамі шукаюць партнёраў для фінансавання сваіх праектаў. У Беларусі сусветна вядомых дакументалістаў — літаральна некалькі чалавек, таму празмерна спадзявацца на замежных партнёраў зусім не выпадае.

Яшчэ больш складаная сітуацыя — з тэлебачаннем, бо на ім у першую чаргу запатрабаваны спецыфічны прадукт, які даволі далёкі ад кінамастацтва і ўяўляе з сябе, хутчэй, адгалінаванне тэлежурналістыкі. Дарэчы, большасць прыватных кампаній на Беларусі працуе менавіта ў фармаце, які прапануе тэлебачанне, але казаць у такім выпадку аб нейкай арыгінальнасці і ўнікальнасці стужак не даводзіцца.

Вось і атрымліваецца, што без дзяржаўных датацый дакументальнае кіно існаваць не можа, аднак на 100% падтрымліваць мэтазгодна толькі тыя праекты, якія закранаюць найважнейшыя грамадска-палітычныя і культурныя падзеі, праводзяць ідэалогію нашай дзяржавы, маюць высокую мастацкую вартасць, могуць годна прадставіць Беларусь на міжнародных кінафорумах. Дзяржава, зазначалася ў час нарады, у бліжэйшы час зробіць усе неабходныя захады, каб было выгадна ўкладаць сродкі ў кінавытворчасць. Таксама выказана гатоўнасць часткова кампенсаваць і страхаваць частку ўкладанняў. Але шукаць партнёраў, прапаноўваць цікавыя, запатрабаваныя грамадствам тэмы і павышаць мастацкі ўзровень дакументалістам не дапаможа ніхто, апрача іх саміх.

Ад кадраў — да Інстытута

На пачатку гэтага года ў нашай краіне быў створаны Рэспубліканскі савет па культуры і мастацтве, адна з рабочых груп якога займаецца непасрэдна кінематографам і тэлебачаннем. Другое пасяджэнне групы, на якое сабраліся рэжысёры ігравых стужак і анімацыі, акцёры, крытыкі, заканадаўцы, было прысвечана набалелым пытанням айчыннага кіно.

І адно з найбольш актуальных — сцэнарнае. Не сакрэт, што якасць значнай часткі сцэнарнага матэрыялу, які паступае на разгляд адпаведнага падраздзялення Нацыянальнай кінастудыі, пакідае жадаць лепшага. Не ў апошнюю чаргу гэта звязана з памерам ганарараў, якія "Беларусьфільм" у стане прапанаваць кінадраматургам. У некаторых выпадках яны ў 10 — 15 разоў меншыя, чым у тых жа расійскіх кінакампаній. Член рабочай групы кінарэжысёр Валерый Рыбараў выказаў таксама прэтэнзіі да прафесійнага ўзроўню супрацоўнікаў сцэнарнага аддзела кінастудыі, да рэдактуры, якую праходзяць сцэнарыі, з чым пагадзілася большасць членаў рабочай групы.

Кадравае пытанне востра актуальнае не толькі ў дачыненні да рэдактуры. Якім чынам і дзе рыхтаваць будучых прафесіяналаў для айчыннага кінамастацтва? Так, адпаведны факультэт Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў быў адкрыты год таму, але ўзровень выкладання там, востры недахоп абсталявання прымушаюць глядзець у бок замежных навучальных устаноў. Рызыка ж у тым, што беларускія выпускнікі і стажоры таго самага ВГИКа з лёгкасцю знаходзяць добра аплачваемую працу ў краіне навучання. Адукацыя і прасоўванне кінамастацтва патрабуе і іншых захадаў, такіх, як актыўная папулярызацыя лепшых беларускіх твораў, рэмастэрынг і выданне іх на дысках.

Вялікія праблемы і з дыстрыб'юцыяй айчынных фільмаў. На сённяшні дзень яна не пастаўлена на належным узроўні, таму пустыя залы на беларускіх карцінах — звыклае відовішча. На жаль, нават стопрацэнтная запаўняльнасць не будзе азначаць, што айчыннае кіно адразу стане рэнтабельным: беларускі кінарынак, у тым ліку тэлевізійны, не такі вялікі, каб прыносіць значныя прыбыткі. А гэта значыць — трэба выходзіць на рынкі знешнія, у першую чаргу — рускамоўнай прасторы, шукаць партнёраў сярод тэлеканалаў і замежных капрадзюсараў для айчынных праектаў.

Стварэнне спрыяльнай атмасферы для дзяржаўна-прыватнага партнёрства ў сферы кіно — ці не галоўная задача на дадзены момант. Гэта падкрэслівалася кіраўніцтвам Дэпартамента па кінематаграфіі. Дзяржава зацікаўлена ў развіцці прыватнай кінавытворчасці. З гэтай мэтай прадзюсары ў хуткім часе атрымаюць шэраг ільгот і падтрымку з боку кіраўніцтва краіны. Паўстае пытанне аб стварэнні адпаведнага Фонду па падтрымцы кінематаграфіі і Інстытута кіно, якія павінны развіваць сферу кіно на Беларусі і ў эканамічным, і ў творчым плане. Дзяржава на 70% будзе фінансаваць ігравое кіно і цалкам падтрымліваць дзіцячыя, анімацыйныя, а таксама мастацкія фільмы са статусам "нацыянальны".

"Таксама беларускае кіно павінна размаўляць з гледачом на яго мове і тады будзе запатрабавана", — выказаў сваё меркаванне член рабочай групы — народны артыст Беларусі Аляксандр Яфрэмаў і быў цалкам падтрыманы прысутнымі.

Антон СІДАРЭНКА

ТЫМ ЧАСАМ

Прыехалі прадзюсары з Расіі...

Беларусь актыўна шукае замежных партнёраў для сумеснай кінавытворчасці. 31 сакавіка ў Міністэрстве культуры краіны адбылася рабочая сустрэча яго кіраўніцтва з расійскімі і беларускімі прадзюсарамі. Трэба адзначыць, што на такім высокім узроўні падобная нарада ў выглядзе "круглага стала" праходзіла ўпершыню.

Беларускі бок прадстаўлялі намеснік кіраўніка галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Ірына Дрыга, міністр культуры краіны Павел Латушка, першы намеснік міністра Уладзімір Карачэўскі, дырэктар Дэпартамента па кінематаграфіі Міністэрства культуры Алег Сільвановіч, выконваючы абавязкі генеральнага дырэктара Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм" Сяргей Леановіч, намеснік дырэктара студыі Іван Колба, дырэктары прыватных кампаній Глеб Шпрыгаў, Аляксандр Мышалаў.

Спецыяльна для сустрэчы прыехалі з Масквы вядомыя прадстаўнікі кінабізнесу суседняй краіны: кіраўнік кінакампаніі, старшыня Праўлення Асацыяцыі тэле- і кінапрадзюсараў Расіі Сяргей Сяльянаў, яго намеснік па кампаніі, член Праўлення Асацыяцыі Ганна Крутава, кіраўнік уласнай студыі, заснавальнік Адкрытага расійскага фестывалю "Кінатаўр" Ігар Талстуноў, рэжысёр, сцэнарыст, акцёр тэатра і кіно Аляксандр Стрыжэнаў, старшыня Савета дырэктараў і заснавальнік прыватнай кампаніі Уладзіслаў Рашын.

Мэтай сустрэчы было вызначана азнаямленне расійскіх прадзюсараў з новымі эканамічнымі ўмовамі супрацоўніцтва ў сферы кінавытворчасці з Рэспублікай Беларусь. Мерапрыемства пачалося са слова Паўла Латушкі, у якой кіраўнік Міністэрства агучыў змены, што чакаюць сферу кінавытворчасці ў Беларусі пасля прыняцця шэрагу новых актаў і змяненняў у дзеючае заканадаўства. Так, для прыватных прадзюсараў будуць прадугледжаны значныя падатковыя, а таксама іншыя льготы і магчымасць браць крэдыты ў банках пад 4% гадавых. Апрача таго, мяркуецца, што дзяржава будзе страхаваць прадзюсарскія рызыкі ў тым выпадку, калі стужка пераадолее псіхалагічны бар'ер у 80 тысяч гледачоў у беларускім пракаце. Тады 50% укладзеных у вытворчасць прыватных грошай вернуцца прадзюсару.

Атрымаць дзяржаўныя сродкі на вытворчасць можна будзе толькі праз конкурс кінапраектаў, якія мае разглядаць конкурснае журы. Такім чынам, цяперашняя схема, па якой Экспертны савет пры Дэпартаменце па кінематаграфіі разглядае сцэнарыі, заменіцца схемай разгляду праектаў з эканамічным абгрунтаваннем. Мэта такіх захадаў — зрабіць вытворчасць беларускіх стужак больш рэнтабельнай, у чым могуць дапамагчы расійскія прадзюсары, больш вопытныя ў рынкавых адносінах. Прычым беларускі бок зацікаўлены як у сумесных пастаноўках, так і ў дзейнасці расійскіх кінакампаній па карыстанні паслугамі "Беларусьфільма" ды іншых айчынных арганізацый. Апошняму павінна спрыяць павышэнне тэхнічнага і прафесійнага ўзроўню Нацыянальнай студыі пасля завяршэння яе рэканструкцыі ў снежні наступнага года. Зразумела, што асноўнай умовай супрацоўніцтва з замежным бокам з'яўляецца стварэнне стужак на аснове нацыянальнай тэматыкі і максімальнае выкарыстанне магчымасцей беларускай кінавытворчасці.

У дыскусіі, што пачалася пасля ўводзінаў у тэму гаворкі, расійскімі прадзюсарамі была выказана зацікаўленасць як у самой нашай краіне і яе спецыялістах, так і ва ўмовах, што прадугледжваюць патэнцыйныя змяненні ў беларускім заканадаўстве. Госці задалі шэраг пытанняў, якія датычыліся акалічнасцей заканадаўства, схем фінансавання, тэхнічнага патэнцыялу Нацыянальнай студыі, і атрымалі на іх грунтоўныя адказы. Расійскіх прадзюсараў упэўнілі ў падтрымцы ўсіх патэнцыйна годных праектаў, што, як спадзяецца беларускі бок, паступяць у нашу краіну бліжэйшым часам.

"К" плануе ў наступных нумарах больш падрабязна асвятліць надзённыя пытанні, узнятыя на гэтай сустрэчы.

Нацыянальная музычная прэмія: канцэпцыя старту

Эталоннае вымярэнне для айчыннай эстрады

Жанр песні заўсёды ў цэнтры ўвагі. А з часоў удзелу Беларусі ў "Еўрабачанні" ўвогуле стаў ледзь не галоўным у айчыннай музычнай прасторы. Стварэнне нацыянальнага рэпертуару немагчымае без прытоку ў айчынную эстраду крэатыўных прафесіяналаў. Гэта — адзін з надзённых тэзісаў у дадзенай сферы. Каб стымуляваць яго рэалізацыю на дзяржаўным узроўні, быў заснаваны Рэспубліканскі конкурс "Нацыянальная музычная прэмія ў галіне эстраднага мастацтва". Палажэнне аб ім, нагадаем, было зацверджана Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь 24 снежня 2010 года.

У нацыянальным "фармаце"

— З ініцыятывай стварэння гэтай прэміі, — распавёў начальнік упраўлення мастацтваў Міністэрства культуры Беларусі Міхаіл Казловіч, — выступіла Міністэрства культуры. Распрацоўваліся арганізацыйныя пытанні, звязаныя з яе заснаваннем, уласна ўмовы, паводле якіх яна будзе прысуджацца. Прынята пастанова Урада аб заснаванні такой прэміі, распрацавана Палажэнне аб прэміі. Прэмія невыпадкова будзе прысуджацца менавіта ў сферы эстрады. Вядома, музычнае мастацтва куды больш шырокае і ўсеабдымнае, яно ахоплівае многія іншыя кірункі, жанры, дзе дасягненні нашых кампазітараў ды выканаўцаў на міжнародным і нават сусветным узроўні, можа, больш высокія. Але ў сферы акадэмічнай музыкі ўжо існуюць свае прэміі. Творцы, якія працуюць у гэтай галіне, могуць прэтэндаваць і на Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь, і на прэмію "За духоўнае адраджэнне", а таксама на спецыяльныя прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва, што ахопліваюць як кампазітарскую і выканальніцкую дзейнасць у сферы музычнага мастацтва, так і педагагічную. Ладзіліся ў нас і ўласна эстрадныя конкурсы, але не такога рангу. Так, у межах як усёй краіны, так і асобных рэгіёнаў праводзіліся разнастайныя выканальніцкія конкурсы, але гэта зусім іншае: там ацэньваюцца найперш вакальныя здольнасці спевакоў, іх уменне трымацца на сцэне, густ у выбары рэпертуару. Акрамя таго, штогод узнікалі шматлікія хіт-парады, агляды песень года і, вядома, звязаныя з усім гэтым прэміі. Але наўрад ці яны мелі асаблівую вагу. Іх заснавальнікамі выступалі і тэлеканалы, і іншыя СМІ, часта такія конкурсы набліжаліся да шоу, былі разлічаны найперш на прыцягненне публікі, насілі забаўляльны характар. Да таго ж, зразумела, калі прэмію прысуджаў той або іншы канал ці радыёстанцыя, яны ўлічвалі, безумоўна, найперш свой фармат і адпаведнасць яму твораў. Усё гэта было, можа, і няблага, але недастаткова. З'яўленне Нацыянальнай прэміі ні ў якім выпадку не азначае, што ўсе астатнія творча-відовішчныя спаборніцтвы будуць скасаваны. Навошта? Хай існуюць, кожны — у сваёй прасторы. Але відавочна, што пры такой, здавалася б, размаітасці лакальных узнагарод даўно наспела патрэба ў менавіта Нацыянальнай прэміі, якая будзе стымуляваць развіццё — падкрэслю — нацыянальнага мастацтва ў сферы эстрады.

Радасць — з клопатам, трукі — з трэкамі

У тым, што такая прэмія неабходна, з апытаных намі дзеячаў культуры не сумняваецца ніхто. Але як толькі размова заходзіць пра ўвасабленне распрацаваных правілаў, многія выказваюць і няўпэўненасць, і свае прапановы, і нават контрпрапановы. Яно і зразумела: узнятая тэма не можа не хваляваць, бо зачапіла, што называецца, за жывое.

— Беларускамоўныя песні, — дапаўняючы адно аднаго, разважаюць удзельнікі дуэта "Аляксандра & Канстанцін", — сёння, здараецца, цяжка "прасунуць". Іх бяруць хіба дзяржаўныя радыёстанцыі, астатнія ж "круцяць", у асноўным, рускамоўныя. Нават на 75-і працэнтах айчыннага гэта ніяк не адбіваецца. Вынікі хіт-парадаў часам папросту бянтэжаць, бо там ацэньваецца не музычны ўзровень песень, а, хутчэй, густы рэдактараў і слухачоў. Дый беларускамоўных хіт-парадаў практычна не існуе — хіба толькі адзін, інтэрнэтаўскі. А ўлічваючы, што запіс песні ў прафесійнай студыі каштуе ад 500 да 1 тысячы долараў, у многіх выканаўцаў узнікае пытанне: навошта ўкладаць такія грошы, калі твор потым не будзе гучаць? Нацыянальная прэмія і той грамадскі розгалас, які яна атрымае, здольныя калі не выправіць сітуацыю, дык, дакладна, зрушыць яе ў лепшы бок. Таму вельмі важна, хто будзе ў журы і па якіх крытэрыях будуць ацэньвацца намінанты. Бо публіка часцей рэагуе (і тое ж "Еўрабачанне" — таму доказам) ці на сваіх улюбёнцаў, прычым незалежна ад таго, што тыя зараз спяваюць, ці на нейкае шоу. Рашэнне ж прафесійнага журы павінна ўстанаўліваць нейкую планку. І на яе будуць раўняцца іншыя. А яшчэ вельмі важна, каб мы маглі сачыць за творчым лёсам пераможцаў і ўладальнікаў узнагарод. Бо любы знак прызнання яшчэ і абавязвае, стымулюе. І паглядзець на творчы рост тых, хто быў адзначаны, бывае цікава не толькі "канкурэнтам", але і шырокаму колу слухачоў.

— Нацыянальная прэмія, — дзеліцца сваім меркаваннем галоўны рэдактар музычнага вяшчання Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё Тацяна Якушава, — патрабуе адпаведнага ўзроўню. Цяперашняя ж эстрада, на якой пануе аматарства — у супрацьвагу інтэлігентнаму прафесіяналізму мінулых гадоў, — у большасці сваёй яшчэ не дарасла да яго. Прычына таму — у жаданні хутчэй зарабіць грошы, а самы лёгкі шлях да гэтага — у перайманні расійскай эстрады, што трывала мае свайго слухача, у скарачэнні выдаткаў менавіта на песню: маўляў, напішам самі (гэта ж так проста!) — танней будзе. Вось і атрымліваюцца нават не песні, а… трэкі. Вядома, прэмія стане стымулам, але яе ўручэнне павінна папярэджвацца вялізным этапам напружанай працы — не толькі дзеячаў культуры, але і арганізатараў. Давайце будзем рэалістамі: вынік, якога мы чакаем, можа быць дасягнуты далёка не адразу, а толькі праз некалькі гадоў. Першнаперш патрэбны нейкі праект, які збярэ намаганні дзеячаў эстрады па стварэнні нацыянальнага рэпертуару. Ён мог бы стаць той базай, на аснове якой і будзе праводзіцца далейшы конкурс. Бо маладых выканаўцаў шмат, але ім не хапае добрых песень. Я толькі што прыехала з Маладзечна, дзе праходзіў IV фестываль-конкурс "Маладзічок", — тыя ж самыя праблемы: таленавітых дзяцей шмат, але што яны спяваюць? Арганізатары конкурсаў нават наўмысна прапісваюць ва ўмовах абавязковае выкананне беларускамоўных песень — пажадана, новых. На тым жа "Белазаўскім акордзе", які мае статус Адкрытага рэспубліканскага конкурсу, аўтарам лепшай беларускамоўнай песні нават асобную прэмію ўручаюць. На Беларускім радыё з 1 красавіка стартуе конкурс "Маладыя таленты Беларусі": зноў-такі, ва ўсіх намінацыях прапісана абавязковае выкананне беларускага рэпертуару.

Іншымі словамі, нацыянальны рэпертуар трэба падтрымліваць, "раскручваць" — тады будзе з чаго выбіраць песні, годныя высокага гонару — Нацыянальнай прэміі.

Разам з тым, сярод дзеячаў культуры існуюць і цалкам аптымістычныя прагнозы, таксама, што цікава, заснаваныя на параўнанні з ранейшым станам у галіне эстрады.

— Без прэмій нецікава, — усміхаецца аўтар безлічы песень, выканаўца і прадзюсар Сяргей Сухамлін. — Мы нават не бачымся! Кожны сядзіць у сваёй студыі. На гала-канцэртах — выходзіць са сваёй грымёркі. На такіх жа праектах, як "Песня года", а яшчэ раней — "Песню бярыце з сабой!", мы ўсе збіраліся разам, песні адно аднаго былі на віду. І гэта таксама вымушала працаваць "на зайздрасць суседу", у лепшым сэнсе слова. Нацыянальная прэмія — гэта, найперш, стымул. Не трэба, думаю, ставіцца да яе як да нейкага "фактара круцізны", як да гэткага "абсалютнага паказчыка прафесіяналізму ў апошняй інстанцыі". Давайце з радасцю прымаць усё новае, што ўзнікае, і, адначасова, не забывацца на лепшыя традыцыі. Нацыянальная прэмія — акурат такая падзея, што яднае мінулае з будучым.

50 на 50: кіт альбо слон?

Як жа будзе праходзіць вызначэнне пераможцаў? Гэтае пытанне хвалюе не толькі патэнцыйных намінантаў на прэмію, але бадай кожнага з нас: хочам мы таго ці не, а да эстрады спрычыняемся, хаця б у ролі слухачоў, амаль штодзень.

— Медыйным партнёрам Міністэрства культуры, — тлумачыць начальнік упраўлення мастацтваў Мінкультуры Міхаіл Казловіч, — выступае "Сталічнае тэлебачанне". У канцы года па СТБ пройдзе гала-канцэрт, па выніках якога і абяруць пераможцаў. Прэмія вызначаецца па тых песнях, што з'явіліся і з'явяцца сёлета, заяўкі на конкурс могуць падаваць і творчыя калектывы, і ўстановы культуры, і самі музыканты. Галоўнае, каб песні былі годныя. Рашэнне будзе прымацца, можна сказаць, калегіяльна, у самым шырокім сэнсе гэтага слова, бо 50 працэнтаў ацэнкі складуць меркаванні прафесійнага журы, а яшчэ 50 — вынікі галасавання гледачоў. Дарэчы, нагадаю, прэмія вызначаецца па розных намінацыях. Акрамя галоўнай — "Лепшая песня года", ёсць шмат іншых. Прычым штогод Аргкамітэт можа змяняць намінацыі, каб закцэнтаваць увагу творцаў менавіта на тых складніках песні, якія маюць на сёння найбольшае значэнне для далейшага развіцця нашай эстрады. Такі падыход да намінацый не новы, ён практыкуецца на многіх конкурсах, але часта вызначаецца па тых заяўках, якія ўжо пададзены. Здараецца, на тую або іншую намінацыю набіраецца недастатковая колькасць прэтэндэнтаў, ці ўзровень удзельнікаў нейкай катэгорыі недастаткова высокі. І журы пакідае за сабой права не прысуджаць ў гэтай намінацыі прэмію — атрымліваецца "натуральны адбор"... Літаральна ў бліжэйшыя два тыдні Аргкамітэт вызначыцца з намінацыямі канчаткова — калі ласка, творцы, працуйце!

Сапраўды, вызначэнне намінацыі — гэта яшчэ і вызначэнне тых крытэрыяў, па якіх будзе ацэньвацца твор, на што ў ім у першую чаргу будзе звяртацца ўвага: уласна на музыку, на словы, аранжыроўку, выкананне. І хаця ўсе, зразумела, пагодзяцца, што добрая песня — гэта гармонія пералічаных складнікаў, у вылучэнні асобных элементаў з іх далейшым паяднаннем заключаецца яшчэ і навуковы падыход да песеннага жанру.

— Самае галоўнае ў любым конкурсе, у любым вылучэнні на тую або іншую прэмію, — лічыць народны артыст Беларусі, кампазітар Эдуард Зарыцкі, — гэта дасканалая распрацоўка саміх умоў, так бы мовіць, "правілаў гульні". Мне шмат даводзілася і самому ўдзельнічаць у розных праектах, і працаваць у складзе журы, разнастайных экспертных камісій, нават быць старшынёй журы некалькіх міжнародных конкурсаў. І я заўважыў адну заканамернасць. Калі самі патрабаванні да намінантаў прапісаны дакладна, калі ў іх максімальна ўлічваюцца ўсе магчымыя абставіны, да журы ніколі не ўзнікае ніякіх пытанняў: маўляў, чаму не мне, а яму, і г. д. Ды і самому журы працаваць у такіх умовах вельмі зручна, бо паміж членамі не ўзнікае непаразуменняў, выкліканых менавіта рознымі падыходамі: адзін, да прыкладу, ацэньвае ўласна вакал, другі — саму песню, а трэці — яе відовішчнае данясенне да публікі. Атрымліваецца амаль паводле басні Крылова: "лебедзь, рак ды шчупак". І вынікі такога "судзейства" могуць быць самымі непрадказальнымі, бо журы, вобразна кажучы, намагаецца вырашыць пытанне, невырашальнае ўжо паводле самой сваёй пастаноўкі. Вось вы можаце адказаць, хто мацнейшы: кіт ці слон? Так і тут…



Дадамо яшчэ і тое, што творцы — людзі імпульсіўныя, у іх насамрэч вельмі тонкая душэўная арганізацыя, яны ўжо паводле роду сваёй дзейнасці не могуць быць "таўстаскурымі". І сам факт параўнання іх з кімсьці іншым, ды не на карысць сабе, стварае стрэсавую сітуацыю, якая зусім не спрыяе творчасці. Але ж, прабачце, ніхто з іх не пакутуе, што яго не прызналі, да прыкладу, алімпійскім чэмпіёнам. Бо ў спорце — цалкам зразумелыя ўмовы. У мастацтве ж, асабліва — эстрадным, сёння многія крытэрыі размытыя. Камусьці яно ўвогуле ўяўляецца звышпростым і даступным: намурлыкаў тры ноткі — і ты кампазітар, прыдумаў рыфму — ты паэт, заспяваў — ужо і спявак. А вось прафесіянал пачувае сябе ў такім асяродку няўтульна.

— Прыцягненне прафесіяналаў, — лічыць прадзюсар Юрый Саваш, — магчымае тады, калі прэмія — заўважная: перамогай, да прыкладу, становіцца грант, на які можна падрыхтаваць новую праграму, змяніць канцэпцыю сваёй творчасці, рызыкнуўшы на эксперымент. Калі ж прэмія — сімвалічная, дык праект збірае найперш аматараў, каму бывае важнае прызнанне само па сабе — часцяком усё роўна, у якой сферы. А эстрада ўяўляецца "лёгкай"...

Памеры прэміі ў Палажэнні, вядома, прапісаны: ад 62-х базавых адзінак да 95-і, у залежнасці ад намінацый. Прадугледжана і стварэнне кліпа на лепшую песню. Слова — за творцамі!

— Любое ўручэнне прэмій, — кажа Юрый Саваш, — гэта заўсёды самая рэйтынгавая тэлепраграма. І яе ўдзельнікі ўжо самі па сабе становяцца вядомымі на ўсю краіну. Але не гэта галоўнае! Прэмія — гэта ўсталяванне арыенціраў, своеасаблівых эталонных вымярэнняў. І Нацыянальная прэмія — гэта творчы арыенцір для эстрады на ўсю краіну.

— У добра арганізаваным конкурсе, — працягвае Эдуард Зарыцкі, — не бывае пацярпелых і прайграўшых. І наадварот: больш за ўсё непаразуменняў узнікае, калі, паўтаруся, "правілы гульні" не ўдакладнены ці, яшчэ горш, раптоўна змяняюцца ўжо пад час спаборніцтва. А такое, на жаль, таксама здараецца. Нетактоўным бывае і паяднанне ў адной намінацыі прафесіяналаў і аматараў: у такіх праектах, часцей за ўсё, прафесіяналы ўвогуле вырашаюць не ўдзельнічаць...

Конкурсаў, хіт-парадаў, прэмій сёння шмат. Кожны можа выбраць тое, што яму бліжэй. Мэта ж Нацыянальнай прэміі вызначана ўжо ў самой яе назве, у статусе — Нацыянальная. Таму пажадаем ёй добрага, упэўненага старту!

Надзея БУНЦЭВІЧ

2 красавіка — Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі

Заслужаная артыстка Расіі Наталля БАНДАРЧУК з задавальненнем наведвае Мінск пры кожным зручным выпадку, часта з'яўляецца госцяй Мінскага міжнароднага кінафестывалю "Лістапад". Сёлета яна пабывала ў нас са сваёй новай стужкай. Гісторыка-біяграфічную карціну "Гогаль. Бліжэйшы" яна асабіста прэзентавала ў нашай сталіцы наступным днём пасля маскоўскай прэм'еры. Паездка Наталлі Бандарчук з новым фільмам уключала гэтым разам і паказ у Магілёве.

У паўзе паміж мерапрыемствамі прэзентацыйнага тура Наталля Сяргееўна адказала на некалькі пытанняў карэспандэнта "К".

Наталля БАНДАРЧУК, заслужаная артыстка Расіі:

"Я закахалася ў Беларусь!"

Чаму свае прэм'еры рэжысёр "апрабоўвае" ў Мінску?

— Наталля Сяргееўна, "Гогаль. Бліжэйшы" — ваша другая стужка аб вялікіх рускіх пісьменніках XIX стагоддзя. Чаму такая ўвага менавіта да гэтага перыяду?

— Таму што фільмы аб іх здымаюць вельмі рэдка. Спачатку я планавала рабіць карціну аб Лермантаве, але, з фінансавых прычын, давялося заняцца Гогалем, аб чым зусім не шкадую. Гісторыя Мікалая Васільевіча, яго раскаянне — усё гэта вельмі кранае. Назва ж стужкі ўзнікла ад таго, што мастацтвазнаўцы ўпэўнены: для карціны Іванава "З'яўленне Хрыста народу" пазіраваў сам Гогаль. У спецыяльнай літаратуры гэтага персанажа называюць "Бліжэйшы да Хрыста". Мне падалося тое вельмі сімвалічным.

Гэта стужка аб вельмі таленавітым чалавеку, які раптам зразумеў, што народжаныя ім вобразы нясуць у свет ліха, і вырашыў ачысціцца, пачаў весці праведнае жыццё. Дарэчы, я ў сямнаццаць гадоў сама сыграла ролю Каробачкі ў студэнцкай тэатральнай пастаноўцы, якую ладзіў Сяргей Ніканенка. Памятаю і тое, як Наташа Варлей распавядала пасля здымак у "Віі", як ёй цяжка было. Адказнасць мастака перад створанымі вобразамі — вельмі важнае для мяне паняцце.

— У вашай стужцы — вельмі цікавы акцёрскі ансамбль...

— Так, у ролі Гогаля здымаўся выдатны тэатральны акцёр Яўгеній Радзько. Аляксандру Смірнову-Расэт, у якую пісьменнік быў закаханы, увасобіла Анастасія Заваратнюк. І яна выдатна справілася з роляй гэтай прыгажуні, бо паўстае перад гледачом зусім не такая, як у шматлікіх тэлешоу. За свой выбар Яўгенія Радзько я тым больш рада, паколькі за межамі Масквы мала хто ведае гэтага цудоўнага тэатральнага артыста.

Пасля маскоўскай прэм'еры да мяне падышла жанчына, спецыяліст па літаратуры, і сказала: "Я разумею, Гогаль быў менш прыгожым за Яўгенія Радзько, але я закахалася менавіта ў такога Гогаля". Мяне прыемна ўразілі гэтыя словы, бо я заўсёды намагаюся, каб паміж гледачом і экранам існавалі цёплыя сардэчныя пачуцці.

— Дзе праходзілі здымкі?

— Часткова карціну здымалі на студыі імя Даўжэнкі ў Кіеве, але былі выезды і на месцы падзей, у тым ліку ў Расіі і Італіі. Напрыклад — у манастыры ў Опцінскай пустыні. Дазвол на здымкі там атрымаць вельмі цяжка. Мы звярнуліся з пісьмовай просьбай да тагачаснага Патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі Алексія II, і, прызнаюся, зусім нечакана для нас яна была задаволена. Знятыя там кадры — безумоўна, лепшыя ў стужцы.

— Ці ёсць жаданне зрабіць фільм па матывах сваёй творчасці, падзей, у якіх удзельнічалі?

— У мінулым, юбілейным для мяне, годзе я зняла чатырохсерыйную дакументальную карціну "Сустрэчы на Салярысе" пра Андрэя Таркоўскага, стужкі "І вечнасцю напоўнена імгненне. Сяргей Бандарчук", "Сяргей Бандарчук. Паслялоўе", а сёлета распачала здымкі фільма аб маці, Іне Уладзіміраўне Макаравай, якая, да слова, перадае прывітанне сваім прыхільнікам на Беларусі.

— Дарэчы, ці дапамагалі вам у жыцці гучныя імёны родных?

— З аднаго боку, дапамагалі, бо мае бацькі — людзі культуры. З самага нараджэння мяне акружалі добрыя кнігі з нашай вельмі багатай бібліятэкі. З іншага боку, было шмат перашэптванняў за спінай, напрыклад, тады, калі я абсалютна "аўтаномна" ад родных паступіла ў ВГИК. Дарэчы, на той момант мае бацькі ўжо былі ў разводзе... Калі здымалася ў "Салярысе", дык нехта нашэптваў Таркоўскаму, што, маўляў, ён здымае дачку кіраўніка, але той толькі смяяўся… Цяпер, калі майго бацькі даўно няма, я зразумела, якой ён быў трагічнай постаццю. Памятаю, як на Пятым З'ездзе Саюза кінематаграфістаў СССР ён прадказаў дзве рэчы, за што зведаў шквал крытыкі: разбурэнне краіны і неверагоднае падзенне ўзроўню культуры ў Расіі… Наогул, сапраўднаму мастаку заўсёды цяжка.

— Род Бандарчукоў працягвае сваю дзейнасць у кінамастацтве. На слыху стужкі вашага брата Фёдара. Як ставіцеся да ягонай творчасці?

— Фёдар — вельмі таленавіты чалавек, такі ж самы працаголік, як і наш бацька. Але ён — сучасны мастак. Памятаю, як глядзела яго першую карціну "Дзявятая рота" пра нашых салдат у Афганістане. Бачыла, як людзі плакалі пад час прагляду, я і сама плакала... Другі фільм — "Населены востраў" — мне не такі блізкі, бо не прылічаю сябе да прыхільнікаў фантастыкі братоў Стругацкіх: мне бліжэй творы Станіслава Лема і Айзека Азімава. У гэтым выпадку, больш за ўсё спадабаўся "фільм пра фільм", дзе паказваецца складаны працэс здымак "…Вострава". Што да экранізацый, дык яшчэ раз згадаю Андрэя Таркоўскага, які амаль перапісаў сюжэт аповесці Стругацкіх "Пікнік на ўзбочыне" і зняў свайго "Сталкера". Фёдар сутыкнуўся з тым, што яму давялося экранізаваць кнігу, напісаную ў савецкія часы. Нешта ў яго атрымалася, нешта — не. Але тое, што ён зрабіў, — неверагодна складана! Я карціну такога маштабу зняць не магу, а Фёдар — здолеў. Адзінае, чаго мне не хапіла ў той стужцы брата, — гумару.

Што ж да задачы, якую Фёдар паставіў перад сабою цяпер — здымка фільма аб Сталінградзе, — то яна вельмі маштабная, але я ўпэўнена: брат з ёю справіцца, бо гены ў яго — бацькоўскія.

— Які фільм са сваім удзелам найбольш упадабалі?

— Нейкага пэўнага няма. Люблю "Салярыс", люблю "Зорку чароўнага шчасця", ролю Марыі Валконскай, якую ў ёй выканала. Дарэчы, як толькі прыехала ў Мінск, адразу пайшла на могілкі да Мікалая Яроменкі-малодшага, з якім здымалася разам у апошняй стужцы. Памянула і яго бацьку, Мікалая Яроменку-старэйшага. З ім таксама здымалася. Ён шмат працаваў з маім настаўнікам Сяргеем Апалінар'евічам Герасімавым...

Увогуле, я ўдзельнічала больш чым у 50 фільмах. Звыш дзясятка ігравых стужак зняла як рэжысёр. Вельмі люблю працаваць з дакументальным матэрыялам. Да прыкладу, сёлета выпраўляюся на Горны Алтай, каб зняць аб ім карціну. Люблю падарожнічаць па некранутых цывілізацыяй мясцінах…

— Ці можна навучыцца акцёрскаму таленту?

— Ведаеце, у мяне ёсць свой дзіцячы тэатр "Бэмбі". У ім іграюць дзеткі ад трох гадоў. Я бяру іх да сябе без аніякага "кастынгу". Іншая справа, што кожнаму з іх усё роўна даводзіцца працаваць над роляй, вучыць тэкст. У тэатры ёсць і дарослыя выканаўцы, прычым шмат з іх — тыя, хто пачынаў у мяне яшчэ дваццаць — дваццаць пяць гадоў таму. Яны выраслі, скончылі тэатральныя вучылішчы — і вярнуліся да мяне, і гэта вельмі прыемна. Як бачыце, тэатр зацягвае, дае магчымасці разгарнуць закладзены ў кожным чалавеку талент. Таксама як і ў балеце, музыцы, у драме трэба пачынаць як мага раней, і тады будзе плён.

Хачу ўзгадаць паказальны выпадак. У адным са спектакляў ролю Зайца, за якім гоніцца Воўк, выконваў шасцігадовы Ванечка. І пасля рэплікі, дзе ягоны персанаж прасіў дапамогі, з глядзельнай залы на сцэну пачынае рвацца іншы хлопчык, каб дапамагчы "зайчыку"! Бацькі, дзякаваць богу, яго затрымалі, а наш Ванечка падышоў да мяне ў антракце і кажа: "Наталля Сяргееўна, я ў такіх умовах не магу працаваць". Я яму ў адказ: "Цярпі, Ванечка! Ты ж акцёр!" Цяпер гэты Ванечка — дарослы, скончыў Шчэпкінскае вучылішча і сыграў 29 роляў.

"Бэмбі" — гэта тэатр, у якім дзеці іграюць для дзяцей. У мінулым годзе, дзякуючы падтрымцы чыгуначнікаў, мы атрымалі магчымасць ладзіць калядныя спектаклі проста на Кіеўскім вакзале ў Маскве. Для нас спецыяльна адгарадзілі частку залы чакання, і мы выступалі перад дзецьмі з няпоўных сем'яў, дзецьмі-інвалідамі. Тэатр лечыць людзей. Некалі адну з роляў у маёй пастаноўцы выконваў хлопчык з дыягназам "цэрэбральны параліч", і зала яму апладзіравала! Прайшлі гады, ён вырас і стаў псіхолагам, які цяпер займаецца рэабілітацыяй такіх самых дзяцей, як ён! Ці ж гэта не лепшае сведчанне цудоўнай сілы тэатра?

Тэатр — таксама адпачынак для дзіцяці, магчымасць на некалькі гадзін апынуцца ў больш камфортнай за звычайную абстаноўцы. Дзіця можа быць двоечнікам, мець праблемы ў сям'і, а ў нас ён валодае неабмежаванымі магчымасцямі, каб раскрыць сваю фантазію і асобу. Таму не раздумвайце, аддавайце дзяцей у тэатр, няхай не прафесійны, хатні!

— У свой час вы знялі дзве цудоўныя стужкі для дзяцей: "Дзяцінства Бэмбі" і "Юнацтва Бэмбі"...

— А я не адмаўляюся ад планаў здымак для дзяцей! Ёсць задума стварыць новую карціну з выкарыстаннем найноўшых тэхналогій 3D-стэрэа. Калі зраблю, першым горадам, дзе пакажу яе пасля Масквы, будзе Мінск. Увогуле, я неверагодна люблю Беларусь! Я закаханая ў вашу краіну, дзе ўзараныя палі, ладныя дарогі з чыстымі ўзбочынамі, цудоўныя, сучасныя гарады… Упэўнена, што ў вас усё будзе добра!

Гутарыў Антон СІДАРЭНКА
Фота Віктара ЗАЙКОЎСКАГА

"Офіс" і "Паўлінкі"

У Міжнародны дзень тэатра ў пансіянаце "Тэатральны" Беларускага саюза тэатральных дзеячаў уручылі штогадовыя ўзнагароды.

Пад час урачыстасцей міністр культуры Рэспублікі Беларусі Павел Латушка падкрэсліў ролю апякунскіх саветаў, якія цяпер змогуць ствараць арганізацыі культуры, адзначыўшы значную ролю спонсарскай дапамогі ў рэалізацыі новых тэатральных праектаў і фінансаванні гастролей. Міністр нагадаў, што ў хуткім часе запланавана і першае ўручэнне Нацыянальнай тэатральнай прэміі.

Лаўрэатам "Хрустальнай Паўлінкі" стала артыстка Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача Вера Кавалерава. Прыз "Хрустальны анёл" сёлета — у руках артыста Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек Уладзіміра Грамовіча. За вялікі ўнёсак у развіццё тэатральнага мастацтва "Хрустальнай зоркай" уганараваны артыст Тэатра-студыі кінаакцёра Пётр Юрчанкоў. Дзве ўзнагароды апынуліся ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Максіма Горкага: "Хрустальная кветка" за самы яркі дэбют — у артыста Руслана Чарнецкага, а прыз "Натхненне" — у дырэктара ўстановы Эдуарда Герасімовіча.

Гэтымі ж днямі Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь сумесна з Беларускім фондам культуры падвёў вынікі Рэспубліканскага конкурсу мастакоў тэатраў на саісканне прэміі імя І.Ушакова. Пераможцай гэтага года стала мастачка Алена Ігруша за сцэнаграфію да "Офіса" купалаўцаў, а ганаровую грамату БФК і магчымасць правесці персанальную выстаўку ў Музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры атрымаў мастак Уладзімір Пазняк за сцэнаграфію да пастаноўкі Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра "Казка дзікага лесу".

Старшыня Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах UNESCO Уладзімір Шчасны на ўрачыстасцях у музеі ўручыў дыплом міжнароднай арганізацыі за прапаганду беларускага тэатральнага мастацтва ў СМІ. Яго лаўрэатам стала журналістка Беларускага радыё Наталля Баўкалава.

Галерэйны тыдзень

Тры выстаўкі, што дэманструюць дасягненні культуры і мастацтва Грэцыі, Італіі і Францыі, адкрыліся ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Выстаўка "Спадчына ў фокусе аб'ектыва: сто пяцьдзясят гадоў фатаграфіі італьянскіх аб'ектаў сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны UNESCO" працуе ў галерэі "Лабірынт". У яе ўваходзіць больш за 200 работ, што адлюстроўваюць 45 аб'ектаў, унесеных у Спіс сусветнай спадчыны UNESCO. Гэтыя кадры рабілі вядомыя фотамастакі пачынаючы з сярэдзіны XIX стагоддзя.

У галерэі ж "Ракурс" прайшло мерапрыемства "Пад небам Грэцыі Свяшчэннай…" у рамках святкавання Дня Незалежнасці Грэчаскай Рэспублікі і 190-годдзя вызвалення ад турэцкага прыгнёту. У ім прынялі ўдзел члены Беларускага грамадскага аб'яднання грэкаў "Пелапанэс". Дапаўняюць адмысловую кніжную экспазіцыю жывапісныя работы Ірыны Гілеп і Паўла Дзімітрыядзі ў "Мабільнай галерэі".

А з 31 сакавіка ў галерэі "Панарама" працуе выстаўка "Вяртанне да рамантызму", што дэманструе работы мастакоў Беларусі, у якіх адчуваецца творчая захопленасць здабыткамі лепшых прадстаўнікоў французскай школы. Аўтары — майстры розных пакаленняў і творчых кірункаў: Фёдар Ястраб, Яўген Шунейка, Ірына Котава, Юрый Падолін, Ігар Гарбуноў, Людміла Налівайка, Карына Харанека, Уладзімір Рынкевіч, Вольга Мельнік... Таксама, акрамя персанальных твораў, аўтары прадстаўляюць калектыўную работу — інсталяцыю на тэму французскай граматыкі "Знайдзі свой дзеяслоў".

І.Анісенка. Макет дэкарацый да спектакля "Хам".

В.Цімафееў. Макет дэкарацый да спектакля "Сны аб Беларусі".

У Музеі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў па ініцыятыве Беларускага саюза мастакоў і Беларускага саюза тэатральных дзеячаў працуе традыцыйная выстаўка "Вынікі сезона-2011". Гэта вопыт сістэматызацыі і асэнсавання сцэнаграфіі тэатральнага працэсу ў Беларусі.

Сезон квадрыенале

Уласны стыль? Не праз шкло

Дадзены праект выкліканы не толькі даследаваннем эстэтычных магчымасцей беларускага тэатральнага мастацтва на новым этапе яго развіцця, але і актуальнасцю месца мастака ў сучасным тэатры, значэнне якога ўсё ўзрастае.

Творчая актыўнасць тэатральных мастакоў выклікана, у першую чаргу, падрыхтоўкай да Пражскай квадрыенале — самага буйнога і прэстыжнага міжнароднага форуму, які адкрыецца ў чэрвені гэтага года ў чэшскай сталіцы. На ім будуць экспанавацца лепшыя дэкарацыі і касцюмы беларускіх сцэнографаў. Студэнцкі павільён прадставяць выхаванцы 4-га курса БДАМ Барыса Герлавана (аддзяленне тэатральна-дэкарацыйнага жывапісу) і 3-га курса Дзмітрыя Мохава (аддзяленне "выяўленчае рашэнне фільма").



Д.Мохаў. Эскіз дэкарацый да балета "Мефіста".

Д.Волкава. Макет дэкарацый да спектакля "Запіскі звар'яцелага музыканта".

За апошняе дзесяцігоддзе разам з такімі майстрамі, як Б.Герлаван, А.Касцючэнка, В.Рачкоўскі, Д.Мохаў, У.Чарнышоў, В.Цімафееў, Н.Гурло, на тэатральных падмостках упэўнена занялі сваю нішу выпускнікі Беларускай акадэміі мастацтваў І.Анісенка, Д.Волкава, В.Грыцаева, А.Меранкоў, В.Мацкевіч, Т.Нерсісян, В.Праўдзіна, Л.Сідзельнікава, Т.Сакалоўская.

У работах, прадстаўленых на выстаўцы, адчуваецца імкненне да стварэння ўстойлівай вобразнай сістэмы, да новых формаўтварэнняў, пошуку ўласнага стылю. Відавочна, што аўтары ўсё больш захоплены наватарскімі працэсамі, тыповымі для сучаснага тэатра, і, у той жа час, іх адрознівае глыбока паважлівае стаўленне да традыцыйных форм беларускай сцэнаграфіі.

Вопыт папярэдніх пакаленняў асэнсоўваецца імі больш уважліва, хоць, натуральна, не цытуецца і не прапануецца ў сённяшнім тэатры ў выглядзе паўтарэння пройдзенага. Асабліва радуе вастрыня мыслення мастакоў, вобразнае эмацыйнае ўвасабленне драматургіі, індывідуальны свет кожнага і жывая фантазія.

У экспазіцыі прывабныя менавіта тыя работы, дзе адчуваецца дух эксперыменту не дзеля фармальных новаўвядзенняў, але для больш дакладнага раскрыцця прапанаванай драматургіі. Сярод іх — макеты да спектакля "Пані Каханку" (А.Сарокіна), "Сны аб Беларусі" (В.Цімафееў), "Яго апошняе каханне" (Д.Волкава), "Пінская шляхта" (В.Мацкевіч), эскізы лялек і касцюмаў да спектакля "Драй швэстэрн " (Т.Нерсісян) і многія іншыя.

Адзначу, што сучасныя сцэнографы, працуючы над драматычнымі спектаклямі, не спрабуюць пазіцыянаваць сябе з дапамогай наватарскіх тэхнічных прыёмаў, такіх, як, скажам, кінапраекцыя і піратэхнічныя эфекты. Або функцыі сучаснай сцэнаграфіі куды больш высокія, чым эпатаж публікі.

Таму мастакі спрабуюць адкрыць новыя арыенціры ў свядомасці гледача шляхам філасофскага асэнсавання самай рознай драматургіі. Яны глыбока і ёмістa выказваюцца на такія тэмы, як "Чалавек", "Грамадства", "Навакольнае асяроддзе". І асабліва важна, што асэнсаванне гэтае адбываецца ў межах выстаўкі, а не праз шкло маніторaў і тэлеэкранаў. Толькі так — ад сэрца да сэрца — можна навучыць спагадзе і дараванню, навучыць, як можна жыць і як жыць нельга. Упэўнена, што гэтым імкненнем да адраджэння гармоніі і духоўнасці ў тэатры беларускія сцэнографы могуць годна супрацьстаяць безгустоўшчыне, павярхоўнасці, прымітыву і непрафесіяналізму.

Ірына РАХМАНАВА,
тэатразнаўца

А.Сарокіна. Макет дэкарацый да спектакля "Рускія вадэвілі".

Баланс без антракту

Метамарфозы ў прасторы фаўны

У Гарадской мастацкай галерэі твораў Л.Д. Шчамялёва працуе выстаўка жывапісу маладога беларускага мастака Васіля Зянько пад назвай "Драпежнік — ахвяра". У экспазіцыю ўвайшлі жывапісныя кампазіцыі, што адлюстроўваюць прадстаўнікоў фаўны, адны з якіх выступаюць у ролі паляўнічых, а іншыя — у ролі патэнцыйнай здабычы.

В.Зянько. "Сапернікі".

Паляванне ў разуменні аўтара — гэта цэлае мастацтва. Ахвяры пастаянна звяртаюцца да розных хітрыкаў, каб не быць злоўленымі, у той час як дзеянні драпежнікаў накіраваны на пераадоленне гэтых "выкрунтасаў". У некаторых творах адбываюцца нечаканыя метамарфозы: драпежнік раптам сам становіцца ахвярай. Падобнае ўзаемадзеянне персанажаў карцін успрымаецца бясконцым дзействам без перапынкаў на антракт, у якім драпежнікі і іхнія ахвяры выступаюць як акцёры рэальнага тэатра.

Ідэя гэтага праекта не абмяжоўваецца толькі паказам сістэмы "драпежнік — ахвяра" ў Свеце біясферы, які вечна эвалюцыянуе. Хоць ужо адно гэта заслугоўвае пільнай увагі мастака, паколькі ўсё ў прыродзе мае непаўторную прыгажосць, разнастайнасць і мудрасць светаўладкавання. Уважлівы глядач прасочыць у кампазіцыях некаторую ўзаемасувязь агульных законаў прыроды з чалавечым грамадствам. Такое "падзяленне" адбываецца ў адпаведнасці з псіхалагічным складам кожнага чалавека.

В.Зянько. "Ён і Яна ў выглядзе крабаў".

Дуальнасць свету мае на ўвазе, што ўсё імкнецца да пэўнага балансу: правы бок заўсёды ўраўнаважвае левы, верх — ніз, добрае — дрэннае, драпежнік — здабычу і г. д. Зыходзячы з захавання такога роду раўнавагі, псіхалогія "ахвяры" і "драпежніка" не можа быць аднолькавай, з усімі вынікаючымі адсюль наступствамі. У той жа час, выбудоўванне падобнага роду паралелей паміж светам прыроды і соцыумам з'яўляецца толькі суб'ектыўным пунктам гледжання аўтара праекта: кожны наведвальнік мае права на свой асацыятыўны шэраг пры прагляДзе гэтай выстаўкі.

Творы Васіля Зянько адрозніваюць у сваім родзе ўнікальная аўтарская манера пісьма. Яна грунтуецца на нечаканым спалучэнні некаторых стылявых асаблівасцей арт-нуво (арнаментальная хвалістасць ліній прыродных форм жывёльнага свету, прысутнасць лёгкай асіметрыі) і афрыканскага стылю (яркі, насычаны каларыт, прыродны мінімалізм, грубыя фактуры). Імпульсіўнасць, рытміка, маляўнічасць суседнічаюць у кампазіцыях Зянько з прыроднай прастатой і светлай наіўнасцю. Дадзеныя прыёмы падпарадкаваны індывідуальнаму аўтарскаму бачанню, таму работы мастака, выкананыя акрылавымі фарбамі, заўсёды лёгка пазнаюцца і валодаюць унікальнай сілай гучання.

Наталля СЯЛІЦКАЯ,
мастацтвазнаўца

Аўтар і вядучая рубрыкі — Таццяна КОМАНАВА

“Сыравіна” для эвалюцыі

“М.@rt.кантакт-2011”: у пошуках мадэлі новага тэатра

Другую “пяцігодку” свайго існавання Міжнародны маладзёжны тэатральны форум “М.@rt.кантакт” распачаў з імпэтам і ў добрай форме. І не выпадкова: папярэднія гады, у часе якіх “М.@rt.кантакт” заявіў аб сабе як аб адным з яркіх тэатральных фестываляў краіны, былі створаны перадумовы для таго, каб выйсці на новы — і арганізацыйны, і творчы — узровень. Тым больш, што ў бягучым годзе ўпершыню гэты форум, заснавальнікамі якога з’яўляюцца Магілёўскі абласны выканаўчы камітэт, упраўленне культуры Магілёўскага аблвыканкама і Магілёўскі абласны драматычны тэатр, быў падтрыманы на рэспубліканскім узроўні. Прычым Міністэрства культуры Беларусі не толькі выдаткавала фінансавыя сродкі на правядзенне сёлетняга фестывалю, але і запланавала грошы для пастаноўкі новага спектакля, які тэатр прадставіць на наступным “М.@rt.кантакце”. Аб гэтым пад час цырымоніі закрыцця форуму сказаў са сцэны першы намеснік міністра культуры краіны Уладзімір Карачэўскі.

Сцэна са спектакля “Рэвізар”.

Сцэна са спектакля “Офіс”.

Адметнасцю сёлетняй конкурснай праграмы сталася тое, што практычна ўсе калектывы-ўдзельнікі, акрамя беларускіх тэатраў, на магілёўскім форуме апынуліся ўпершыню. З аднаго боку, гэткі падыход арганізатараў да фарміравання афішы аказаўся даволі рызыкоўным. Аднак у выніку рызыка сябе апраўдала: гараджане і госці фестывалю атрымалі сапраўдную асалоду ад сустрэчы з яркімі і нешараговымі калектывамі з Балгарыі, Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Польшчы, Германіі і, натуральна, з нашымі Купалаўскім і Магілёўскім абласным тэатрамі.

Не заглыбляючыся ў расповеды пра саму фестывальную праграму, якая і сёлета, як заўсёды, вызначалася сваёй насычанасцю, хацелася б спыніцца на тым, у якім жа кірунку рухаецца сёння сучаснае тэатральнае мастацтва. Балазе глебу для гэткага аналізу “М.@rt.кантакт” даў багатую.

Эвалюцыя рэжысёрскай прафесіі ў XXI стагоддзі — гэтай тэме, якая сталася магістральнай для ўсяго форуму, быў прысвечаны і “круглы стол”, што прайшоў у яго рамках. На ім айчынныя і замежныя крытыкі паспрабавалі ўбачыць мадэль новага тэатра, намацаць стрыжнёвыя вектары, якія неўзабаве будуць вызначаць яго галоўнае аблічча. Аднак прадказальніцтва — справа не толькі няпростая, але і няўдзячная: любыя тэорыі могуць палягаць адно толькі ў практыцы, а таму рабіць высновы можна толькі пасля таго, як гэтыя самыя тэндэнцыі яскрава акрэсляцца.

Зрэшты, пэўныя напрамкі гэтай эвалюцыі былі заўважныя ўжо сёння — у конкурснай праграме “М.@rt.кантакту”. Прынамсі, тое, што функцыя рэжысёра як “перакладчыка” драматургічнага тэксту на мову тэатральнага аповеду, якая дамінавала цягам амаль усяго мінулага стагоддзя, сёння страчвае сваю актуальнасць. Асветніцкую задачу рэжысуры адсоўвае на другі план і здрабняе той факт, што сёння інфармацыйная прастора проста-такі перанасычана самымі рознымі крыніцамі і прапановамі. Ды і постмадэрнісцкая культура, што асабліва расквітнела напрыканцы мінулага стагоддзя, дэвальвавала саму п’есу як культурную каштоўнасць, ператварыўшы яе ў своеасаблівую “сыравіну” для новых аўтарскіх тэатральных выказванняў.

Другі важны фактар — відавочны пераход тэатральнай творчасці са сферы мастацтва ў сферу масавай культуры. Натуральна, што і да саміх тэатральных спектакляў прадастаўляюцца патрабаванні, у першую чаргу спажывецкага характару: адпаведнасць запытам і густам тых, хто купляе білеты, прыцягненне як мага больш шырокіх колаў патэнцыйных наведвальнікаў і г. д. Спектакль як твор мастацтва ўсё часцей саступае месца спектаклю як культурнаму прадукту, пакліканаму задаволіць рэкрэацыйныя патрэбы патэнцыйных спажыўцоў.

Зразумела, што і ў сучаснай рэжысуры назіраецца своеасаблівы раскол. Адны з рэжысёраў актыўна засвойваюць новыя ўмовы і патрабаванні, аддаючы перавагу стварэнню антрэпрызных, камерцыйных спектакляў, дзе поспех вымяраецца і вызначаецца тым, наколькі канчатковы прадукт становіцца папулярным і запатрабаваным у глядацкіх колах. Другія, сцвярджаючы, што ўсялякія “рэформы” ды пераарыенціроўкі толькі губяць тэатр, спавядаюць ў сваёй творчасці прынцыпы стварэння так званых рэпертуарных пастановак — тых, якія на сённяшні дзень складаюць пераважную большасць, прынамсі, на беларускай сцэне. І трэцяя катэгорыя творцаў, перакананых, што праца на патрэбу знішчае творчасць, схіляецца да думкі, што толькі чысты арт выратуе сёння тэатральнае мастацтва ад татальнай дэвальвацыі.

А што ж лічыць на гэты конт глядач? Нягледзячы на тое, што кожная з абазначаных вышэй катэгорый знаходзіць свайго ўдзячнага спажыўца, не ствараючы асаблівай канкурэнцыі для іншых, агульны глядацкі інтарэс, як паказвае практыка, канцэнтруецца на аўтарскім тэатры. Тэатры, дзе рэжысёр — галоўны ідэалагічны стрыжань, аўтарства якога палягае не толькі ў пошуках яркіх выразных сродкаў, а найперш — у фарміраванні актуальнай творчай ідэі, што, у сваю чаргу, і прыводзіць да стварэння ўласнай сцэнічнай мовы.

Менавіта гэта засведчыў і сёлетні “М.@rt.кантакт”: самымі яркімі, уражальнымі пастаноўкамі аказаліся тыя, дзе рэжысёрскія пошукі вызначаліся найперш магутнай ідэяй, палягаючай у аснове сцэнічнай работы. “Рэвізар” Мікалая Каляды, “Ідыёт. Вяртанне” Рыгора Казлова, “Офіс” Кацярыны Аверкавай, “Мухі на сонцы” Дзмітрыя Залескага і Вольгі Скварцовай-Кавальскай, лабараторнае “Інтэрв’ю” Яўгена Карняга — кожная з гэтых пастановак прыцягнула да сябе ўвагу найперш тым, як, якімі выразнымі сродкамі рэжысёры шукалі актуальны настрой сучаснасці, спрабавалі ўхапіць “нерв”, якім жыве XXI-е ў сваё першае дзесяцігоддзе. Абясцэньванне слова як сродку камунікацыі, жорсткая зададзенасць жанравых умоў існавання (не толькі на сцэне, але і ў нашым будзённым жыцці), спробы знайсці паразуменне з самім сабой праз адчуванне і адкрыццё мовы ўласнага цела… Гэтыя і іншыя выразныя сродкі ў сучасным тэатры выходзяць на першы план і выглядаюць значна больш выйгрышна, у параўнанні з іншымі праявамі тэатра. Найперш таму, што яны яшчэ не паспелі “закасцянець” ва ўласных выяўленчых штампах і ўяўляюць з сябе пульсуючае сцэнічнае жыццё, што далёка не заўсёды разумее само сябе, але ўжо ўсведамляе ўласнае існаванне.

І яшчэ нельга не сказаць аб адной тэндэнцыі, што надзвычай яскрава праявілася пад час сёлетняга “М.@rt.кантакту”: пошукі маладымі героямі свайго “Я” і ўласнага месца ў сучасным жыцці, якія ў мінулыя гады вызначаліся значнай ступенню агрэсіўнага пратэсту, сёлета набылі больш мяккія, гуманістычныя рысы. І ў “Забойцы” маскоўскага “Тэатра.doc”, і ў пастаноўцы “Як стаць знакамітай” рыжскага Тэатра “Абсерваторыя” героі сцвярджаюць сваё месца пад сонцам, не ўступаючы ў апазіцыю да існуючага навокал іх свету. Для іх нашмат больш важна зразумець, якія яны самі і чаму ўспрымаюць жыццё менавіта так, а не інакш.

Думаецца, гэтая тэндэнцыя — зразумець, якія ж мы, сённяшнія, — сталася ў выніку характэрнай рысай усяго “М.@rt.кантакту”. І дадзены этап, да якога прыйшоў маладзёжны форум — асэнсаванне ўласнай існасці і ўнутранай прыроды, — тое важнае, што на шляху да наступнага фестывалю ён не павінен згубіць або “зацерці”, а адно толькі — узмацніць.

Таццяна КОМАНАВА
Фота Яўгеніі АЛІФІРЭНКА і Юліі ЕЎМЯНЬКОВАЙ

Сцэна са спектакля “Ідыёт. Вяртанне”.

Сцэна са спектакля “Тата заўсёды мае рацыю”.

Вынікі форуму

Рэспекты маладзёжнага журы

“За страляючае мастацтва” — акцёрскі ансамбль “Дягам”, спектакль “Пупі-піпа-пупі” (Вільнюс, Літва);
“Лепшы малады акцёр” — Андрыс Буліс, спектакль “Як стаць знакамітай” (Рыга, Латвія);
“Лепшы малады рэжысёр” — Кацярына Аверкава, “Офіс” (Мінск, Беларусь);
“За майстэрства і мастацкую праўду” — “Каляда-тэатр”, спектакль “Рэвізар” (Екацерынбург, Расія);
“Лепшы маладзёжны спектакль” — “Ідыёт. Вяртанне”, Санкт-Пецярбургскі тэатр “Майстэрня” (Расія);
Прыз глядацкіх сімпатый — “Тата заўсёды мае рацыю”, Тэатр “Крэда” (Сафія, Балгарыя).

Прафесійнае журы

Спецыяльны дыплом **“Лепшы маладзёжны спектакль” — “Пупі-піпа-пупі”**, акцёрскі ансамбль “Дягам” (Літва);
Спецыяльны дыплом **“Лепшы пластычны спектакль” — “Мухі на сонцы”**, Тэатр сучаснай харэаграфіі “D.O.Z.SK.I” (Беларусь);
Спецыяльны дыплом **“За акцёрскі дуэт” — Сяргей Друз’як, Кацярына Клепцына** ў спектаклі “Забойца”, “Тэатр.doc” (Масква, Расія);
Спецыяльны дыплом **“За захаванне традыцый рускай псіхалагічнай школы маладымі акцёрамі” — “Ідыёт. Вяртанне”**, Санкт-Пецярбургскі тэатр “Майстэрня” (Расія);
“Падзея форуму” — Вольга Скварцова ў спектаклях “Уцёкі”, Пластычны таэтр “Часкі” (Берлін, Германія), “Офіс”, Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (Мінск, Беларусь) і “Мухі на сонцы”, Тэатр сучаснай харэаграфіі “D.O.Z.SK.I” (Беларусь);
“Лепшы аўтарскі спектакль” — “Тата заўсёды мае рацыю”, Тэатр “Крэда” (Балгарыя);
“Лепшая маладая актрыса” — Марына Карцава ў пастаноўцы “Наташына мара”, Чэлябінскі акадэмічны тэатра імя Н.Арлова (Расія);
“Лепшы малады акцёр” — Алег Ягадзін у спектаклі “Рэвізар”, “Каляда-тэатр” (Расія);
Гран-пры — “Офіс”, Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (Беларусь).

Сцэна са спектакля “Забойца”.

Каханне тое мацуюць трое

Раптам карцінка "ажывае"!

"Сільва", пастаўленая ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры, цалкам пацвердзіла азначэнне гэтай аперэты І.Кальмана як "вечна маладой". Толькі цяпер яно тычылася не адно аўтарскай партытуры, а ўсіх трох складнікаў спектакля: уласна пастаноўкі (уключаючы лібрэта ў аўтарскай версіі рэжысёра Сусанны Цырук), яе ўвасаблення рознымі складамі артыстаў і нават саміх гледачоў.

Асалоду ад музыкі Імрэ Кальмана забяспечыў прызнаны майстар тонкай выразнасці Алег Лясун, які нядаўна стаў галоўным дырыжорам тэатра. Ужо з першых тактаў уверцюры склалася ўражанне, што мы глядзім на свет кампазітарскіх фантазій праз чыстыя, вымытыя вокны пасля доўгай зімы разам з капрамонтам. З мелодый, што, здаецца, ужо набілі аскоміну сваёй хітовасцю, знялі не толькі верхнюю "пабелку", але і яшчэ некалькі слаёў ранейшай "касметыкі", а то і проста бруду, — і яны заззялі яркімі, асветленымі сонцам фарбамі: "вокны" ў пачатак XX стагоддзя ("Сільва" была напісана ў 1914 — 1915 гг.) ператварыліся ў вітражы, але — са зменлівымі колерамі. З усёй паўнатой адчулася музычная драматургія партытуры: замест паўтораў мелодый паўстала дасканалая сістэма лейтматываў, што змянялі свае аблічча адпаведна сцэнічнай сітуацыі. Бы ў казцы: адзін рух чароўнай палачкі — і... А насамрэч — вялікая праца, заснаваная, да ўсяго, на жаданні саміх аркестрантаў рушыць на новую прыступку прафесіяналізму.

Імя пастаноўшчыка — Сусанны Цырук, якая нядаўна стала галоўным рэжысёрам тэатра, — яшчэ да ўбачанай прэм'еры настройвала на штосьці незвычайнае, вельмі стыльнае, надзвычай сучаснае, адпаведнае найноўшым еўрапейскім тэндэнцыям. Тым больш, што, паводле традыцыі, яна працавала разам са сваёй "камандай", вядомай у нас па спектаклі "Аднойчы ў Чыкага". Як вызначыла сваю "Сільву" сама рэжысёр, гэта — "высокі мадэрн", без венгерскага каларыту ў афармленні, але з дынамікай у сцэнічным дзеянні, з ярка акрэсленым "светам куліс", дзе "няма мяжы паміж тэатрам і жыццём".

Але нават пасля такой папярэдняй "артпадрыхтоўкі" ўбачанае найперш здзівіла. Прычым ужо цягам згаданай уверцюры: пасля таямнічага гучання лірычнай тэмы, на фоне далейшай надзвычай каларыстычнай музыкі — трывожная чорна-белая графіка халоднага бляску металічных канструкцый (мастачка Таццяна Каралёва). Ды раптам — "карцінка" ажывае! І халодны метал разагараецца да чырвоных усплёскаў гарачых пачуццяў. Сцэнічныя ж строі, асабліва — так званай "масоўкі", можна разглядаць да бясконцасці, бы надзвычай стыльную конкурсную калекцыю авангарднай моды (Таццяна Каралёва-малодшая).

Парадокс, але пры такой разнастайнасці, калі вочы, у поўным сэнсе слова, разбягаюцца, калі кожны з "масоўкі" мае не толькі свой касцюм, але і свае паводзіны і нават свой лёс (у С.Цырук практычна не бывае звыклага падзелу на цэнтральных і другасных герояў), думка засяроджваецца на галоўным: пра што цяперашні спектакль? Гэтае пытанне ў дачыненні да "Сільвы" заўсёды вырашалася аднолькава: пра сацыяльную няроўнасць і каханне, што яе перамагае. Новая пастаноўка — пра іншае. Пра лёс жанчыны, пастаўленай перад выбарам: тэатр — ці каханне і сям'я. Змяніўся і жанр. Замест "мыльнай" меладрамы з даўно размеркаванымі ролямі-маскамі — ланцужок псіхалагічных дуэлей і люстэркавых адбіткаў: не толькі Сільва + Эдвін і Боні + Стасі, але і Сільва + маці Эдвіна (вось яно, люстэрка часу!), Эдвін + лейтэнант Ронс (люстэрка супрацьлегласцей), Боні + Натарыус (дапаможнік, як правільна і як няправільна будаваць стасункі з гуллівай стайкай прыгажунь), Фэры + Мішэль (апошнія з рамантыкаў, таму — бы блізняты, што разумеюць адно аднаго з паўслова-паўпогляду) і многія іншыя. Нарэшце, гледачы ў зале + на экране: вочы ў вочы. Але ўсе гэтыя філасофскія дадаткі гэтак жа тонка і акрэслены: быццам на аднатоннай, але багатай на адценні карціне, дзе фантазіі гледача могуць не толькі расшыфраваць свядома кінутыя аўтарскія "знакі", але і дамаляваць куды больш, чым задумвалася.

Арыгінальна вырашаны харэаграфічныя нумары (Алена Дзмітрыева-Лаўрыновіч), асабліва — більярд з кіямі і сімвалічнае ўвасабленне "прыгажунь кабарэ" з дапамогай двух чырвоных веераў у руках мужчынскага балета: адзін веер — замест кароткай спаднічкі, другі — замест пер'яў на галаве (і для паказу ветру ўнутры яе). Усё, здаецца, вельмі проста, але так эфектна! Ну, а тое, як танчаць спевакі — увогуле фантастыка! А ўжо спяваюць! І як, дарэчы, іграюць! Тут прыдатнымі будуць усе самыя ўзнёслыя кампліменты — літаральна пра кожнага, хто выступіў на прагоне і двух прэм'ерных паказах: Леся Лют, Дзяніс Нямцоў, Дзяніс Мальцэвіч, Аляксандр Асіпец, Алег Прохараў, Дзяніс Баярэвіч (той самы, з кастынгу "Блакітнай камеі"). Калі Маргарыта Александровіч і Антон Заянчкоўскі "прымадоннілі" ўжо ў ранейшай пастаноўцы "Сільвы", дык у новай, акрамя іх зорнага партнёрства, узніклі і іншыя выканаўцы. Надзвычай упэўненым, раскаваным Эдвінам паўстаў той жа Андрэй Марозаў, лірычна-імпульсіўным — Сяргей Суцько. Непрадказальнай, схільнай да сумневаў ды істэрык Сільвай — Наталля Дзяменцьева. А як расквітнела акцёрскае майстэрства Яўгена Ермакова ў ролі Боні!

Нечаканымі ў дачыненні да сваіх ранейшых партый і абсалютна рознымі аказаліся Наталля Гайда і Лідзія Кузьміцкая (маці Эдвіна, якой, акрамя музыкі І.Кальмана, дадалі яшчэ фрагмент з аперэты "Баль у Савоі" венгерскага кампазітара Пала Абрахама). Першая — увасабленне маці, другая — прымадонны ў ролі княгіні. У адной — настальгія, у другой — "пакута актрысаю быць" і яшчэ большая пакута — ёю не быць. І ў абедзвюх — аднолькавая формула шчасця: каханне, свабода, музыка. Брава!

Формула ж кахання будзе выведзена 11 красавіка. У канцэрце "Барытоны Беларусі спяваюць пра каханне" сыйдуцца салісты Музычнага і Вялікага тэатраў — хто каго?

Фота Сяргея СУЛАЯ і Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА
На здымках: Маргарыта Александровіч; Наталля Гайда і Аляксандр Асіпец.

Версія **ёсць версія**

Да "Еўрабачання", на якім нашу краіну прадставіць 20-гадовая студэнтка Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта Насця Віннікава з песняй "Я люблю Беларусь!", засталося крыху больш за месяц. Мы ўбачым спявачку 12 мая пад нумарам 16 у другім паўфінале. Як жа ідзе падрыхтоўка?

— Зараз мы заканчваем фарміраванне групы бэк-вакалу, — распавёў "К" аўтар музыкі песні і прадзюсар Яўген Алейнік. — У Маладзёжным тэатры эстрады адбыўся кастынг, які сабраў звыш дваццаці прэтэндэнтаў. З іх, згодна з умовамі "Еўрабачання", пакінем пяць, бо адначасова на сцэне могуць знаходзіцца не больш як шэсць чалавек. Так што ў бліжэйшыя дні аб'явім канчатковы склад удзельнікаў нумара: там будуць і хлопцы, і дзяўчаты. Адначасова завяршаецца праца над беларуска- і рускамоўнымі версіямі песні. Плануем, іх можна будзе пачуць ужо на наступным тыдні.

Настрой ва ўсіх — баявы. Вядома, на першым этапе яго крыху сапсавала няўдалае відэа першай версіі песні: яно было змешчана ў Інтэрнеце і атрымала шмат крытычных заўваг. А вось на канчатковую версію твора, з якой Насця і выступіць на "Еўрабачанні", — водгукі станоўчыя. Гэта таксама радуе. Разлічваем, што пройдзем у фінал. А як жа інакш?..

Арбіты Ізмаіла Капланава

Эпоха працягласцю ў эстраду

Пайшоў з жыцця цудоўны музыкант і кампазітар, заслужаны артыст Беларусі Ізмаіл Капланаў. А насамрэч — быццам сышла цэлая эпоха. Працягласцю нават не ў тую ці іншую колькасць часу, а ў гады станаўлення і развіцця беларускай эстрады.

Ён стаяў на досвітку нараджэння нашай нацыянальнай эстрады, шмат у чым фарміраваў яе аблічча. А колькі дзён таму яму стала дрэнна на сцэне. Пад час канцэрта ў Дзяржынску.

Яшчэ ў 1960-я ён стварыў першы на Беларусі ВІА. Назва была больш чым сімвалічнай: "Арбіта-67". І справа не толькі ў тым, што калектыў гастраляваў па ўсім СССР, у замежжы, перамог на Усесаюзным конкурсе эстраднай песні. Акурат гэты гурт вывеў на сольную "арбіту" Віктара Вуячыча, дапамог знасці свае арбіты Уладзіміру Мулявіну, Уладзіславу Місевічу, якія працавалі ў капланаўскім калектыве яшчэ ў "дапесняроўскі" перыяд. Пазней, у 1980-я, Ізмаіл Капланаў удзельнічаў у "выхадзе на арбіту" Тэатра песні Ядвігі Паплаўскай і Аляксандра Ціхановіча. У 2000-я, літаральна да апошняга дня, — падтрымліваў моладзь і пісаў, на здзіўленне, абсалютна маладыя і нават маладзёжныя па духу песні, цудоўныя інструментальныя кампазіцыі. Але і сам увесь час знаходзіўся ў коле дзеяння сваёй "арбіты" — спявачкі, жонкі і самага блізкага сябра Нэлі Багуслаўскай.

...Дык, можа, Ізмаіл Львовіч не сышоў ад нас? Яго проста не бачна. Але толькі фізічна! Бо душу і талент, што ўзраслі ў яго шматлікіх творах, а таксама ва ўсіх, хто з ім сутыкаўся і каму ён дапамагаў, не бачыць немагчыма...

"Культураўцы"

Ансамбль "Арбіта-67". Ізмаіл Капланаў — першы злева.

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе з прычыны смерці вядомага кампазітара, музыканта, спевака КАПЛАНАВА Ізмаіла Львовіча і выказвае спачуванні родным, блізкім нябожчыка ў сувязі з напаткаўшым іх горам.

Добрая памяць аб яскравым, шчодрым таленце Капланава Ізмаіла Львовіча, ягоныя музыка і песні назаўсёды застануцца ў сэрцах яго сяброў, калег, усіх тых, каму блізкая ягоная творчасць.

Цяжка ўявіць дзяржынцам, якія з захапленнем прымалі кожны нумар любімага кампазітара Ізмаіла Львовіча КАПЛАНАВА, што гэта была апошняя сустрэча.

Не выказаць словамі, колькі добрых эмоцый, радасці, жыццялюбства падарыў маэстра ў апошнія хвіліны свайго жыцця! Светлая памяць у сэрцах прыхільнікаў застанецца назаўжды. Шчырыя спачуванні родным і блізкім.

Калектыў Дзяржынскага гарадскога дома культуры — ад імя дзяржынцаў

Новы этап развіцця сяла:
сацыякультурны зрэз

Дзякуючы дзяржаўным праграмам адраджэння і развіцця сяла, развіцця малых і сярэдніх гарадскіх паселішчаў многія рэгіёны краіны значна палепшылі сваю матэрыяльна-тэхнічную базу, у тым ліку і ва ўстановах культуры. Вынік — навідавоку: больш якаснае абслугоўванне гарадскога і сельскага насельніцтва, выкананне плана платных паслуг, павелічэнне колькасці і разнастайнасці мерапрыемстваў...
Палепшылася за мінулую пяцігодку і матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў культуры Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці. Тут было ўведзена шаснаццаць аграгарадкоў, у якіх адрамантаваны ўсе ўстановы культуры. Да таго ж, на паляпшэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы сферы культуры з раённага бюджэту былі накіраваны значныя асігнаванні, што, безумоўна, узняло "планку" культурнага жыцця горада і раёна на новы, больш высокі, узровень.
Але праблема паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы на Мастоўшчыне пакуль яшчэ досыць актуальная. І больш за ўсё — у самім райцэнтры.

Народ пытаецца і прапануе

"Гукаўзмацняльная апаратура — недасканалая"

А напачатку, па традыцыі, — вынікі невялікага апытання жыхароў Мастоўшчыны.

Марыя Іванаўна, пенсіянерка, г. Масты:
— Напэўна, самая набалелая гарадская праблема — неабходнасць рамонту Цэнтральнай раённай бібліятэкі. Мне там вельмі падабаецца: шмат кніг, часопісаў і газет — як кажуць, на любы густ. А вось плямы ад вады на сценах установу, зразумела, не ўпрыгожваюць…

Андрэй, студэнт-завочнік, г. Масты:
— У раённы Дом культуры заўсёды хаджу на дыскатэкі. Падабаецца. Але ў вялікай глядзельнай зале і сцэна, і крэслы, і агульны выгляд — як падаецца, яшчэ з савецкага часу. Ды і гукаўзмацняльная апаратура — вельмі недасканалая. А так хацелася б, каб наш РДК быў не горшы за падобныя ўстановы суседніх раёнаў...

Ірына Базыльчык, выхавальніца дзіцячага садка, аграгарадок "Пацэвічы":
— Шмат літаратуры ў нашай бібліятэцы, а нядаўна ўстанавілі тут камп'ютар. Дрэнна толькі адно: няма пакуль што да гэтага ПК прынтара. А без яго, пагадзіцеся, вельмі нязручна. Ці з'явіцца ў нас гэтая патрэбная тэхніка?

Другі ў вобласці, але...

Па выніках 2010 года Мастоўскі раённы дом культуры заняў ганаровае II месца ў абласным конкурсе "Установа культуры года". І, па словах дырэктара РДК Сяргея Фядотава, адбылося тое цалкам не выпадкова.

— Шмат працавалі над удасканаленнем разнастайных формаў платных паслуг, — распавёў кіраўнік установы. — Увялі новыя віды, і, як вынік, зарабілі больш за сто мільёнаў рублёў. Сума для нашага 16-тысячнага горада досыць вялікая...

Пры ўстанове працуе дзесяць калектываў са званнем "народны" — выдатны паказчык якасці працы мясцовых работнікаў. Ладзяцца шматлікія раённыя мерапрыемствы, летась адбыўся ўжо сёмы па ліку абласны Фестываль дзіцячай эстраднай творчасці "Масты надзей", а сёлета пройдзе міжраённы Фестываль дзіцячай творчасці "Слаўлю Ліпічанскую пушчу". Цікавы нюанс: работнікі Мастоўскага РДК цяпер распрацоўваюць сайт аддзела культуры. Інтэрнэт-рэсурс ужо даступны па адрасе www.mosty.by і распавядае пра ўсе культурныя цікавосткі раёна і тыя мерапрыемствы, што адбыліся на Мастоўшчыне цягам апошніх трох месяцаў. Тут жа можна даведацца пра "біяграфіі" і творчыя здабыткі ўсіх народных і ўзорных калектываў раёна.

Словам, працуюць у РДК таленавітыя і творчыя людзі. Але далейшаму паспяховаму развіццю ўстановы культуры замінае шэраг аб'ектыўных прычын. Адна з іх — неабходнасць рамонтных работ.

— Год "нараджэння" нашай установы — 1993-і, і таму даўно наспела патрэба ў рамонце РДК, — распавёў дырэктар Сяргей Фядотаў. — Зрухі ў гэтым плане ёсць. У 2006-м была распачата рэканструкцыя будынка: зроблены дах, фасад, фае, шэраг кабінетаў на першым паверсе і частка — на другім. Але з-за недахопу фінансавання работы ў 2009 годзе спыніліся. Таму мы не паспелі зрабіць рамонт у вялікай (на 436 месцаў) і малой (на 96 месцаў) глядзельных залах, у шэрагу памяшканняў РДК. І ці будуць грошы на працяг рэканструкцыі сёлета — пытанне з досыць няпэўным адказам...

Па словах кіраўніка ўстановы, наяўная гукаўзмацняльная, светлавая, камп'ютарная тэхніка, што ёсць у РДК, таксама патрабуе абнаўлення. Ды і студыя гуказапісу, якой вельмі ганарацца супрацоўнікі, карыстаецца, тым не менш, у сваёй працы даволі састарэлым абсталяваннем.

І яшчэ. У будынку Дома культуры "прапісаліся" таксама Раённы метадычны цэнтр народнай творчасці і Дзіцячая школа мастацтваў. Месца для ўсіх — замала, і таму галоўная і даўняя мара дырэктара Мастоўскай ДШМ Ганны Плішань — пераезд у новы, больш утульны, асобны будынак. Да таго ж, у тых памяшканнях, якія займае школа, таксама патрэбны рамонт. Па словах Ганны Плішань, некаторыя кабінеты паступова даводзяцца да ладу рабочымі гаспадарчай групы аддзела культуры, але не так хутка, як хацелася б. Нарматывы гукаізаляцыі ў памяшканнях школы не вытрымліваюцца, існуе і актуальная праблема абнаўлення музычных інструментаў...

Бібліятэка ў чаканні рамонту

Калі ў Мастоўскім раённым доме культуры мараць пра завяршэнне рэканструкцыі, дык у Цэнтральнай раённай бібліятэцы толькі яшчэ чакаюць пачатку рамонтных работ. Бо вонкавы выгляд фасада гэтай ўстановы культуры наведвальніка не надта ўражвае: на ім бачныя шматлікія падцёкі і плямы ад вады...

— Наша бібліятэка была пабудавана ў 1984-м, але пакуль што ні разу не рамантавалася, — патлумачыла дырэктар Мастоўскай ЦБС Таццяна Валчкевіч. — Мы ўжо цягам некалькіх гадоў стаім у плане на цякучы рамонт, але пакуль што грошы пад гэтыя мэты нам не выдаткоўваліся. Дзенідзе цячэ дах, патрэбны рамонт фасада, замена вокнаў і шмат чаго яшчэ...

Хапае тут і іншых праблем. Наяўная камп'ютарная база раённай бібліятэкі — 12 ПК — састарэлая, для наладжанай працы не стае мультымедыйнага абсталявання, брашуравальнага апарата, ламінатара... Але мясцовыя бібліятэкары не сядзяць склаўшы рукі, а зарабляюць самі: леташні план платных паслуг быў перавыкананы і склаў звыш 30 мільёнаў рублёў. Уводзяцца і новыя віды паслуг, сярод якіх найбольш запатрабаваныя — пракат відэадыскаў, ксеракапіраванне, карыстанне Інтэрнэтам... Яшчэ пяць гадоў таму ў Мастоўскай ЦРБ абслугоўванне чытачоў было пераведзена ў аўтаматычны рэжым, што значна палегчыла працу бібліятэкараў і прыйшлося даспадобы чытачам...

Таму цалкам заканамерна і заслужана Мастоўская ЦРБ неаднойчы адзначалася ў ліку лепшых бібліятэк Гродзеншчыны. Але патрэба рамонтных работ ва ўстанове — надзённая і актуальная. А без яе вырашэння казаць пра далейшае паспяховае развіццё раённай бібліятэкі не выпадае.

Недабудаваны аграгарадоцкі

Свае праблемы маюць і ўстановы культуры Мастоўскага раёна. У адным з леташніх аграгарадкоў — "Пацэвічы" — на рамонт даху і фасада мясцовага СДК пайшло прыкладна 95 мільёнаў рублёў. Таму звонку ўстанова выглядае досыць прывабна.

А вось унутры карціна крыху іншая, бо рамонт памяшканняў у Пацэвіцкім СДК летась не праводзіўся. Толькі сёлета сіламі гаспадарчай групы аддзела культуры распачаўся рамонт у памяшканні, дзе моладзь аграгарадка збіраецца на дыскатэкі. А вось да вялікай глядзельнай залы — прыкладна на 200 месцаў — і вялікага пакоя для заняткаў гурткоў ды аматарскіх аб'яднанняў рукі, як кажуць, пакуль што не дайшлі...

Сумясціць несумяшчальнае:

Райвыканкамаўская "лятучка" з "К"

Цэнтральная раённая бібліятэка.

Праблема яшчэ і ў тым, што танцавальныя вечары ў Пацэвіцкім СДК наведвае не так ужо і шмат людзей. Па словах дырэктара ўстановы Лідзіі Садоўскай, у мінулую суботу на дыскатэку прыйшло чалавек 10 — 12. Прычына — і ў рамонце танцавальнай залы, і ў тым, што гукаўзмацняльная апаратура, якая ёсць у СДК, — старая, няма найноўшай светлавой тэхнікі, іншых прылад... Усё гэта, натуральна, не спрыяе наведванню...

Сярод іншага — патрэба ў новай мэблі, у новых камплектах касцюмаў для тых калектываў, што працуюць на базе Пацэвіцкага СДК. Дарэчы, падобныя праблемы — недахоп новых касцюмаў, патрэба ў абнаўленні гукаўзмацняльнай апаратуры, у набыцці ноўтбука — існуюць і ў супрацоўнікаў Цэнтральнага Дома культуры аграгарадка "Струбніца", куды таксама завітаў цягам камандзіроўкі.

Усе праблемныя пытанні сацыякультурнага развіцця раёна былі абмеркаваны на райвыканкамаўскай "лятучцы", ініцыяванай "К". У ёй прынялі ўдзел намеснік старшыні Мастоўскага райвыканкама па пытаннях развіцця сацыяльнай сферы Таіса МУРЫНА і начальнік аддзела культуры Уладзімір СВІСТУНОЎ.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:
— Таіса Мікалаеўна, за час камандзіроўкі наведаў шэраг устаноў культуры горада і раёна. Можна сказаць, што адна з найбольш вострых праблем — гэта нездавальняючая матэрыяльна-тэхнічная база...

Таіса МУРЫНА:
— У параўнанні з недалёкімі ад нас Лідскім, Ваўкавыскім, Карэліцкім раёнамі ў нас, натуральна, матэрыяльна-тэхнічная база слабейшая. Але мы робім усё магчымае для яе паляпшэння. За апошнюю пяцігодку на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры раёна з райбюджэту было выдаткавана тры з па-

Дэталь да агульнай карціны

Развіццё на трансгранічча

Пра Гудзевіцкі дзяржаўны літаратурна-краязнаўчы музей, створаны настаўнікам Алесем Белакозам, "К" пісала неаднойчы. Чарговая нагода згадаць гэты знакавы аб'ект культуры Мастоўшчыны даволі значная: сёлета ўстанова атрымае грант у суме роўнай прыкладна 200 тысячам еўра.

Адна з залаў Гудзевіцкага музея.

Грошы гэтыя, па словах выконваючай абавязкі дырэктара Гудзевіцкага дзяржаўнага літаратурна-краязнаўчага музея Кацярыны Басінскай, атрыманы ў рамках Міжнароднай праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва "Польшча — Беларусь — Украіна".

Плануецца, што сродкі будуць накіраваны на рамонт музейных памяшканняў, сістэмы ацяплення, на падвядзенне сістэмы каналізацыі і ўсталяванне санвузлоў, добраўпарадкаванне музейнай тэрыторыі. Як вядома, у фондах музея — больш за трынаццаць тысяч экспанатаў, а чатырнаццаць экспазіцыйных залаў, такія, як "Пісьменнікі Гродзеншчыны", "Беларусь літаратурная", "Гудзевіцкія народныя касцюмы", "Народная медыцына" і іншыя, зацікавяць любога наведвальніка. У ліку арыгінальных прадметаў — глобус з пазнакамі на беларускай мове, старадаўнія аўтэнтычныя строі, аўтографы шматлікіх айчынных пісьменнікаў.

На думку Кацярыны Басінскай, змены ў музеі паспрыяюць таму, што ў Гудзевічы будуць яшчэ часцей прыязджаць айчынныя і замежныя турысты.

праблемы па адрасе mosty.by

Якая “планка” матэрыяльна-тэхнічнай базы ў бюджэце Мастоўшчыны?

ловай мільярды рублёў. Гэта неблагія грошы. І заўсёды тыя сродкі накіроўваюцца на найбольш праблемныя аб’екты.

Уладзімір СВІСТУНОЎ:

— Летась рамонтныя работы вяліся на 13 установах культуры. Мы здалі ўсе аб’екты ў аграгарадках. А іх у раёне нямала: 16.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Але, напрыклад, у аграгарадку 2010 года “Пацэвічы” адрамантаваны толькі дах і фасад — унутраныя памяшканні яшчэ да ладу не даведзены. Патрабуе абнаўлення апаратура, мэбля, касцюмы, як і ў яшчэ адным СДК — аграгарадка “Струбніца”…

Уладзімір СВІСТУНОЎ:

— У хуткім часе гаспадарчая група аддзела культуры адрамантуе танцавальную залу гэтага клуба. З цягам часу распачнём работы і ў глядзельнай.

Таіса МУРЫНА:

— Магчыма, на клуб у аграгарадку “Пацэвічы” мы яшчэ атрымаем дадатковыя сумы па Рэспубліканскай інавацыйнай праграме і на гэтыя грошы давядзём да ладу ўнутраныя памяшканні ўстановы. Што да нястачы якаснай апаратуры, патрэбы ў новых камплектах касцюмаў, дык гэта сапраўды актуальнае пытанне для калектываў многіх нашых СК і СДК. Нават знакамітаму народнаму ансамблю народнай песні “Ярыца”, што працуе на базе РДК, таксама неабходны новыя касцюмы. Паступова будзем вырашаць і гэтую праблему.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— У Пацэвіцкай сельскай бібліятэцы не працуе Інтэрнэт, няма вельмі патрэбнага ім прынтара…

Уладзімір СВІСТУНОЎ:

— Днямі падключым гэтую бібліятэку да Інтэрнэта, а цягам года набудзем і тэхніку.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— На жаль, не дзейнічае ў раёне і запатрабаваны насельніцтвам аўтаклуб…

Таіса МУРЫНА:

— Я ўпэўнена, што сельскае насельніцтва раёна не знаходзіцца па-за ўвагай культработнікаў. Усе нашы ўстановы культуры запатрабаваны, як, дарэчы, і аўтабібліятэка, што дзейнічае на Мастоўшчыне ўжо працяглы час. А замест аўтаклуба маем “агітцягнік”, што выязджае раз на квартал у аддаленыя і маланаселеныя вёскі. У гэтым аўтобусе ёсць месца не толькі для культработнікаў, але і для супрацоўнікаў медыцыны, сацыяльных службаў, міліцыі. Наш “агітцягнік” вельмі чакаюць жыхары многіх населеных пунктаў.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Шмат праблем і ў гарадскіх установах культуры: РДК, Цэнтральнай раённай бібліятэцы…

Таіса МУРЫНА:

— Першасная наша задача на гэты год — рамонт даху ЦРБ. Гэта зробім сёлета абавязкова.

Уладзімір СВІСТУНОЎ:

— Па маіх папярэдніх падліках, на рамонт ЦРБ спатрэбіцца прыкладна 200 мільёнаў рублёў. А што да РДК, дык мы паступова рамантуем установу сваімі сіламі. Ужо некалькі гадоў таму абнавілі дах, фасад, некаторыя памяшканні. Летась, да прыкладу, гаспадарчая група аддзела культуры адрамантавала там яшчэ тры кабінеты. замяніла электраабсталяванне. За пазабюджэтныя сродкі закупілі для РДК сістэму відэаназірання коштам у дзесяць з паловай мільёнаў рублёў.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Але не зроблены рамонт у вялікай і малой глядзельных залах РДК…

Таіса МУРЫНА:

— Спачатку давядзём да ладу дах раённай бібліятэкі. Ды і не можам мы адразу вырашыць усе праблемы ў сферы культуры, бо патрабуе ўвагі яшчэ і медыцына, і адукацыя… Але культура, безумоўна, — прыярытэтная сфера, і старшыня Мастоўскага райвыканкама Аляксей Шафарэвіч заўсёды нас падтрымлівае.

Уладзімір СВІСТУНОЎ:

— Напрыклад, летась са сродкаў райбюджэту дадаткова было выдзелена 50 мільёнаў рублёў — на закупку літаратуры для ЦБС, — а яшчэ 10 мільёнаў атрымалі на набыццё музычнай апаратуры. Да таго ж, паляпшаем матэрыяльна-тэхнічную базу і з дапамогай нашых спонсараў: летась такім чынам закупілі акустычную сістэму для Дубненскага СДК на суму 11 з паловай мільёнаў рублёў, а ў Дубненскай сельскай бібліятэцы ўстанавілі камп’ютар.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Якія перспектывы ў развіцці сацыякультурнай сферы раёна?

Таіса МУРЫНА:

— На бліжэйшы час нам трэба стварыць у горадзе Маладзёжны цэнтр. Хутчэй за ўсё, ён паўстане на базе нашага кінатэатра, які цяпер рамантуецца. Распрацоўваем Палажэнне аб гэтым Маладзёжным цэнтры, улічваючы досвед суседніх раёнаў, дзе працуюць падобныя ўстановы.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ:

— Але ж кінатэатр у будынку таксама працягне функцыянаваць? Усё ж без яго таксама аніяк…

Уладзімір СВІСТУНОЎ:

— Так, безумоўна. А ў Маладзёжным цэнтры будуць ладзіцца дыскатэкі, магчыма, з’явяцца новыя формы культурнага адпачынку — більярд, боўлінг, — будзе функцыянаваць невялікае сямейнае кафэ. Нам трэба выходзіць на больш якасны ўзровень работы з моладдзю, як і з пакаленнем 30-ці — 40-гадовых, бо, на жаль, на маю думку, менавіта гэтым людзям цяпер надаецца мала ўвагі.

Уладзімір СВІСТУНОЎ:

— Працуем і з гэтай катэгорыяй насельніцтва. Добрай завядзёнкай для нашага раёна сталася правядзенне занальных тураў спаборніцтваў шматдзетных сем’яў: сёлета конкурсы адбыліся на базе Луненскага і Мікелеўшчынскага СДК. Ды і ва ўсіх установах культуры прайшлі мерапрыемствы па святкаванні Дня сям’і.

Таіса МУРЫНА:

— Усё гэта так, але трэба, каб было больш аматарскіх аб’яднанняў для людзей сярэдняга веку. А, акрамя пільнай увагі да абнаўлення і паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў культуры, работнікам аддзела культуры варта зрабіць акцэнт на пошуку новых формаў працы з насельніцтвам, каб прыцягваць больш людзей на дыскатэкі, рабіць раённыя мерапрыемствы яшчэ больш цікавымі і разнастайнымі.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Мастоўскі раён — Мінск
Фота аўтара

Намеснік старшыні Мастоўскага райвыканкама па пытаннях развіцця сацыяльнай сферы Таіса Мурына і начальнік аддзела культуры Уладзімір Свістуноў.

На людным месцы

З рэспубліканскага семінара

Ці баяцца фандрэйзінгу?

29 сакавіка ў Інстытуце культуры Беларусі прайшоў рэспубліканскі семінар “Шляхі мадэрнізацыі і рэфармавання ўстаноў культуры. Дзейнасць варыятыўных інтэграваных устаноў культуры”, падрыхтаваны аддзелам міжнароднай і сацыякультурнай дзейнасці ўстановы.

У семінары бралі ўдзел намеснікі дырэктараў і спецыялісты абласных метадцэнтраў, кіраўнікі і метадысты РАМЦ, цэнтраў культуры, дырэктары СДК, загадчыкі сельскіх клубаў, новых спецыялізаваных устаноў культуры.

“Калі не вы, дык хто?” — пыталася ў прысутных выкладчык Інстытута культуры Беларусі і маркетолаг Святлана Папсуй. Менавіта маркетынгавыя падыходы ў свой час былі выкарыстаны для рэкламнага прасоўвання расійскага гарадка Епіфань. Тут у свой час быў рэалізаваны культурны праект “Сфатаграфуем любімы куток роднага горада”. Ахвотных сярод гараджан было мора. На выніковую выстаўку прыйшло ўсё насельніцтва Епіфані. Дванаццаць лепшых фотаздымкаў сталі асновай для календара, які быў увобмірг раскуплены. Капеечны па ўкладаннях праект даў велізарны грашовы прыбытак. А галоўнае ў тым, што сайт Епіфані аздоблены здымкамі яе жыхароў, ён — інтэрактыўны, шматгранны і ёмісты. Ці многія нашы аддзелы культуры могуць пахваліцца гэтым жа?

Так, у выніку аптымізацыі асобныя ўстановы культуры не зніклі, а займелі вузкую спецыялізацыю, пераўтварыўшыся ў дамы фальклору, клубы сацыяльна-культурных паслуг, цэнтры адпачынку і народнай творчасці. Так, новыя шыльды забяспечылі захаванне рабочых месцаў, але гарантам яркай брэндавасці і непаўторнасці ў маштабах рэспублікі стаць пакуль, на маю думку, не здолелі. Метадыст Калінкавіцкага РАМЦ Ірына Стома згадала, што ў адным з цэнтраў сацыяльных паслуг дзейнічае аматарскае аб’яднанне, якое займаецца адраджэннем народнай медыцыны, знахарства, траўніцтва. Але хто за межамі раёна пра тое ведае? Мала прыдумаць — трэба яшчэ ўмець прыдуманае “распіярыць”, каб крэатыў прыносіў як маральны, так і матэрыяльны плён. На думку дацэнта кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ Янкі Крука, наша сакральная геаграфія (крыніцы, дрэвы, капішчы…), народная медыцына пакуль не “працуюць” на брэндавасць аддзелаў культуры.

Пад час камандзіровак старшыні райвыканкамаў неаднойчы прызнаваліся мне: “Я пад рэалізацыю добрай ідэі грошы адшукаю заўжды. Але нашы культработнікі штосьці не спяшаюцца тыя ідэі нараджаць!” Слушна: нестандартных мерапрыемстваў па нашых аддзелах культуры пакуль мала. У межах сельсавета — нібыта эксклюзіў, у маштабах Беларусі — падзея выключна шараговая. І гаворка тут — не пра тое, каб літаральна кожная вёска мела культурны брэнд. Але хаця б адна самабытная адметнасць усё ж павінна вылучаць раён?

Старшы выкладчык кафедры менеджменту БДУКіМ Наталля Краўцова, што не першы год займаецца сацыякультурным праектаваннем дзейнасці ўстаноў культуры, упэўнена, што прычына тут — не ў адсутнасці грошай, а ў тым, што на наезджанай каляіне менш трасе, а рух да новага — гэта заўжды збочванне на калдобіны.

Наталля Краўцова казала пра самае надзённае: пра тэхналогіі праектавання. Што такое культурны праект? Гэта выхад на новы ўзровень развіцця, удасканаленне, вырашэнне канкрэтнай праблемы за кошт рэалізацыі крэатыўнай ідэі. Было прапанавана некалькі выйгрышных тэхналогій: удзел “зоркі”, інтэрпрэтацыя старога, незвычайная назва праекта, абмежаванне ў часе (наладжванне, скажам, конкурсу пляжных пясочных недаўгавечных скульптур), новая прастора (правядзенне, напрыклад, канцэрта не ў клубе, а ля старажытнага палаца)… Дык вось фандрэйзінг — пошук не столькі грошай, колькі рэсурсаў, якія дапамогуць рэалізаваць праект. Прагучала выключна важная думка пра тое, што ў наладжванні стасункаў з кіраўнікамі прадпрыемстваў работнікі культуры не павінны выглядаць жабракамі-папрашайкамі, бо яны — носьбіты невымернага духоўнага багацця. І грашовыя інвестыцыі ў яго развіццё — найпершая праява сацыяльна адказнага бізнесу. Карацей, спонсару не варта даваць “траву” — трэба забяспечыць яго “газонам”, на якім ён сам тую “траву” будзе вырошчваць.

Загадчык аўтаклуба аддзела культуры Ваўкавыскага райвыканкама Віктар Паўловіч здолеў пераканаць прысутных, што ён пастаянна рэалізоўвае праекты з мінімальным укладаннем грошай і з выкарыстаннем шэрагу тэхналогій. Першы праект мае “шокавую” назву “Усёй вёскай — у войска!” і прысвечаны ўрачыстым провадам прызыўніка на службу ўсёй сельскай талакой (інтэрпрэтацыя старога). Другі ж праект — “Вярнуўся я на радзіму” — рэалізоўваецца пад час вяртання вайскоўца са службы. І не было выпадку, кажа Віктар Паўловіч, каб кіраўніцтва адмовіла ў матэрыяльнай падтрымцы праектаў.

Словам, любая праграма развіцця раённай культуры павінна складацца не з фармальных пунктаў, а з канкрэтных пракструктурыраваных праграм. Толькі тады змена шыльды ўстановы будзе гарантаваць выхад на новы творчы ўзровень.

Яўген РАГІН

Конкурс: мадэлі для бяспекі

Вачыма дзяцей

Па-рознаму ўяўляюць агняборцаў і праблему прафілактыкі пажараў юныя грамадзяне краіны — удзельнікі штогадовага сталічнага агляду-конкурсу “Выратавальнікі вачыма дзяцей”.

На конкурс было прадстаўлена было больш за 350 работ. Лепшыя з іх леглі ў аснову выстаўкі, што ладзілася 14 — 24 сакавіка ў Мінскім дзяржаўным палацы дзяцей і моладзі.

Юныя літаратары, мастакі, канструктары-вынаходнікі, майстры-лялечнікі здзіўляюць нечаканымі ідэямі. Усе яны — вучні школ, члены пярвічак Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі выратавальнікаў-пажарных Мінска і клубаў юных выратавальнікаў. Кожная каманда прадстаўляла свой гарадскі раён. Юнакі і дзяўчаты спаборнічалі ў дзевяці намінацыях: “Малюнак”, “Плакат”, “Мадэль пажарнай тэхнікі”, “Ручны выраб”, “Мяккая цацка”, “Сачыненне”, “Апавяданне”, “Фатаграфія”.

І месца заняла каманда Савецкага раёна сталіцы, II і III — Фрунзенскага і Заводскага.

Таццяна БЫЧАНОК,
спецыяліст групы прапаганды і навучання Савецкага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях г. Мінска.
На здымках: выстаўка сабрала работы юных творцаў і вынаходнікаў.
Фота Юрыя КАХОВІЧА

Які попыт на трансфер па Карце Памяці?

Уводзім у інтэрнэт-пошукавік слова “Хатынь”...

Прайшло 68 гадоў з таго дня, калі беларуская вёска Хатынь была спалена разам з жыхарамі. У нашы дні ў Дзяржаўным мемарыяльным комплексе “Хатынь” не парастае травой сцяжынка, якая вядзе шляхам Памяці аб дні жахлівых падзей. Пакланіцца ахвярам Вялікай Айчыннай вайны і зноў знайсці месца “Хатыні” на Карце Памяці сучасніка паспрабавалі карэспандэнты “К”.

Упэўнены, большасць з нас добра памятае са школьных гадоў экскурсіі ў мемарыял. Але і сёння, у час самых разнастайных турыстычных прапаноў, комплекс застаецца знакавым аб’ектам для нас, беларусаў, і гасцей краіны. Іншая справа — у якім стане сёння славуты аб’ект, наколькі ён даступны для наведвання, скажам, з транспартнага ды інфраструктурнага пункта гледжання, якая, урэшце, яго ўключанасць у маршруты тураператараў? На пачатку працы над артыкулам, прызнаемся, вырашылі наведаць Хатынь у Дзень Памяці ахвяр трагедыі вёскі якраз пры дапамозе аднаго з апошніх. Якраз адсюль і вынікае завязка артыкула...

Ці павярхоўная заўвага?

Уводзім у інтэрнэт-пошукавік слова “Хатынь” і глядзім прапановы. Сеціва выдае нам самыя розныя варыянты аднадзённых падарожжаў: “Хатынь — Курган Славы — Раўбічы”, “Мінск — Хатынь — Мір — Нясвіж”, “Дудуткі — Мінск — Хатынь — Курган Славы — Мір — Нясвіж”...

Пытаемся ў тураператараў наконт мэтанакіраванай паездкі па маршруце “Хатынь — Курган Славы”. Так, чуем у адказ, прапанова падобная — ёсць, а вось попыт на яе — невысокі. Звязана гэта і са з’яўленнем новых турыстычных аб’ектаў: людзі хочуць пабачыць новыя мясціны. Ды і, маўляў, патэнцыйныя кліенты не дужа актыўна цікавяцца варыянтамі паездак да тых мясцін, наведанне якіх вымагае душэўнай працы.

— Попыт людзей скіраваўся да інтэрактыўных музеяў, комплексаў, устаноў, — апісвае перавагі сучаснага турыста адзін з аператараў фірмы, — дзе, з аднаго боку, можна дазнацца штосьці, а з іншага — адпачыць...

Але, што да прапановы, мы пераканаліся: прапанаваныя на айчынным рынку размаітыя туры ўтрымліваюць у сабе “спектр эмоцый”: ад лёгкіх (наведанне тых жа Дудутак) да такіх, якія патрабуюць магутных душэўных высілкаў (Хатынь).

— Нельга сказаць, што людзі сёння — іншыя, — каменціруе сітуацыю са свайго боку старшы навуковы супрацоўнік Мемарыяльнага комплексу “Хатынь” Ірына Напрэева. — Амаль усе, хто прыязджае да нас, сыходзяць узрушаныя: і дзеці, і дарослыя. Зусім нядаўна я праводзіла экскурсію для госця з Турцыі, маладога мужчыны, і ён — плакаў, хоць, здаецца, гісторыя нашага народа яму зусім не блізкая. Але асаблівасць Хатыні ў тым, што яе трагедыя кранае ўсіх, яна сімвалічна ўбірае ў сябе боль усіх забітых і закатаваных пад час вайны. Яна — адзін з найгалоўных помнікаў міру ў свеце…

Пазіцыя дырэктара ўстановы ў дачыненні да патрэб сучаснага турыста больш катэгарычная.

— Тое, што тураператары кажуць пра прагу сучасніка да забаў, мне здаецца павярхоўнай заўвагай. Замест таго, каб патэлефанаваць нам і прапанаваць супрацоўніцтва, яны выбіраюць уласны досвед. У выніку часам і экскурсіі, зладжаныя тураператарамі, скажам так, не адпавядаюць патрабаванням, і людзі з’язджаюць расчараванымі. З іншага боку, — падкрэсліў Артур Зельскі, — Хатынь — гэта, даруйце за параўнанне, зусім не Дыснейлэнд. Сюды трэба прыязджаць і маліцца ў цішыні, а не праходзіць па плошчы з пустымі вачыма…

Тым не менш, неабходнасць аднаўляць сцяжынку людской памяці пацвердзілі ўсе супрацоўнікі дзяржаўнай установы, з кім давялося пагутарыць.

— Ніхто не кажа пра тое, што праца ў гэтым кірунку не павінна актыўна весціся, — удакладняе дырэктар Мемарыяльнага комплексу. — У перспектыве мы плануем увесці ў аглядавую экскурсію новы аб’ект — старыя хатынскія могілкі. Што да змен у фотадакументальнай экспазіцыі, дык толькі летась завяршылі рэканструкцыю трэцяй залы, таму для нас сёння мэтазгодна больш сканцэнтравацца на экспазіцыйна-выставачнай працы…

Распавёў дырэктар і пра навуковую дзейнасць. Дзякуючы пошукавай працы з архіўнымі дакументамі ўдалося высветліць узрост Хатыні, прасачыць за храналогіяй яе існавання цягам некалькіх стагоддзяў. Таксама распачаліся маштабныя распрацоўкі па стварэнні электроннай базы даных спаленых беларускіх вёсак. Да таго ж, як “К” пісала ўжо, усё большы розгалас набывае і міжнародны праект, скіраваны на павышэнне статуса жыхароў спаленых беларускіх вёсак, якія выратаваліся. Па словах колішняга дырэктара комплексу, каардынатара праекта Наталлі Кірылавай, у выніку прадугледжваецца стварэнне своеасаблівага архіва сведчанняў і ўспамінаў жыхароў спаленых вёсак на сайце Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

Памкненняў і напрацовак, як бачым, шмат, але ці дастаткова толькі навуковых высілкаў, каб сучасны наведвальнік пакінуў Хатынь у сваёй памяці як адзін з самых значных аб’ектаў гісторыі Радзімы?

Візуалізацыя як актуалізацыя

Як зазначыла старшы навуковы супрацоўнік Мемарыяльнага комплексу Ганна Папко, ёсць у працы з турыстамі, у першую чаргу — замежнымі, і пэўныя асаблівасці.

— Да нас неяк прыязджала група наведвальнікаў з Нарвегіі, — распавядае спецыяліст, — і мы паспрабавалі адразу павесці іх на адкрытую прастору, але гід спыніла: “Абавязкова спачатку пакажыце ім фотадакументальную экспазіцыю. Госці лягчэй успрымуць сам комплекс”.

Гэты прыклад уздзеяння фотаздымкаў на нарвежскіх турыстаў пацвердзіў і наша меркаванне, што з’явілася пад час наведання ўстановы, — у патрэбе большай візуалізацыі гістарычных матэрыялаў. Выкарыстанне сучасных тэхналогій значна садзейнічала б, думаецца, знаёмству наведвальніка з трагічнай гісторыяй месца. Гаворка ідзе, у першую чаргу, пра аўдыягіды, у якіх, нягледзячы на ўжо наяўныя магчымасці мемарыяла (комплекс сёння прапаноўвае экскурсіі на беларускай, рускай і англійскай мовах), можа мець запатрабаванасць госць з замежжа. Не пабаімся памыліцца, сказаўшы: гэтая паслуга асабліва карысталася б попытам у наведвальнікаў-індывідуалаў.

Другая прапанова, якая адначасова “сарвалася з вуснаў” журналістаў “К”, — выкарыстанне вялікага плазменнага экрана. Скажам, ён мог быць размешчаны ў месцы, якое, з аднаго боку, з’яўлялася б часткай арэала ўстановы, з іншага — не ўступала б у відавочны канфлікт з галоўным ансамблем комплексу.

Цікава, што падобны элемент быў прадугледжаны ў праекце помніка.

— Глядзельная зала з кінаэкранам планавалася за Сцяной Смутку, — распавёў адзін са стваральнікаў мемарыяла, архітэктар Юрый Градаў. — Яна мусіла быць размешчана ўнутры ўзгорка. Аднак гэтую ідэю так і не ўдалося ажыццявіць…

Сёння ў фотадакументальнай экспазіцыі “Хатыні” працуе зала, дзе ў пералік магчымасцей уваходзіць і прагляд відэафільмаў, аднак, як засведчылі самі супрацоўнікі, яе памеры пакідаюць жадаць лепшага. А значыць, цясніцца ў невялічкім пакойчыку наўрад ці захочуць патэнцыйныя гледачы ваенных хронік.

Што да апошніх, то, нам падалося, не толькі гэты матэрыял, які і так не патрабуе дадатковых слоў, здолеў бы зацікавіць будучых наведвальнікаў. Дакументальны фармат кінапаказу на плазме, які злучыць і войны XX стагоддзя, і ваенныя канфлікты XXI-га, мог бы аказаць на гледача дадатковае ўздзеянне. Хатынь — гэта тое месца, што скіроўвае чалавечую душу праз боль і ачышчэнне да міласэрнасці і міру. Яно і сёння — яшчэ адна актуалізацыя каштоўнасцей гуманізму.

Слова архітэктара

Роздум над візуальным і сэнсавым “узбагачэннем” комплексу прывёў нас да іншых цікавых знаходак у гэтым рэчышчы. Юрый Градаў апавёў нам цікавыя прапановы стваральнікаў славутага помніка, якія з розных абставін так і не атрымалі свайго ўвасаблення. Адна з іх — запальваць на Дзень Памяці ахвяр Хатыні курыльную чашу: дым ад яе быў бы бачны здалёк і прыцягваў увагу людзей у гэты асаблівы для помніка час. Другая — “закрыццё” новымі пасадкамі пад’езда да мемарыяла. Пад’язджаючы на машыне, наведвальнікі адразу бачаць панараму комплексу, а гэта, на думку, архітэктара, не зусім правільна. Невялічкая паласа дрэўцаў здолела б зрабіць мемарыял больш камерным, закрыўшы яго на першым этапе знаёмства ад гасцей. Але, прамінуўшы прыродную заслону, наведвальнік атрымаў бы большае ўражанне ад сустрэчы з комплексам, паступова прачытваючы ўсе яго сімвалы.

Неаднаразова ўзнімалася пытанне, прызнаўся Юрый Градаў, і пра пабудову капліцы на тэрыторыі “Хатыні”.

— На маю думку, Плошча Памяці, дзе шапацяць тры бярозкі, а на месцы чацвёртай — Вечны агонь, з’яўляецца своеасаблівым месцам для пакаяння і малітвы, — кажа архітэктар. — І ўводзіць дадатковы аб’ект у прадуманую кампазіцыю мне падаецца зусім не мэтазгоднай справай...

Ставячыся з павагай да пункта гледжання заслужанага майстра, мы не ўтрымаемся ад магчымасці выказаць сваё меркаванне на гэты конт. Невялічкая капліца ўсё ж магла б быць уведзена ў комплекс, аднак — у баку ад асноўнай кампазіцыі мемарыяла, якая сапраўды з’яўляецца агульным непарушным цэлым. На тым жа адрэзку да галоўнай трасы, у лясным асяродку, месца для маленькага храма, дзе хтосьці з наведвальнікаў мог бы звярнуцца да Бога, не праблематычна адшукаць.

Самае складанае

Нельга абмінуць і яшчэ адзін момант. Вядома, што самы складаны, але і неабходны элемент кожнага музея — інфраструктура. На выездзе на трасу нас чакала кафэ-рэстаран “Партызанскі бор”. Рэстаран быў закрыты на спецабслугоўванне, а кафэ са свайго сціплага меню магло прапанаваць нам хіба што піцу-паўфабрыкат. Мы не чакалі вялікай разнастайнасці страў у прыдарожнай установе, але ж на пэўныя элементарныя прапановы для наведвальнікаў кафэ, якое месціцца побач з аб’ектам, можна было спадзявацца. Выкажам прапанову аб тым, што стварэнне побач з комплексам падворка са стылізаванай хатай і сялянскай кухняй, ніяк бы не панізіла статус аб’екта, а, наадварот, надало б дадатковае значэнне трагедыі знішчанай вёскі — спакойнага ціхага кутка Беларусі.

Зрэшты, засталося толькі змяніць якасць наяўнага сэрвісу: са знака “мінус” — на “плюс”.

Пяць гадоў абнаўлення

Дык у якім жа стане сёння славуты аб’ект? Колькі лічбаў, фактаў і дэталей. У 2006-м “Хатынь” была перададзена на баланс упраўлення культуры Мінскага аблвыканкама. Вобласць імкнецца зрабіць усё, каб утрымліваць Мемарыяльны комплекс на належным узроўні.

— За пяць няпоўных гадоў у комплекс разам з філіяламі было ўкладзена каля 5 мільярдаў беларускіх рублёў, — распавядае намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінскага аблвыканкама Эдуард Багдановіч. — У Хатыні ўпершыню за чатыры дзесяцігоддзі заменены інжынерныя камунікацыі. Былі адрэстаўраваны могілкі спаленых вёсак, Сцяна Смутку… Комплекс сёння з’яўляецца прасторай безбар’ернага асяроддзя; толькі летась усталявана шаснаццаць пандусаў. Былі прапановы з нямецкага боку дапамагчы ў гэтай справе, але мы вырашылі ўсё выканаць уласнымі сіламі. Гэта святыя аб’екты, і тут грошай мы не павінны шкадаваць, — такая прынцыповая пазіцыя старшыні нашага аблвыканкама Барыса Батуры...

Сёлета, як запэўніў Эдуард Багдановіч, завершацца работы і па сістэме водазабеспячэння Хатыні. Вядзецца замена падсветкі, якая ў перспектыве будзе з выкарыстаннем галагенавых лямпаў.

Сёння пры дзяржаўнай установе дзейнічаюць і два філіялы: Мемарыяльны комплекс “Дальва”, што знаходзіцца за 30 кіламетраў ад Хатыні, і яшчэ адзін славуты помнік — Курган Славы.

— У 2009 былі адрамантаваны інжынерныя камунікацыі Кургана Славы, — удакладняе намеснік начальніка ўпраўлення культуры. — Значнае дасягненне на гэтым аб’екце — аўтаматычная сістэма паліву тэрыторыі. Да таго ж, на знакамітым сімвале яднання чатырох франтоў і партызан у баях за вызваленне Беларусі заменена светлавое абсталяванне. Але толькі гэтымі ўдасканаленнямі не абмяжуемся. Магчыма, давядзецца праводзіць капітальны рамонт. Пільнай увагі патрабуе той жа газон…

У Дальве, “сястры Хатыні”, таксама запланавана рэканструкцыя.

— Не так даўно адрамантавалі скульптуру маці з дзіцем, — пералічвае Эдуард Багдановіч. — Была адноўлена і экспазіцыя мемарыяла…

Суразмоўца прызнаўся, што ўвагі гэтаму комплексу сапраўды доўгі час бракавала, але ўжо бліжэйшым часам усе неабходныя сродкі на яго рэстаўрацыю будуць выдаткаваны ў поўным аб’ёме.

Ізноў пра транспарт

Пацікавіліся ў супрацоўнікаў “Хатыні”, якія праблемы патрабуюць, на іх погляд, першачарговага вырашэння.

— Транспарт! — хорам адказваюць спецыялісты. — На жаль, няма наладжанага злучэння ні з Мінскам, ні з Лагойскам. Ад таго губляем наведвальнікаў…

І сапраўды, пытанне, як даехаць да вядомага комплексу, паўстала, нагадаем, на першым этапе падрыхтоўкі да паездкі і для карэспандэнтаў “К”. Рэйсавыя аўтобусы не ходзяць да славутага мемарыяла. А маніторынг трансферных паслуг вывеў на нятанныя кошты на дарогу. Так, прапановы ёсць, але для таго, каб, да прыкладу, дабрацца ў Хатынь удваіх і вярнуцца назад, спатрэбіцца шэсцьдзясят тысяч. Адзначым, праўда, што кошт памяншаецца, калі ахвотных будзе больш.

Па меркаванні Эдуарда Багдановіча, транспарт — праблема, якая патрабуе вырашэння. Аднак, як засведчыў суразмоўца, пакуль набыццё асобнага аўтобуса для мемарыяла не апраўдана.

— Трэба ўсё абдумаць. Магчыма, больш правільна — пусціць некалькі спецыяльных рэйсавых аўтобусаў з Мінска і Лагойска, якія будуць курсіраваць па вы-

хадных днях. Да таго ж, мы звязваемся з выканкамамі іншых абласцей, каардынуем стварэнне турыстычных маршрутаў…

Зрэшты, нягледзячы на складанасці з транспартам, у плане колькасці наведвальнікаў "Хатыні" скардзіцца не выпадае: толькі за мінулы год комплекс наведалі 180 тысяч чалавек з экскурсіяй. Не менш было індывідуальных наведвальнікаў, зазначаюць у аддзеле экскурсійна-масавай работы.

— Да нас прыязджаюць з усяго свету: летась госці былі прыкладна з 80 краін, — удакладняе загадчык профільнага аддзела Кацярына Зіброва.

Тым не менш, нельга сказаць, што цікавасць сучасніка да Мемарыяльнага комплексу — вялікая. Вядома, параўноўваць з савецкім часам, калі толькі ўдзень мемарыял перажываў паломніцтва ў 60 — 80 тысяч чалавек, — рэч не зусім карэктная: тое, як кажуць, была іншая па сваіх абшарах і колькасці насельніцтва краіна. Аднак тэзіс, што месца Хатыні на Карце Памяці патрабуе далейшага прасоўвання і карэктываў у гэтым сэнсе, наўрад ці падлягае сумневу.

— Так, мы шукаем метады, каб прыцягваць у комплекс як мага больш людзей, — зазначае Эдуард Багдановіч. — Падключылі сістэму адукацыі, заключылі дамовы з чатырнаццаццю турфірмамі…

Але ў цэлым, падкрэслівае суразмоўца, задача грамадства — стварыць матывацыю для наведвання комплексу, якая, у сваю чаргу, падштурхне людзей дабрацца ў Хатынь нават і ўласнымі намаганнямі.

Замест заканчэння

Завітаць у Дальву, якая нібыта знаходзіцца ў ценю сваёй "галаўной установы", вырашылі і мы.

Гэтая вёска — таксама з тых, якія спалены фашыстамі. Адбылося гэта 19 чэрвеня 1944 года — за некалькі дзён да прыходу Чырвонай Арміі. Калі пра Хатынь ведае ці не кожны жыхар нашай краіны ды вялікае мноства замежных гасцей Беларусі, то пра Дальву, на жаль, — зусім нямногія. Тым не менш, гэты комплекс не саступае Хатыні, у першую чаргу — сваёй эмацыйнасцю. Кожная дэталь — ад сімвалічнай дзіцячай цацкі, кнігі, скрыпкі, што ляжаць ля бетонных вянцоў зрубаў на месцы спаленых хат, да велічнага і, разам з тым, жалобнага помніка маці з сынам і шаснаццаціметровай Сцяны Памяці з імёнамі ўсіх ахвяр Дальвы — мае вялікі антываенны пасыл. 44 жыхары былі спалены тут, 29 з іх — дзеці…

Праглядаючы брашуру, што набылі ў "Хатыні", адзначаем для сябе: у будучым Дальва мусіць пабагацець на новыя аб'екты, што размесцяцца трохі наводдаль ад мемарыяла: тую ж аўтастаянку, адсутнасць якой нам адразу кінулася ў вочы, пляцоўкі для адпачынку, капліцу, крыніцу, калодзеж, нават арэлі… Усё гэта пераконвае ў адкрыцці новай старонкі гісторыі Мемарыяльнага комплексу.

Раптам да нашай адзінокай кампаніі ў Дальве далучаюцца новыя наведвальнікі: на стаянку заязджае машына з расійскімі нумарамі.

— Проста так заехалі: убачылі шыльду — і вырашылі паглядзець, — кажуць маладыя хлопцы з Расіі.

Гэтая раптоўная сустрэча прымусіла прыгадаць пра "геакэшынг" — крэатыўны праект, дзякуючы якому Дальва ўжо не з'яўляецца terra incognita для шматлікіх расійскіх турыстаў, ды не толькі для іх. Згодна з правіламі гэтага праекта, на аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны па каардынатах трэба знайсці адказ на выкладзенае ў Інтэрнэце цікавае пытанне. У выніку сайт праекта ўяўляе з сябе вялікую базу даных гістарычных аб'ектаў з каментарыямі яго ўдзельнікаў. Дарэчы, свае прыхільныя водгукі пра Дальву на ім пакінулі некалькі дзясяткаў чалавек.

Гэты факт яшчэ раз пацвярджае тую тэзу, што ідэя шмат чаго вартая. І, нягледзячы на тое, што падарожжа па Лагойшчыне не прынесла нам гатовых адказаў, яно дало магчымасць паразважаць над тым, як зрабіць так, каб сцяжынкі нашай Памяці не зарасталі травой забыцця.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ,
Кастусь АНТАНОВІЧ,
нашы спецыяльныя карэспандэнты
Мінск — Лагойскі раён — Мінск

25 сакавіка міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка наведаў з рабочым візітам Навагрудскі раён. Натуральна, што гутарка ў гэты дзень вялася пра кансервацыю знакамітага замка. Пытанне — папраўдзе надзённае: як сцвярджаюць спецыялісты, стан старадаўніх руін выклікае пэўную занепакоенасць.

Рухавік для Навагрудскага

Марафонская дыстанцыя ў напрамку замка

Ужо ў наступны рабочы дзень у кабінеце намесніка міністра культуры краіны Віктара Кураша адбылася нарада, мэтай якой была распрацоўка механізма, здольнага надаць збору сродкаў на кансервацыю навагрудскіх муроў характар шырокай агульнаграмадскай акцыі. Яна ўжо мае свой дэвіз: "Захаваем Навагрудскі замак разам!", а дызайнеры з Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў распрацавалі "чарнавы" варыянт лагатыпа — пазнавальныя ці не для кожнага беларуса абрысы вежаў, якія трэба зберагчы непарушнымі для наступных пакаленняў.

Гутарка праходзіла ў прагматычным рэчышчы і тычылася найперш канкрэтнага плана дзеянняў, падмацаванага адпаведным эканамічным разлікам. Але скразной думкай, якая гучала пад час нарады неаднаразова, была ўгэўненасць у тым, што акцыя мае зусім не толькі эканамічныя, але і сацыяльна-выхаваўчыя мэты.

Немалаважны штрых — актыўны ўдзел у нарадзе прадстаўнікоў Навагрудскага райвыканкама. Намеснік яго старшыні Алена Ермакова запэўніла ў тым, што захаванне замка з'яўляецца адной з найпрыярытэтных задач раёна, аднак справіцца з ёю выключна сваімі сіламі ён, вядома, не ў стане.

ККД эмоцый

Тэма аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў апошнія гады не знікае са старонак і эфіру СМІ, заўсёды выклікаючы бурлівы розгалас у грамадстве. І ўсе ў адзін голас сцвярджаюць: "Спадчыну неабходна адраджаць!" Але... Гэта, пераважна, эмоцыі, а старым мурам ад іх не цёпла і не халодна. Адсюль і вынікае патрэба вынайсці нейкі механізм трансфармацыі добрай волі ў канкрэтныя пачыны з максімальным каэфіцыентам карыснага дзеяння. На думку начальніка ўпраўлення гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь Ігара Чарняўскага, гэтаму бадай алхімічнаму працэсу павінны спрыяць шырокія грамадскія ініцыятывы, якія канцэнтравалі б увагу на канкрэтных аб'ектах. Натуральна, што легендарны Навагрудскі замак у гэтым спісе — на першым месцы. Як адзначыў суразмоўца "К", гэты знакавы помнік спадчыны мае праблемы, вырашэнне якіх нельга адкладаць "на перспектыву":

— Галоўная з іх тычыцца рэшткаў Касцёльнай вежы: з-пад яе вымываецца грунт, і каб захаваць тыя руіны ў цяперашнім іх абліччы, якое ўжо стала звыклым для многіх пакаленняў беларусаў, трэба стварыць пад імі сур'ёзныя інжынерныя ўмацаванні…

У нагадванні чытачам пра латарэю "Скарбніца", даходы ад рэалізацыі якой скіроўваюцца на кансервацыю першай рэзідэнцыі князёў ВКЛ, думаецца, усё яшчэ ёсць патрэба. Сумы прыбыткаў пакуль што не ўражваюць, ды і грошай на такія справы ўвогуле многа не бывае. Але, у той самы час, гэтых сродкаў — разам з ахвяраваннямі і невялікім фінансаваннем з бюджэту — было дастаткова, каб наноў распачаць даволі затратныя работы па стварэнні праектнай дакументацыі, якія ўжо вяліся дзесяцігоддзе таму, але ж потым прыпыніліся.

Адпаведна, латарэі "Скарбніца" ўдалося зрушыць "воз" з месца, але... Каб дасягнуць яго фінішу, аднаго гэтага "рухавіка", вядома, будзе замала. Натуральна, у захаванні Навагрудскага замка не абысціся без дзяржаўнага фінансавання. Па словах Ігара Чарняўскага, першы сур'ёзны "транш" з бюджэту памерам у паўмільярда рублёў ужо напагатове.

"І гэта — толькі пачатак"

У хуткім часе на мінскіх вуліцах з'явяцца афішы дабрачыннага канцэрта "на карысць" Навагрудскага замка. Усе сродкі ад продажу білетаў, за выключэннем хіба такіх непасрэдных затрат, як камунальныя плацяжы, пойдуць у фонд рэстаўрацыі. Калектыў, які першым праявіў ініцыятыву ўзяць удзел у акцыі, ведае, без перабольшання, кожны суайчыннік.

— На першым пасяджэнні Рэспубліканскага грамадскага савета пра справах культуры і мастацтва я быў моцна ўражаны выступленнем Анатоля Бутэвіча, яго занепакоенасцю станам нашай спадчыны, — кажа кіраўнік легендарных "Сяброў", народны артыст Рэспублікі Беларусь Анатоль Ярмоленка. — І тады адразу саспела памкненне зрабіць свой канкрэтны ўнёсак у вырашэнне гэтых праблем. Якім чынам? Натуральна — праз дабрачынныя канцэрты. Адно такое выступленне дамо абавязкова, можа, іх будзе нават і некалькі. На маю думку, кожны грамадзянін краіны здатны прыкласці свае намаганні да захавання нашай мінуўшчыны. І тады мы разам зробім вельмі важную справу, за якую нам скажуць "Дзякуй!" нашчадкі…

Як адзначыў намеснік старшыні згаданага Савета, старшыня Грамадскай назіральнай камісіі па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль Бутэвіч, прынцыповую згоду прыняць удзел у акцыі ўжо выказалі такія мэтры айчыннага музычнага мастацтва, як Міхаіл Фінберг і Міхась Дрынеўскі. Калектывы, якія яны ўзначальваюць, таксама рыхтуюць адмысловыя канцэртныя праграмы.

— І гэта — толькі пачатак, — зазначыў Анатоль Бутэвіч. — Я гатовы прадоўжыць перамовы з іншымі музычнымі калектывамі, а таксама з тэатрамі, каб як мага больш творчай інтэлігенцыі было далучана да нашай акцыі. Але галоўнае — каб карысны эфект быў максімальны, каб грошы не "з'ела" тая ж арэнда пляцовак…

Падобная пагроза сапраўды існуе. Таму намеснік міністра культуры Віктар Кураш даручыў начальніку ўпраўлення мастацтваў Міхаілу Казловічу распрацаваць такі механізм правядзення дабрачынных канцэртаў, які меў бы адчувальны эканамічны эфект. Зрэшты, паводле папярэдніх ацэнак Міхаіла Казловіча, апошні не прымусіць сябе чакаць: той жа канцэрт "Сяброў" мае папоўніць банкаўскі рахунак замка, прынамсі, на 6 мільёнаў рублёў, і гэта яшчэ паводле самых сціплых падлікаў...

Разам з тым, дабрачынныя канцэрты — гэта толькі адзін з магчымых спосабаў збору сродкаў і прыцягнення ўвагі да тэмы аховы спадчыны. Пад час нарады абмяркоўваліся і многія іншыя, часам трохі нязвыклыя для нашай краіны.

Некаторыя з інавацый — з шэрагу "добра забытага старога". Яшчэ ў савецкія часы сапраўднай завядзёнкай стала правядзенне дабрачынных тэлемарафонаў, пад час якіх збіраліся сродкі для вырашэння той або іншай значнай для грамадства праблемы. Цяпер такую практыку плануецца адрадзіць — балазе папярэдняя дамоўленасць з Белтэлерадыёкампаніяй ужо ёсць. А радыёмарафон на канале "Культура" ўжо і цяпер актыўна рыхтуецца.

— Я накіраваў лісты і наведаў рэдактараў многіх рэспубліканскіх СМІ, — распавёў Анатоль Бутэвіч. — І паўсюль прапанова прыняць удзел у акцыі атрымлівае станоўчы адказ і сустрэчныя ідэі…

Уласна, СМІ здолеюць забяспечыць рэкламна-інфармацыйны аспект кампаніі па зборы сродкаў. Прычым, на думку Ігара Чарняўскага, тое ж тэлебачанне можа спрычыніцца да акцыі не толькі праз рэкламныя ролікі з заклікам пералічваць грошы, але і праз пазнаваўчыя сюжэты, датычныя як гісторыі Навагрудскага замка, так і нюансаў яго сённяшніх даследаванняў і кансервацыі. І дадзены аспект — таксама немалаважны. Спецыялісту нават не трэба тлумачыць, чаму гэтыя руіны зведаюць менавіта кансервацыю, а не паўнавартасную рэстаўрацыю (ці, іншымі словамі, адбудову), а вось простыя грамадзяне такое пытанне задаюць нярэдка.

Інфармацыйны рэзананс, у сваю чаргу, павінен спарадзіць эфект снежнага камяка, далучыўшы да акцыі самы шырокі спектр і арганізацый, і грамадзян. Прычыннымі мерапрыемствамі, і, такім чынам, паспрыяць іх вырашэнню ў будучым.

Але і сёння, пакуль для падобных дабрачынных акцый не будзе створаны адпаведны ім юрыдычны апарат, кожны можа адчуць сябе ў пачэснай ролі спонсара.

Марафон па зборы грошай на кансервацыю Навагрудскага замка будзе доўжыцца цягам усяго часу правядзення гэтых складаных работ, якія запатрабуюць не адзін год. Але, як адзначыў Ігар Чарняўскі, у тым выпадку, калі і акумуляванне сродкаў, і іх асваенне даследчыкамі ды архітэктарамі пойдзе ў належным тэмпе, ёсць шанц распачаць работы па "ўмацаванні глебы" пад Касцёльнай вежай ужо сёлета.

Ілля СВІРЫН

Спонсарам можа стаць...

Як адзначыў начальнік аддзела культуры Навагрудскага райвыканкама Аляксандр Карачан, тыя сродкі, што ахвяруюць на захаванне замка дабрадзеі, сёння кваліфікуюцца як "спонсарская дапамога": больш прыдатнага тэрміна ў юрыдычным лексіконе пакуль няма. З аднаго боку, гэта дадатковая прынада для ахвярадаўцаў: кожны студэнт, які адшкадуе са стыпендыі 10 — 20 тысяч рублёў, можа называць сябе самавітым словам "спонсар". Але з іншага… Узнікае мноства фармальнасцей — такіх, як заключэнне персанальнай дамовы з кожным ахвярадаўцам.

Яшчэ адзін праблемны момант — збор ахвяраванняў наяўнымі сродкамі. Той самы студэнт можа папросту паленавацца пайсці ў банк і выстаяць там чаргу, каб зрабіць свой сціплы ўнёсак у вялікую справу. Іншая справа — выняць грошы з кішэні і кінуць іх у шчыліну скарбонкі.

Як адзначыў Анатоль Бутэвіч, з'яўленне такіх "скрыначак" на ключавых аб'ектах папулярных турмаршрутаў — скажам, ля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і, зразумела, ля самога замка — здатнае забіць двух зайцоў адразу. Бо скарбонкі — гэта не толькі эфектыўны спосаб збору сродкаў, але і рэкламны аб'ект, які прыцягвае ўвагу да акцыі. Але… Заканадаўчай базы для такіх ініцыятыў пакуль што бракуе. Як адзначыў Віктар Кураш, гэтае пытанне патрабуе рацыянальнага вырашэння.

Нямала перашкод сёння ўзнікае ў тым выпадку, калі сродкі на добрую мэту ахвяруюць замежныя грамадзяне — скажам, шматлікія выхадцы з Навагрудчыны, якіх лёс раскідаў па свеце. Апрача добрай волі, ад іх сёння патрабуецца і выкананне шэрагу фармальнасцей (тое ж заключэнне дамовы), на якія пагодзяцца далёка не ўсе замежнікі.

Зрэшты, тут варта адзначыць і яшчэ адну акалічнасць. Маштабнай ініцыятыве па зборы сродкаў для захавання Навагрудскага замка наканавана важная і пачэсная, але не такая і простая, роля першапраходца: непасрэдных аналагаў у сучаснай гісторыі Беларусі яна не мае. Таму гэтая акцыя здолее выкрышталізаваць тыя праблемы, якія паўстаюць перад падобнымі дабрачынным інтарэс да яе існуе ўжо сёння. Як паведаміў Анатоль Бутэвіч, у адказ на яго зварот да кіраўніцтва "Беларусбанка" быў атрыманы адказ за подпісам старшыні Праўлення Надзеі Ермаковай, дзе не толькі выказвалася агульная падтрымка акцыі, але і прапаноўваліся канкрэтныя захады: размяшчэнне інфармацыі пра яе ва ўсіх аддзяленнях найбуйнейшага банка краіны, на яго карпаратыўным сайце, а таксама арганізацыя збору сродкаў сярод супрацоўнікаў.

Увага! Акцыя!

На 16 красавіка рэдакцыя газеты "Культура" запланавала і свой выезд у Навагрудак.

Нашы журналісты і сябры рэдакцыі ўнясуць свой уклад у справу рэстаўрацыі легендарнага замка: прычым не толькі інфармацыйнай падтрымкай і прыцягненнем увагі шырокай грамадскасці, але і канкрэтнай працай на аб'екце. Пра тое, якой будзе гэтая акцыя "К", чытайце ў наступных нумарах.

Таксама нагадаем: гэта не адзіная вызная рэдакцыя, якую мяркуем ажыццявіць бліжэйшым часам. Пастаянныя чытачы памятаюць, што мы абяцалі наведаць адну са старасвецкіх сядзіб, што трапіла ў каляндар газеты на 2011-ы. Да рэалізацыі праекта засталося... Зрэшты, яшчэ на нядоўга захаваем таямніцу, і час гэтай сустрэчы неўзабаве абавязкова паведамім...

Аўтар і вядучы рубрыкі —
Кастусь АНТАНОВІЧ

Прыстань з... бібліятэкай

Як знайсці сенсацыю?

Не для кога не сакрэт, што па абсягах нашай краіны праходзілі самыя разнастайныя гандлёвыя шляхі. Найвядомейшы з іх — "з варагаў у грэкі". Аднак і іншыя водныя пуцявіны не саступалі яму ў аб'ёмах гандлёвых патокаў. Пры гэтым здзелкі экспарту і імпарту тавару адбываліся не толькі ў буйных цэнтрах, але нават і пры заможных фальварках, для чаго будаваліся адмысловыя прыстані. Упершыню на Заходняй Дзвіне адзін з такіх аб'ектаў колькі месяцаў таму здолелі выявіць і грунтоўна даследаваць айчынныя археолагі з Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

1.

Раскопкі ля вёскі Лучна, што пад Полацкам, дзе быў выяўлены ўнікальны аб'ект — прыстань узростам у пяць стагоддзяў, — праводзіліся і раней, з 1998 па 2005 год. Аднак менавіта летась археалагічнае даследаванне дадзенай мясцовасці атрымала надзвычай маштабны размах. Па словах кіраўніка экспедыцыі, навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі Марата Клімава, у мінулым сезоне гэтыя раскопкі сталі самымі буйнымі ў нашай краіне: помнік Сярэднявечча раскопваўся на плошчы 1140 квадратных метраў. Адначасова там працавала вельмі шмат студэнтаў-гісторыкаў з БДУ, Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.Машэрава, а таксама валанцёраў. Экспедыцыя дзейнічала з ліпеня да пачатку верасня.

Нагода для такіх актыўных і маштабных работ тлумачыцца даволі проста: у бліжэйшы час у гэтым месцы плануюць пабудаваць Полацкую гідраэлектрастанцыю. У выніку яе плаціна будзе ўзведзена непасрэдна на плошчы археалагічнага помніка.

Што ж чакалі знайсці археолагі напярэдадні раскопак? Чаго-чаго, але, як ні дзіўна, толькі не сенсацыю. Як адзначыў Марат Клімаў, невыпадкова ў 2005 годзе ў гэтым месцы прыпыніліся раскопкі. Справа ў тым, што характар помніка дастаткова вывучаны, да таго ж, за час папярэдніх даследаванняў былі вызначаны і адметнасці матэрыяльнай культуры колішняга феадальнага комплексу.

Сёлета гісторыкі зафіксавалі ўсё тыя ж асаблівасці, што ведалі і раней. Аднак, бясспрэчна, быў высветлены і шэраг новых момантаў. У прыватнасці, цяпер дакладна можна сцвярджаць, што сярэднявечны феадальны комплекс каля вёскі Лучна існаваў з XI да XVI ст. з некаторымі перапынкамі. Пры гэтым фіксуюцца два перыяды жыццядзейнасці сядзібы на адным і тым жа месцы: з канца XI да першай паловы XII, а пасля з XV ст. да пачатку XVI ст., калі яна была знішчана ў выніку ваенных дзеянняў.



2.

Да таго ж, непадалёк ад Дзвіны гісторыкі выявілі яшчэ адзін, невядомы раней, археалагічны аб'ект, які знаходзіўся на тэрыторыі старадаўняй сядзібы: гэта грунтовы могільнік. Ён узнік пасля знікнення феадальнай сядзібы ў канцы XII — пачатку XIII стст., але, на жаль, амаль не пакінуў па сабе артэфактаў: змяненне клімату ў XIII ст. спрыяла іх істотнаму разбурэнню. Толькі над некаторымі магіламі захаваліся камяні, ды быў выяўлены мінімальны інвентар. Таксама летась на сядзібе было знойдзена шмат даволі цікавых манет больш позняга часу — так званых дынарыяў Вітаўта і пражскіх грошаў.

І ўсё ж галоўнай знаходкай раскопак ля вёскі Лучна стала прыстань. Упершыню, па словах Марата Клімава, комплекс прыстані гісторыкі пачалі фіксаваць у 2004 — 2005 гадах. Гэты старадаўні помнік уяўляў з сябе падводны насып, які вызначаўся асаблівымі памерамі, не суадноснымі з характарам падводных прыродных аб'ектаў. Аднак з гэтага насыпу археолагі раней мелі хіба толькі кераміку і цвікі, што не было пераканаўчым доказам існавання самой пабудовы. Сёлета ж, апрача дынарыяў Вітаўта, там быў знойдзены яшчэ і рыжскі солід.

3.

**1. Раскоп ля вёскі Лучна;
2. Пражскія грошы;
3. Бронзавыя кніжныя зашпількі.**



Графічнае ўзнаўленне прыстані, аўтарства Марата Клімава.

Калі паглядзець на план рэканструкцыі прыстані, можна ўбачыць, што на насып, які выкарыстоўваўся як дапаможная прыстань пры падзенні ўзроўню вады ў Заходняй Дзвіне, усталёўваўся драўляны памост. Узнікае лагічнае пытанне: ці былі падобныя прыстані характэрныя для гэтай ракі? Адказаць сцвярджальна археолагі пакуль не могуць, бо такая прыстань знойдзена ўпершыню. Па словах Марата Клімава, драўляная прыстань была больш за 20 гадоў таму ідэнтыфікавана ў Віцебску загадчыкам аддзела археалогіі Інстытута гісторыі Вольгай Ляўко. Але гэты аб'ект знаходзіўся не на Дзвіне.

На думку Марата Клімава, прыстані не мелі падобнай формы, па якой іх можна было б з лёгкасцю ідэнтыфікаваць. У кожным асобным выпадку рабіліся практычныя і зручныя прыстасаванні для таго, каб ажыццяўляць прычальванне суднаў. Што вельмі важна — акрамя насыпу была знойдзена і дарога да прыстані, сляды якой захаваліся дагэтуль. Яе шырыня складала каля трох метраў. Пры гэтым каля прыстані было створана адмысловае месца для стаянкі і развароту вазоў. Сёння ўяўляецца, што дарога была грунтовай, хаця таксама фіксуюцца і камяні. Вядома, прайшло 500 гадоў, і магчыма, элементы колішняй брукаванкі былі часткова знішчаны вясновымі паводкамі.

Відавочна, падобныя сядзібы на беразе Заходняй Дзвіны былі распаўсюджаны. І хоць пакуль знойдзена толькі адна такая сядзіба, яе аналагі, на думку Марата Клімава, павінны былі ў свой час існаваць. Тым больш, па Заходняй Дзвіне адбываліся гандлёвыя сувязі з Рыгай, пра што сведчаць не толькі разнастайныя манеты, але і калекцыя посуду замежнай вытворчасці, у тым ліку так званы "нямецкі каменны тавар" — кераміка рэйнскіх майстэрняў, якая хоць і каштавала вельмі дорага, але была даволі распаўсюджана ў Еўропе.

Пакуль няма адказу і на пытанне, хто быў уладальнікам гэтай досыць заможнай сядзібы. На жаль, высветліць тое пакуль не атрымалася, бо, па словах Марата Клімава, сядзіба загінула ў пачатку XVI ст. і аб ёй не засталося ніякіх пісьмовых дакументаў. Хутчэй за ўсё, яна стала ахвярай аднаго з баёў пад час вайны Вялікага Княства Літоўскага з Маскоўскай дзяржавай. Цікава, што адзін з тагачасных атрадаў, паводле летапісных даных, праваліўся пад Дзвіну. Гэты факт апісаны не толькі ў Пскоўскім летапісе, але нават і ў "Запісках аб Масковіі" Сігізмунда Герберштэрна — пасланніка аўстрыйскага двара, які праязджаў праз тэрыторыю нашага краю і зафіксаваў багата цікавых фактаў.

І хоць мы пакуль не ведаем, хто жыў у сядзібе Лучна, дзякуючы даследаванням айчынных археолагаў можна зразумець, што ўяўляў з сябе гэты жылы комплекс некалькі стагоддзяў таму.

Паводле меркавання кіраўніка даследавання, сядзіба мела замкнёны характар планіроўкі і, нібыта падковай, паўкругам прымыкала да Заходняй Дзвіны. Пры гэтым пабудовы, плошча якіх складала ад 40 да 60 квадратных метраў, датыкаліся адна да адной. Гэта былі своеасаблівыя дамы-комплексы. Нездарма пабудовы мелі мінімум дзве печы: гаспадарчую і для ацяплення памяшканняў, якая рабілася з гаршковай кафлі.

Нельга не адзначыць і яшчэ адзін факт. Культурны ўзровень гаспадароў сярэднявечнай сядзібы быў даволі высокі. І хоць многія артэфакты да нас не дайшлі, тым не менш, у сядзібе была знойдзена шахматная фігура, а таксама бронзавыя кніжныя зашпількі, што сведчаць пра наяўнасць бібліятэкі.

Сёлета археалагічныя работы на аб'екце ля вёскі Лучна будуць працягвацца, бо яшчэ ёсць магчымасць знайсці цікавыя артэфакты, якія змогуць хоць трохі зменшыць колькасць белых плям у айчыннай гісторыі.

Тым часам, частка артэфактаў, знойдзеных пад час раскопак ля Лучна, ужо прадстаўлена ў Музеі археалогіі Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук.

Гродзенскі **фарпост**

Не так даўно "К" пісала пра ўнікальны аб'ект — узноўленую партызанскую стаянку, што ўзведзена непадалёк ад Дзяржынска. Тым часам ужо сёння рыхтуецца да адкрыцця унікальны комплекс "Гродзенская крэпасць. Партызанскі лагер".

Яго адметнасцю мусяць стаць драўляныя скульптуры беларускіх партызанаў, над якімі працуюць разьбяры па дрэве Мікалай Скляр і Валянцін Багдзевіч.

Як паведамілі ў Гродзенскім аблвыканкаме, чатыры фігуры вышынёй ад 1,9 да 2,6 метра будуць устаноўлены ля ўвахода ў партызанскі лагер. З мэтай даўгавечнасці скульптурнага ансамбля выкарыстоўваецца выключна якасная драўніна, узрост якой складае не менш за 100 гадоў.

Да таго ж, сам партызанскі лагер у лесе пад Гроднам аднаўляюць да драбнюткіх падрабязнасцей. Будаўнікоў кансультуюць удзельнікі тых далёкіх падзей. А таму ўжо на Дзень Перамогі першыя наведвальнікі комплексу змогуць ацаніць створаныя зямлянкі, бліндажы ды навесы.

Партызанскі лагер плануецца ўключыць ва ўсе гродзенскія турыстычныя маршруты, а ў перспектыве — у рэспубліканскія і нават замежныя. І, відавочна, ахвотных наведаць комплекс будзе нямала.

На здымку: майстры працуюць над новымі скульптурамі.

Магутныя муры царквы ў невялікай вёсачцы Сынкавічы Зэльвенскага раёна прываблiваюць не толькі сваёй незвычайнай для праваслаўнага храма архітэктурай, але і своеасаблівай атмасферай, што ўвабрала ў сябе некалькі эпох і стагоддзяў. Яшчэ адной унікальнай адметнасцю і загадкай царквы-крэпасці Святога Архангела Міхаіла ў Сынкавічах стала выяўленне надпісаў на латыні і славянскіх мовах.

Графіці **Сынкавічаў**

Не першы месяц праходзяць рэстаўрацыйныя работы на адной з перлін старадаўняй беларускай архітэктуры, аднак упершыню былі адкрыты ўнікальныя старадаўнія графіці. У прыватнасці, спецыялістамі праводзілася здыманне пластоў тынкоўкі, якое дапамагае выявіць характар муроў і сляды больш позніх перабудоў. У выніку гэтай працы і былі знойдзены надрапаныя на тынкоўцы сярэднявечныя надпісы. У дадзены момант праводзіцца іх расшыфроўка.

Да таго ж, за час рэстаўрацыі, распачатай летась, адноўлены элементы навясных байніц, размешчаныя ў верхніх частках сцен і вежаў сярэднявечных умацаванняў, расчышчаны вежы і скляпенні будынка. Акрамя таго, у гэтым годзе будзе адноўлены бабінец храма — заходняя частка пабудовы, якая аддзяляе святое ад свецкага і служыць вестыбюлем.

Варта адзначыць, што сёлета на рэстаўрацыю інтэр'ераў і ўмацаванне фасадаў царквы-крэпасці плануецца выдаткаваць каля 1,5 млрд. рублёў. І, магчыма, ужо ў бліжэйшы час Сынкавіцкі храм праз выяўленыя графіці прыадкрые заслону таямніц ды распавядзе пра надзвычай яскравыя і цікавыя старонкі гісторыі, а таксама здолее спыніць спрэчкі наконт даты свайго ўзвядзення.

Жыццё і дзіўныя прыгоды Міхала Андрыёлі

Міхал Андрыёлі жыў у Вятцы на другім паверсе драўлянага дома, які належыў сям'і чыноўніка Новікава. Тут мастак меў кухню, пярэднюю і чатыры невялічкія пакоі. Два з іх прыстасаваў пад майстэрні. Тут ён маляваў заказныя партрэты вяцкага Уладыкі Аполаса, архірэяў, чыноўнікаў, купцоў і заможных вяцічаў, гравіраваў свае малюнкі, распрацоўваў эскізы роспісаў для цэркваў і нават змайстраваў лодку з ветразем. Таксама даваў прыватныя ўрокі рысавання... Дом пад чатырохсхільным дахам з фасадам, дэкарыраваным унізе замкавымі камянямі, захаваўся. Пасля ад'езду мастака ён быў некалькі разоў перакуплены, з пачатку 1900-х гадоў і да рэвалюцыі належыў сялянскай сям'і Сапожнікавых...

М.Андрыёлі.

(Заканчэнне. Пачатак у № 13.)

Увогуле, трохгадовы вяцкі перыяд, нягледзячы на становішча ссыльнага, быў даволі вольны, як і жыццё "пад наглядам" землякоў Андрыёлі, былых паўстанцаў С.Карчэцкага, Я.Манюкевіча, Ф.Петэрсона і М.Равенскага — з Міншчыны, Л.Канюшэўскага, В.Савіцкага і Б.Вітаўта — з Ковеншчыны, Т.Хадзько — з Віленшчыны, якія жылі непадалёк ад дома мастака.

Менавіта ў Вятцы лёс моцна знітаваў Андрыёлі з братамі Віктарам і Апалінарам Васняцовымі. Старэйшы, Віктар, ужо вучыўся ў пецярбургскай Акадэміі мастацтваў, калі Андрыёлі прыбыў у Вятку. Потым, пасля двух гадоў навучання, у сакавіку 1870-га, Васняцоў прыехаў дадому, пазнаёміўся з нашым земляком і, паводле некаторых сведчанняў, стаў яго памочнікам у рабоце над стварэннем па заказе Уладыкі Вяцкага і Слабадскога Аполаса роспісаў у Крыжаўзвіжанскім храме. Але для гісторыі мастацтва галоўнае было ў тым, што менавіта Віктар Васняцоў угаварыў "лёгкага і добрага" Андрыёлі ўзяць на сябе мастацкае выхаванне свайго малодшага брата Апалінара, у той час — навучэнца духоўнага вучылішча. І Апалінар Васняцоў кожную нядзелю прыходзіў да Андрыёлі, ствараў пад пільным наглядам настаўніка малюнкі, пісаў алеем пейзажы проста з акна ягонай майстэрні альбо капіраваў рамантычныя горныя і лясныя альпійскія, бездакорныя па кампазіцыйным майстэрстве, ландшафты швейцарскага мастака Аляксандра Калама...

Нарэшце, Андрыёлі сказаў Апалінару: "Васняцоў, сябра мой, навошта вы рыхтуеце сябе да сану святара? Святароў і без вас шмат, а вось людзей з мастацкім талентам — значна менш. Кідайце семінарскае занудства і з'язджайце ў Пецярбург, у Акадэмію: там вы навучыцеся ўсяму, што патрэбна таленту для ўвасаблення задумак. І, Богам прашу, не трэба раздумваць!" Сапраўды, Андрыёлі так вымуштраваў таленавітага вучня, што не заставалася ніякіх сумненняў: хлопчыку трэба ісці па слядах старэйшага брата і працягваць мастацкую адукацыю ў сталіцы. Але грошай у сям'і Васняцовых на гэтую паездку не аказалася. І тады Андрыёлі выкарыстаў усе свае сувязі з духоўнымі асобамі, знакамітымі купцамі і самім губернатарам горада Кампанейшчыкавым, каб з іх дапамогай арганізаваць мастацкую латарэю. У выніку былі прададзены дзве работы маладога Васняцова за 60 рублёў — "Малочніца" і "Жняя" (а не "Жрыца", як значыцца ў некаторых расійскіх крыніцах): адзін твор набыў сам губернатар Вяткі, другі — епіскап Адам Красінскі, родам з Беларусі. І ў 1872 годзе Апалінар стаў студэнтам Акадэміі мастацтваў, а ў будучыні — выдатным гістарычным жывапісцам, па таленце не ніжэйшым за свайго вялікага брата.

Між тым, Андрыёлі працягваў у ссылцы сваю мастацкую дзейнасць у галіне манументальнага жывапісу. Па заказе мясцовых купцоў за 1300 рублёў ганарару ён распісваў Успенскую царкву ў Кукарцы. Праўда, ад гэтага роспісу ў алтары да сёння захавалася адзіная фрэска — "Зняцце з Крыжа". Ікона трох маскоўскіх святых Іоны, Пятра і Аляксея, таксама пэндзля Андрыёлі, захавалася менш: толькі адзін лік Пятра ацалеў. За гады, праведзеныя ў Вятцы, Андрыёлі, па ўспамінах сучасніка, "аднавіў амаль усе цэрквы, намаляваў вельмі шмат і пакінуў па сабе ўспамін як чалавек велізарнай працы".

Новай вехай у лёсе ссыльных стаў царскі ўказ 1871 года аб палягчэнні іхняга пакарання. Паводле яго, ссыльныя еўрапейскіх губерняў, якія прабылі ў няволі не менш за два гады, вызваляліся ад нагляду, і ім дазвалялася пражываць паўсюль, акрамя сталіцы і галоўных губернскіх гарадоў, без права ўладкавання на дзяржаўную службу. Але горш за ўсё было тое, што ўсім былым паўстанцам забаранялася вяртацца на радзіму...

Такім чынам, у жніўні 1871 г. Андрыёлі, адбыўшы ў Вятцы тры гады, атрымаў адпаведны дакумент, і яму давялося пераехаць у Варшаву. Хутка па прыездзе сюды Міхаіл пазнаёміўся з вядомымі выдаўцамі Мечыславам і Маўрыцыяй Аргельбрандамі, якія заказалі мастаку серыю малюнкаў, прысвечаных славянскім народным святам. Праз год Андрыёлі за гэтыя работы ("Вербная нядзеля", "Увянчанне дуба" і інш.) быў прызнаны калегамі па цэху "найлепшым ў тым кірунку яго творчасці, які ён сабе абраў". А ў 1873-м, да 400-годдзя з дня нараджэння Каперніка, ён стварае цудоўную кампазіцыю, прысвечаную астраному. Можна лічыць, з гэтага часу пачынаецца яго вельмі актыўная творчая дзейнасць, асабліва — у кніжнай графіцы.

Натуральна, даволі хутка палепшылася яго матэрыяльнае становішча, з'явіліся грошы, на якія мастак напярэдадні калядных святаў 1874 г. набыў у сям'і Тарчыньскіх цэлыя два гектары зямлі з садам каля гарадка Нова-Мінска (Мінск-Мазавецкі) Варшаўскай губерні за тры вярсты ад ракі Віслы і за 36 — ад Варшавы. Праз дзесяць месяцаў Андрыёлі бярэ шлюб з дзяўчынай з нябеднай шляхецкай сям'і — Наталляй Хеленай Тарноўскай. Усё гэта станоўча адбіваецца на яго творчасці. Цяжка ўявіць сабе, але толькі за чатыры гады Андрыёлі выканаў цудоўныя ілюстрацыі да кніг "Марыя. Украінская аповесць" украінска-польскага паэта А.Мальчэўскага, "Старажытныя гавэнды і карцінкі" К.Вуйціцкага, "Ян Дэмбарог" У.Сыракомлі, "Успаміны квестара" І.Ходзькі, "Меір Эзафовіч" Э.Ажэшкі, "Старое паданне" Ю.Крашэўскага, рамантычнай драмы "Ліла Венеда" Ю.Славацкага...

Але апошнія гады 1870-х прынеслі няшчасці Андрыёлі: памерла паўтарагадовая дачка, а неўзабаве пайшла з жыцця таксама і маці мастака. І так здарылася, што менавіта ў гэты цяжкі час яму трэба было распачынаць заказную работу над ілюстрацыямі да выдання "Пана Тадэвуша" Адама Міцкевіча. Адмаўляцца ад заказу было ўжо позна: выдавецтва прыспешвала. І ён, перасільваючы свой мінорны настрой, працаваў кожны дзень з раніцы да поўдня. 24 ілюстрацыі, 10 віньетак і 24 ініцыялы для гэтага выдання атрымаліся цудоўнымі, але патрабавальны да сябе Андрыёлі лічыў, што не ўсё яму ўдалося: "Я гэта рабіў пры ложку маці, якая паміра́ла, і хутка пасля страты дзіцяці..." Прыкладна ў гэты ж час ён стварае ілюстрацыі да паэмы А.Міцкевіча "Гражына" і станковы ліст "Гедымін будуе Віленскі замак".

Страціўшы блізкіх людзей, мастак не можа заставацца ў Нова-Мінску, дзе ўсё нагадвала аб нядаўняй трагедыі, і пераязджае з жонкай на новае месца: у фальварак Анелін, што на поўначы ад г. Карчава. Гэты фальварак ён купіў у нейкага пана Сігізмунда Куртца, каб пабудаваць там сярод прыроднай прасторы некалькі хатак-лецішчаў для далейшай здачы арандатарам, а таксама два шыкоўныя маёнткі пад назвай "Мой" і "Двор" у арыгінальным архітэктурным стылі — "swidermajer" (у 30-я гады XX ст. гэты тэрмін прыдумаў паэт Канстант Ільдэфанс Гальчынскі — па аналогіі з вядомым стылем "bidermajer"). Гэты кірунак спалучаў у сабе элементы готыка-рэнесанснага (мазавецкага) стылю, узораў рубленых прыгожых альпійскіх дамкоў і старажытнага рускага дойлідства, якое мастак палюбіў яшчэ на Вятчыне. І ўсяму гэтаму жывапіснаму маёнтку ля лесу, на крутым беразе ракі Свідэр, Андрыёлі даў назву "Бжэгі" ("Берагі"). Тут яго часта бачылі за працай над пленэрнымі эцюдамі; тут, у наваколлі, ён ажыццяўляў штодзённыя прагулкі пешшу або на кані. Адсюль аднойчы мастак выправіўся ў воднае падарожжа па Вісле і на лодцы даплыў аж да Кракава. Як вынік гэтай вандроўкі, з'явілася графічная серыя пад назвай "Берагі Віслы". Пазней тут, у Бжэгах, у адсутнасць мастака, здарыўся пажар: загінула шмат ягоных малюнкаў, эскізаў і эцюдаў... Страта была незаменная, але і гэтым разам Андрыёлі ўспрыняў драму трывала і мужна. Праз кароткі час Міхал бярэцца за ілюстрацыі да яшчэ аднаго твора А.Міцкевіча — эпічнай паэмы з гісторыі ВКЛ — "Конрад Валенрод", над якімі ён працаваў даволі доўга.

Знаходзячыся ў Парыжы (на кватэры Уладзіслава Міцкевіча), Андрыёлі паралельна заключае пагадненне аб супрацоўніцтве з буйнымі парыжскімі, лонданскімі і варшаўскімі выдавецтвамі, у тым ліку афармляе раман А.Дзюма "Графіня дэ Мансаро". Папулярнасць мастака як ілюстратара расце. У Парыжы мэтры ад мастацтва запрашаюць яго на розныя вечарыны, нават выбіраюць у склад невялічкай групы дэлегатаў на Літаратурна-мастацкі кангрэс у Мадрыдзе па праблемах аўтарскага права. Ёсць звесткі, што ў гэты перыяд Андрыёлі працаваў з гравёрам і выдатным ілюстратарам "галоўных" кніг Рабле, Дантэ, Перо, Сервантэса, геніем святлаценю ў графіцы Гюставам Дарэ. Ён быў усяго на чатыры гады старэйшы за нашага зямляка.

У маі 1884-га Андрыёлі разам з Наталляй з'ехаў у свой маёнтак Бжэгі, каб хоць трошкі прывесці яго да ладу пасля пажару. У кастрычніку яны вяртаюцца ў Парыж, які да таго часу ахапіла эпідэмія халеры. Вуліцы пуставалі, прадуктовыя і прамысловыя крамы не працавалі, трупы людзей і жывёл ніхто не прыбіраў… Але Андрыёлі, нягледзячы ні на што, чамусьці заставаўся ў Парыжы аж да вясны наступнага года. Што яго там так трымала — не ведаю. І толькі вясной 1885-га ён пакінуў горад і выправіўся на кароткі адпачынак у сонечную Італію, а адтуль, праз Швейцарыю, Германію і Варшаву, — у Бжэгі, каб зноў узяцца за працу па добраўпарадкаванні маёнтка.

Тым часам у лістападзе 1885 г. Андрыёлі атрымаў новы буйны заказ ад брытанскіх выдаўцоў, "офіс" якіх размяшчаўся ў Парыжы: зрабіць 200 ілюстрацый да раманаў Фенімора Купера. Трэба было ехаць у Парыж на перамовы, хаця спачатку ў Міхала была думка адмовіцца ад заказу, паколькі свет і героі Купера былі для яго як мастака чужыя і далёкія. Але талент ёсць талент, і, глыбока ўнікнуўшы ў літаратурную прастору асяроддзя, у атмасферу эпохі, у жыва выпісаныя вобразы амерыканскіх каланістаў — асабліва галоўнага персанажа Наці Бампа — Скураная Панчоха і індзейцаў — герояў Купера, Андрыёлі з уласцівым яму майстэрствам за кароткі тэрмін зрабіў такія бліскучыя ілюстрацыі да гісторыка-прыгодніцкай пенталогіі, што да сённяшняга дня яны застаюцца непераўзыдзенымі. У гэтым дачыненні я смела магу параўнаць ягоныя малюнкі з геніяльнымі ілюстрацыямі вышэйзгаданага Гюстава Дарэ, бо па "карцінках" таго і другога асабіста я "прайшоў" сваё дзяцінства.

Не ведаю, што здарылася ў сям'і Андрыёлі, але ў 1887 г., пасля сумеснага падарожжа мастака і ягонай жонкі па гістарычных мясцінах Паўднёвай Польшчы і пасля заканчэння працы над алейнымі абразамі "Святога Казіміра" і "Хрыстоса ў труне" для парафіі ў Карчэве, яны разышліся. І адразу ж пасля разводу Міхал, каб прыйсці ў сябе, накіраваўся ў Сілезію, адкуль прывёз некалькі дзясяткаў замалёвак пад агульнай назвай "Пад зямлёй і на зямлі". Але гэтая работа была для яго больш "хобі", адпачынкам ад галоўнай мэты — далейшым працягам працы над ілюстрацыямі твораў яго любімага Адама Міцкевіча.

У 1891 г. Андрыёлі двойчы наведвае Санкт-Пецярбург, паколькі атрымаў прапанову ілюстраваць "Героя нашага часу" М.Лермантава. Адтуль увосень таго ж года выпраўляецца на радзіму, дзе малюе старажытныя помнікі гісторыі і дойлідства, падрабязныя "карцінкі" сялянскага і гарадскога побыту, шукае найбольш характэрныя беларускія і літоўскія чалавечыя тыпы, строі, падворкі, хатнія інтэр'еры і іншыя этнаграфічныя дэталі. А ў наступным, 1892-м, годзе зноў працуе над ілюстрацыямі да чарговага твора Адама Міцкевіча — паэмы "Дзяды" — і заканчвае шматфігурную кампазіцыю "Адкуль вярталіся ліцвіны?".

У лютым 1893-га мастак, каб папраўіць здароўе, якое астатнім часам вельмі пагоршылася, рушыў у Харватыю і Чарнагорыю. Але нічога не дапамагло, і давялося з'ехаць на некалькі тыдняў у Бжэгі (як аказалася, у апошні раз), потым — у Варшаву: для сур'ёзнага лячэння. Усё марна. Пераканаўшыся, што справа — безнадзейная, Андрыёлі 18 чэрвеня 1893 года піша завяшчанне, і ў пачатку ліпеня, па парадзе сяброў-дактароў, кладзецца ў шпіталь курортнага гарадка Наленчаў, непадалёк ад Варшавы, хаця добра ведае, што шанцаў паправіцца ў яго ніякіх... Так і здарылася: раніцай 23 жніўня ўсё было скончана. Сціплае пахаванне адбылося там жа, на мясцовых могілках... Сёння там стаіць шыкоўны класічна-строгі помнік з чорнага мармуру з велічным крыжам і партрэтным барэльефам мастака.

Што сказаць у заключэнне? Мастакоўскі шлях Міхала Андрыёлі — пераканаўчая ілюстрацыя да лацінскай мудрасці: "Sic transit gloria mundi" ("Так праходзіць людская слава"). Яшчэ пры жыцці ягоныя творы прыводзілі ў захапленне! Некалі ж унікальны альбом "Жанчыны рускіх пісьменнікаў" з партрэтамі галоўных гераінь твораў Пушкіна, Талстога, Лермантава, Тургенева я ў маладосці перагортваў ва ўніверсітэцкай бібліятэцы Ленінграда, праўда, зусім не ведаючы, што мастак меў дачыненне да Беларусі...

Так, Андрыёлі быў у модзе. За кнігамі з яго "карцінкамі" ганяліся, мець у сямейных бібліятэках такія тамы лічылася гонарам. Словам, творцам захапляліся знакамітыя людзі і простыя чытачы. Нездарма 80-я гады XIX ст. хтосьці з французскіх бібліяфілаў назваў дзесяцігоддзем Андрыёлі. І сёння не-не — ды і з'яўляюцца шыкоўныя выданні з ягонымі ілюстрацыямі. Напрыклад, не так даўно на мінскім кніжным развале па вуліцы Янкі Купалы я бачыў раман Купера "Апошні з магікан" з найдасканалымі ілюстрацыямі Андрыёлі, прычым пераплёт быў з чорнай натуральнай скуры Cabra і залатым абрэзам. Аднак хто сёння ведае аўтара такіх цудоўных твораў? Вось Гюстава Дарэ ўсе ведаюць у свеце, а Міхала Андрыёлі?..

Барыс КРЭПАК

М.Андрыёлі. "Адкуль вярталіся ліцвіны?".

Метамарфозы мастакоўскага лёсу, ад якіх кругам галава

АК Афіша "К"

з 2 красавіка — да 9 красавіка

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 227 45 62.

■ Мастацтва Беларусі XII — XIX стст.
■ Мастацтва Беларусі канца XIX — пач. XXI стст.
■ Мастацтва Расіі XVIII — пачатку XX стст.
■ Мастацтва краін Усходу XV — XX стст.
■ Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.
■ Экспазіцыя жывапісу, скульптуры, графікі мастакоў 1940-х — 1980-х гг.

Выстаўкі:
■ **"Белае золата Херэнда" — фарфор для каралёў.**
■ Выстаўка **"Беларускі нацюрморт XX ст.".**
■ Выстаўка **"Народжаныя ў 1920-я".** Да 03.04.2011 г.
■ Выстаўка **"Адкрыццё святой прыгажосці".**

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея РБ:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 227 87 96.

■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі р-н, Гродзенская вобл. Тэл.: (8–01596) 2 30 35.

■ Пастаянная экспазіцыя.

У паўночна-ўсходняй вежы:
■ **"Мірскі замак вачыма мастакоў".** Да 16.06.2011.
■ **"Яўрэйскае гета ў Мірскім замку".**
■ **"Падзеі I і II сусветных войн".**

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА ў в. Раўбічы

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі р-н. Тэл.: 507 44 68.

■ Выстаўка **"Таямніцы дрэва. Разьба па дрэве, чаканка".**
■ Майстар-клас па роспісе велікодных пісанак.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ ў г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

■ Пастаянная экспазіцыя. "Культура I-й пал. XIX ст.".
■ Выстаўка Сяргея Цімохава **"Ню".**

МУЗЕІ *

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 227 43 22.

Экспазіцыі:
■ **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пачатку XX стст.".**
■ **"Старажытная Беларусь".**
■ **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".**
■ **"З крыніц адвечнай прыгажосці".**
■ **"Водбліскі ваеннай славы"** (еўрапейская зброя і вайсковае абмундзіраванне XIX — 1-й пал. XX стст.).

Выстаўкі:
■ **"Рускі Ляўша".** Да 10.04.2011.
■ **"Пачатак. Музей сучаснай беларускай моды".** Да 17.04.2011.
■ Выстаўка іконы **"Паміж небам і зямлёй".** Да 03.04.2011.

Дом-музей I З'езда РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

■ Пастаянная экспазіцыя **"Гісторыя I З'езда РСДРП".**
■ **"Гісторыя ў мініяцюры".**

ДУ "НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Гейсіка, 1. Тэл.: (8-01770) 5 51 81. Сектар "Выставачная зала".

■ Выстаўка **"Нематэрыяльная культурная спадчына Беларусі: кансервацыя ці развіццё?"** (праект Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Інстытута культуры Беларусі).

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

■ Пастаянная літаратурна-мемарыяльная экспазіцыя **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць".**
■ Тэатралізаваная экскурсія паводле казак Якуба Коласа.

Выстаўкі:
■ **"Радасць і смутак мая"** *(да 80-годдзя мастакоў Георгія і Наталлі Паплаўскіх)*, **мяне паўторыць..."** (да 80-годдзя з дня нараджэння У.Караткевіча).
■ **"Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам".**
■ **"Спадарожнікі дзяцінства".**
■ Фотавыстаўка Анатоля Дрыбаса **"Мая Беларусь".**
■ **"Лялечны карагод".**

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.

Экспазіцыі:
■ Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
■ **"Пераможцы".**
■ **"Вітражы партызанскай мудрасці і кемлівасці".**

Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
■ Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
■ **"Чырвоная гасцёўня".**
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**
■ Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокальны паверх паўднёвай галерэі).

Вежа палаца Румянцавых і Паскевічаў

Экспазіцыя "Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".

Выстаўкі:
■ **"Медыцынская літаратура XIX — I пал. XX стст.".**
■ Выстаўка твораў Барыса Звінагродскага **"Трэцяе вымярэнне".**

Паўночнае крыло палаца

Выстаўкі:
■ **Пакой крывых люстэркаў.**
■ **"Свет звяроў Гомельшчыны".**
■ Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

Свет субтрапічных раслін і жывёл.

Працуюць рэстаўрацыйныя майстэрні і аддзел па турызме (вул. Кірава, 8).

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.

■ На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі".**

Выставачная зала:
■ Выстаўка **"Музей у музеі"** *(прадметы з фондаў раённых музеяў вобласці)*.

ГАЛЕРЭІ*

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс: 290 60 10.

■ Выстаўка-кірмаш **"Лецішча. Сад. Агарод".**

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1 (Палац Рэспублікі). Тэл.: 227 26 12.

■ Фотавыстаўка Аляксандра Барадуліна.

ГАЛЕРЭЯ ТЫЗЕНГАЎЗА

г. Гродна, пл. Тызенгаўза, 4. Тэл./факс: (8–0152) 72 27 57.

■ Выстаўка работ беларускіх мастакоў.
■ Выстаўка Наталлі Бедзюх **"Адлюстраванне".**

КАРЦІННАЯ ГАЛЕРЭЯ Г.ВАШЧАНКІ

г. Гомель, вул. Карповіча, 4. Тэл.: (8–0232) 77 75 20.

Экспазіцыя:
■ **"Гаўрыла Вашчанка".**
■ Выстаўка-продаж твораў выяўленчага мастацтва, сувеніраў і тавараў для мастакоў.

Выстаўкі:
■ Выстаўка аўтарскіх лялек Ганны Балаш у суправаджэнні фота Ірэны Гудзіеўскай **"Вясновае падарожжа".**
■ Выстаўка работ "Экзатычныя і пеўчыя птушкі".
■ Выстаўка жывапісу **Анатоля Концуба.**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 227 78 66.

■ Пастаянная экспазіцыя **"Жыццё і творчасць Янкі Купалы".**
■ Цыкл музейна-педагагічных заняткаў з элементамі тэатралізацыі **"Дзядзька Янка, добры дзень!"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту і сямейнага наведвальніка.

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 56 21.

Выстаўкі:
■ **"Святло стагоддзяў".**
■ **"Свет шчодры. Свет Абедзве** — да 12.05.2011.
■ **"Даспехі Заходняй Еўропы XVI — XVIII стст.".**
■ **"Цацкі з чамадана".** Да 01.05.2011 г.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11. Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
■ Выстаўка Роберта Ландарскага **"Спеў любові роднай зямлі".**
■ **"Масонская калекцыя са збораў В.Федаровіча".**
■ **"Мастацкае шкло і габелен".**
■ Выстаўка твораў В.Бялыніцкага-Бірулі.
■ **"Іван Шамякін. Мае кнігі — мая біяграфія".**

ТЭАТРЫ*

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.

■ **2 — "Севільскі цырульнік"** Дж. Расіні. *(Пачатак а 12-й і а 19-й.)*
■ **3 — "Чароўная музыка"** М.Мінкова.
■ **3 — "Лебядзінае возера"** П.Чайкоўскага.
■ **6 — "Сільфіда"** Х.Левенсхольда.
■ **7 — "Князь Ігар"** А.Барадзіна.
■ **8 — "Спячая прыгажуня"** П.Чайкоўскага.

РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл.: 334 60 08.

■ **2 — "Што баліць?"** Л.Агулянскага.
■ **3 — "Каласы пад сярпом тваім"** У.Караткевіча.
■ **5 — "Неба ў дыяментах"** А.Чэхава.
■ **6 — "Палёты з анёлам"** Д.Сагалава.
■ **7 — "Сёстры Псіхеі"** С.Кавалёва.
■ **8 — "Адвечная песня"** Янкі Купалы.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.

■ **2 — "Прыгоды брэменскіх музыкаў"** Г.Гладкова.
■ **2 — "Марыца"** І.Кальмана.
■ **3 — "Залатое кураня"** В.Уланоўскага.
■ **3 — "Блакітная камея"** К.Брэйтбурга.
■ **5 — "Аднойчы ў Чыкага".**
■ **7 — "Жызель"** А.Адана.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

■ **2 — "Хлопчык-зорка"** А.Уайльда.
■ **3, 5 — "Воўк і раз, два, тры"** Н.Мацяш.
■ **7, 8 — "Чароўная зброя Кендзо"** М.Супоніна.

КУЛЬТУРА

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637

Галоўны рэдактар — Людміла КРУШЫНСКАЯ

Рэдакцыйная калегія: Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Міхаіл БАРАЗНА, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Кацярына ДУЛАВА, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Барыс СВЯТЛОЎ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.

Рэдакцыя: Сяргей ТРАФІЛАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), Пётр ОВАД (адказны сакратар).

Рэдактары аддзелаў: Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Настасся ПАНКРАТАВА, Яўген РАГІН, Ілля СВІРЫН, Антон СІДАРЭНКА.

Спецкарэспандэнты: Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Алена САБАЛЕЎСКАЯ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.

Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ
Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС
Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр.Незалежнасці,77.
Тэлефон: (017) 290-22-50 (прыёмная) (017) 286-07-97, (017) 334-57-23
Тэлефон/факс: (017) 334-57-35
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334-57-41
www.kimpress.by
E-MAIL: kultura@tut.by

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0003879 ад 17 красавіка 2009 г.
220013, Мінск, пр.Незалежнасці, 77. Тэл. (017) 290-22-50.
Бухгалтэрыя: тэл. (017) 334-57-35
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца работы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.

© "Культура", 2011.

Індэкс 63875
Наклад 8880
Падпісана ў свет 31.03.2011 у 18.30
Замова 1507
РУП "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
Пр.Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

ISSN 1994-4780